# Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі



KONRAD ADENAUER STIFTUNG
BELARUS



Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі



Пад рэдакцыяй Уладзіслава Іванова і Андрэя Сцяпанава

Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі

Навуковая рада
Уладзіслаў Іваноў, PhD; Андрэй Сцяпанаў, PhD

Перакладчыцы
Алена Ялавенка і Ганна Прохарава

Рэдактура і карэктура
Алена Ялавенка, Настасся Чэрнік-Рымашэўская, Уладзіслаў Іваноў

Дызайн і вёрстка
Гэйле Пранцкунайце і Міслаў Жугай

Ля вытокаў беларускай палітычнай навукі /
Пад рэд. Іванова У., Сцяпанава А. – Вільня: ЕГУ, 2021. – 204 с.

Дадзеная публікацыя з’яўляецца сумесным праектам Дэпартамента сацыяльных навук Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і Беларускага офіса Фонда Конрада Адэнаўэра. Публікацыя ажыццёўлена пры фінансавай падтрымцы Фонда Конрада Адэнаўэра. Поўную адказнасць за факты і погляды, прадстаўленыя ў публікацыі, нясуць аўтары тэкстаў. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і Фонд Конрада Адэнаўэра не нясуць адказнасці ні за інфармацыю, што змяшчаецца ў гэтай публікацыі, ні за яе далейшае выкарыстанне.

KONRAD ADENAUER STIFTUNG
BELARUS

ISBN 978-609-8220-13-1 (друкаваная версія)
ISBN 978-609-8220-14-8 (электронная версія)



# Змест

Прадмова (с. 8)
Валерый Карбалевіч

Беларуская палітычная мадэль (с. 16)
Сяргей Панькоўскі

Сучасны беларускі палітычны дыскурс (Што і як мы гаворым
пра палітыку) (с. 36)
Святлана Навумава

Эканамічны падмурак беларускага неасавецкага
аўтарытарызму (2008–2011) (с. 68)
Віктар Чарноў

Ідэнтычнасць Беларусі: З досведу інтэрпрэтацыйнай
паліталогіі (с. 88)
Ірына Бугрова

Посткамуністычная мафіёзная дзяржава:
прыклад Беларусі (с. 152)
Уладзімір Роўда

Інфармацыя пра аўтараў (с. 198)

Прадмова

# Яны былі першыя



Каб зразумець усю веліч інтэлектуальных здабыткаў аўтараў і аўтарак гэтага зборніка, трэба разумець кантэкст эпохі, у якую яны пачыналі.

Распаўся савецкі лад, а разам з ім і ўся сістэма гуманітарных навук, гуманітарнай адукацыі. На гэтых руінах трэба было з нуля будаваць новую сістэму. Патрэбна было ўкараняць, адаптаваць да новых беларускіх рэалій паліталогію як навуку і як навучальную дысцыпліну. За савецкім часам паліталогія не вывучалася, бо лічылася «буржуазнай ілжэнавукай».

Да таго ж узнікла новая дзяржава – Рэспубліка Беларусь. Перад гуманітарнай навукай паўстала задача тэарэтычна абгрунтаваць беларускую дзяржаўнасць, нацыянальную ідэнтычнасць, эканамічныя, палітычныя, каштоўнасныя перспектывы маладой краіны, яе ўнутраную і замежную палітыку.

Таму першапраходцам, якімі былі аўтары і аўтаркі зборніка, даводзілася самастойна асвойваць з заходніх крыніц новую для іх навуку, пісаць навучальныя дапаможнікі, лекцыі, выкладаць студэнтам новы прадмет. Ірына Бугрова, Святлана Навумава, Сяргей Панькоўскі, Уладзімір Роўда, Віктар Чарноў заклалі падмурак беларускай палітычнай навукі, стварылі традыцыі, на якія абапіраецца новае пакаленне беларускіх палітолагаў.

Адначасова перад палітычнымі навукоўцамі паўстала задача даць паліталагічны аналіз той сацыяльнай мадэлі, палітычнай сістэмы, рэжыму, які з'явіўся ў Беларусі пасля прыходу

да ўлады Аляксандра Лукашэнкі. Трэба было таксама ацаніць тыя грамадскія працэсы, масавую свядомасць, якія ўплывалі на хаду падзей у краіне.

Гэтую задачу як найлепш імкнуліся выканаць згаданыя вышэй даследчыкі. Можна сказаць, што яны былі першымі палітолагамі незалежнай Беларусі – і ў тым сэнсе, што яны стаялі ля вытокаў адраджэння паліталагічнай навукі ў маладой дзяржаве, і ў сэнсе якасці навуковай прадукцыі.

Прадстаўленыя ў зборніку матэрыялы яскрава адлюстроўваюць і той час, у які яны пісаліся, і творчыя партрэты саміх аўтараў і аўтарак. Важна звярнуць увагу на глыбіню і аб'ёмнасць аналізу беларускага соцыуму: тут і палітычны дыскурс, і нацыянальная ідэнтычнасць, і розныя бакі беларускай сацыяльнай мадэлі, палітычнага рэжыму.

Трэба асабліва адзначыць актуальнасць тых высноў, да якіх прыйшлі даследчыкі, іх надзённасць. Шмат у чым яны даюць адказы на пытанні, якія паўстаюць перад Беларуссю ў цяперашні драматычны перыяд ейнага развіцця.

Напрыклад, у артыкуле Святланы Навумавай «Сучасны беларускі палітычны дыскурс (Што і як мы гаворым пра палітыку)» гаворыцца пра тое, што ва ўмовах глыбокага грамадскага расколу палітычныя тэрміны напоўнены рознымі сэнсамі. Прычым гэта датычыць і базавых паняццяў. У такіх умовах дыскусія немагчыма, бо ў палітычных апанентаў розныя

клішэ, у кожнага свая карціна свету. «Размова людзей розных дыскурсаў – размова сляпога з глухім», - канстатуе Святлана Навумава. Гэта якраз пра сённяшнюю Беларусь, якая жыве ў стане халоднай грамадзянскай вайны. Аўтарка робіць выснову, якая надзвычай актуальная цяпер: «Відаць, сёння гаворка павінна ісці не пра алхімічныя пошукі залатой формулы згоды, а пра паступовую, удумлівую, калі хочаце, чорную работу над высвятленнем сэнсу слоў, рацыянальным пошукам разумення і тым самым аднаўленнем тканіны агульнага дыскурсу».

Ірына Бугрова ў артыкуле «Ідэнтычнасць Беларусі: З досведу інтэрпрэтацыйнай паліталогіі» таксама закранула вельмі важную тэму. Праблема ідэнтычнасці стала сёння адным з галоўных пытанняў сусветнай паліталогіі. І яно мае фундаментальнае значэнне для маладой беларускай дзяржавы, якая імкнецца заняць, кажучы словамі Янкі Купалы, «свой пачэсны пасад між народамі».

Ірына Бугрова звяртаецца да гістарычных каранёў беларускай ідэнтычнасці, менталітэту, асаблівасцей культурнага коду беларусаў. І прыходзіць да высновы, што знаходжанне на мяжы цывілізацый аб'ектыўна вядзе да «блукання паміж Захадам і Ўсходам». І што выйсцем з гэтай сітуацыі павінен стаць сінтэз.

Аўтарка шмат увагі надае высілкам інтэлігенцыі ў пошуку ідэнтычнасці на тле транзіту. Пасіянарны выбух 2020 году шматкроць паскорыў фармаванне ідэнтычнасці беларускага

соцыуму. У гэтым сэнсе развагі Ірыны Бугровай застаюцца надзвычай дарэчнымі для сённяшніх актуалій.

Сяргей Панькоўскі ў сваіх матэрыялах («Беларуская палітычная мадэль») раскрывае тэму непасрэдна беларускай палітычнай мадэлі, яе якасных характарыстык. Ён спрабуе даць адказ на пытанне «Як працуе гэтая сістэма?». Пытанне надзвычай вострае сёння, калі рэжым Лукашэнкі існуе ва ўмовах сумнеўнай легітымнасці, калі шмат дасведчаных людзей спрабуюць асэнсаваць: чаму пад ціскам масавага грамадскага абурэння не адбыўся раскол эліт? чаму дзяржапарат не перайшоў на бок пратэстоўнага народа?

Аўтар піша: «Беларуская рэальнасць сапраўды дэманструе шэраг цалкам спецыфічных рыс і практык, якія робяць Беларусь у значнай ступені «цяжкаўлоўнай» з гледзішча звыклых у XX і XXI стст. катэгорый паліталогіі і палітычнай філасофіі». Найважнейшая рыса гэтай рэальнасці, на ягоную думку, палягае ў тым, што мы маем справу з персаналісцкім рэжымам, рэжымам асабістай улады. Таму «беларускія дзяржаўныя інстытуты, натуральна, паўтараюць «псіхафізіялогію» свайго лідара». А так званая «дзяржаўная ідэалогія» «мае трывіяльны змест і яе рэалізацыя малаэфектыўная без магутнага апарату гвалтоўнага прымусу». Якую функцыю выконвае гэты гвалт, мы добра бачым з апошніх падзей.

Таксама закранутая яшчэ адна важная тэма, якую любіў агучваць Сяргей Панькоўскі, – «паралельнае грамадства».

Гаворка ідзе пра інфраструктуру грамадзянскай супольнасці, якая існавала паралельна афіцыйным палітычным структурам. Наколькі актуальны і значны гэты працэс, сёння зразумелі беларускія ўлады, якія мэтанакіравана знішчаюць грамадскія арганізацыі і супольнасці, створаныя на лічбавых платформах.

Уладзімір Роўда ў сваім артыкуле «Посткамуністычная мафіёзная дзяржава: прыклад Беларусі» вызначае беларускую палітычную сістэму як «посткамуністычную мафіёзную дзяржаву» з «элементамі патрон-кліенцкіх зносін», знявагай да права.

Трэба звярнуць увагу на надзвычай важную выснову аўтара, якая вельмі добра тлумачыць цяперашнія беларускія рэаліі: «Найперш, варта згадаць супярэчнасць паміж адносна эканамічна і сацыяльна развітым грамадствам і самай прымітыўнай у Еўропе палітычнай сістэмай, заснаванай на персаналісцкай дыктатуры, суцэльным панаванні палітычнай сям'і». Інакш кажучы, грамадства перарасло архаічную дзяржаву. І гэтая фундаментальная супярэчнасць стала галоўнай прычынай пратэстнага выбуху 2020 году.

Віктар Чарноў у сваім артыкуле «Эканамічны падмурак беларускага неасавецкага аўтарытарызму (2008-2011)» піша пра падыходы панавальнага рэжыму да эканомікі больш за 10 гадоў таму. Хоць, уласна, гаворка не пра эканоміку. Беларускія ўлады заўсёды падыходзілі да эканомікі выключна з гледзішча палітыкі. Аўтар спрабуе адказаць на пытанне, чаму рэжым так

упарта сабатуе рынкавыя рэформы. І прыходзіць да высновы: існая сацыяльная мадэль з дамінаваннем дзяржаўнага сектара аптымальная для ўтрымання ўлады. Падзеі 2020 году пацвердзілі гэтую візію, бо галоўнай рухальнай сілай пратэстаў сталі людзі, якія працуюць у прыватных структурах.

Такім чынам, хоць гэтых даследчыкаў ужо няма сярод нас, іхняя творчасць застаецца вельмі сучаснай, сугучнай сённяшнім алгарытмам палітычнага і навуковага жыцця Беларусі. І ў гэтым іхняя веліч.

Гэтыя людзі рана пайшлі з жыцця, у момант іхняга творчага росквіту. Я меў гонар усіх іх добра знаць, супрацоўнічаць і сябраваць з імі.

Яшчэ варта дадаць, што Ірына Бугрова, Святлана Навумава, Сяргей Панькоўскі, Уладзімір Роўда, Віктар Чарноў былі выдатнымі выкладчыкамі і арганізатарамі працэсаў гуманітарнай адукацыі. Яны засталіся ў памяці шматлікіх студэнтаў і слухачоў яркімі, самабытнымі асобамі з непаўторнымі творчымі індывідуальнасцямі.

Запомнім іх такімі.

*Валерый Карбалевіч*

Сяргей Панькоўскі

# Беларуская палітычная мадэль



## Анатацыя

*У фокусе гэтага артыкула – працэс кансалідацыі аўтарытарнага палітычнага рэжыму ў Беларусі ў пачатку 2000-х. Гэта перыяд электаральнага цыкла, што пачаўся з другіх прэзідэнцкіх выбараў у 2001 годзе, на якіх Аляксандр Лукашэнка перамог Уладзіміра Ганчарыка. Шматлікія парушэнні падчас электаральнай кампаніі, ціск на палітыкаў і грамадзянскіх актывістаў прычыніліся да непрызнання вынікаў выбараў міжнароднымі назіральнымі місіямі, а затым і краінамі Еўразвязу і ЗША. Для паўторна абранага прэзідэнта гэта азначала, што наступны электаральны цыкл да 2006 года трэба прысвяціць умацаванню адміністрацыйнай вертыкалі; выпрацоўванню міжнароднай палітыкі і двухбаковых зносін з Расеяй, якія грунтуюцца на гандлі эканамічнымі і энергетычнымі прэферэнцыямі; стварэнню дзяржаўнай ідэалогіі на ўсіх узроўнях улады, у тым ліку ў сістэме агульнай адукацыі і сістэме рэкрутавання адміністрацыйнай эліты. Прэзідэнцкія выбары 2006 года і выкліканыя імі пратэсты і хваля сацыяльнай мабілізацыі выявілі не толькі гатоўнасць палітычнай улады ў Беларусі выкарыстоўваць інструмент гвалту, але і пратэставы патэнцыял беларускага грамадства. У тэкстах Сяргея Панькоўскага, апублікаваных з 2003 па 2006 гады і сабраных у гэтым артыкуле, адлюстраваны асноўныя складнікі кансалідацыі рэжыму Лукашэнкі: канчатковы адыход ад дэмакратычнай сістэмы, фармаванне дзяржаўнай ідэалогіі з мэтай легітымізацыі ўлады і скажэнне выбарчых працэсаў.*

## Уводзіны

Беларусь, па сутнасці, уяўляе сабой краіну, якая адмовілася ад дэмакратычнага выбару і жыве паводле іншых законаў. Беларуская палітычная і эканамічная рэальнасць мае ўласцівыя толькі ёй механізмы самаўзнаўлення. Упэўненыя прагнозы наконт таго, што Аляксандр Лукашэнка, які імкліва і фактычна адзін падняўся да вяршынь дзяржаўнай улады, затрымаецца там не больш за некалькі месяцаў, выявіліся «моцна перабольшанымі». Яны недаацэньвалі ўнутраную логіку самаарганізацыі тады яшчэ цалкам захаванай «адміністрацыйна-гаспадарчай» сістэмы з акумуляванымі ў ёй досведам і капіталамі. Для разумення існай сістэмы неабходна засяродзіцца на праясненні яе прадметных механізмаў. Гаворка ідзе аб механізмах арганізацыі доступу да ўлады, забеспячэння яе легітымнасці, фактычнага гарантавання ўсеагульнай роўнасці перад законам, рэалізацыі не заўсёды заўважных і відавочных, але, у канчатковым выніку, індывідуальных эканамічных інтарэсаў. Менавіта ў гэтых механізмах уся сутнасць, якую ў таталітарных умовах старанна хаваюць за ідэалагічнай балбатнёй. Апошняя, у сваю чаргу, патрэбная для таго, каб апраўдваць у вачах насельніцтва захоп або ўтрыманне ўлады пануючай групай. Развагі аб сутнасці таго, што адбываецца ў Беларусі сягаюць не далей за глыбакадумныя трактаванні чарговай цытаты прэзідэнта і тэрмінаў «аўтарытарызм», «таталітарызм» і т. пад., якія таксама вымагаюць удакладнення і праяснення. Дагэтуль без адказу застаецца сакраментальнае пытанне «Як працуе гэтая сістэма?»

## 1. 2001 год: адыход ад дэмакратыі

Калі Беларусь не з’яўляецца прадстаўнічай дэмакратыяй, з выкананнем усіх яе працэдурных патрабаванняў, то чым яна тады з’яўляецца? Прэзідэнцкія выбары 2001 года паказалі, што ў адсутнасці ўмоў палітычнага выбару – шматпартыйнасці, свабоды слова, забеспячэння роўнага доступу да ўсіх пунктаў поглядаў, ідэалагічнай нейтральнасці дзяржавы і г. д. – выбару няма.

Нельга не заўважыць, што, паслядоўна нішчачы элементы дэмакратычнай сістэмы, беларускія ўлады непазбежна ліквідуюць перадумовы ўласнай легітымнасці. Унутрыпалітычная дзейнасць беларускага кіраўніцтва скіраваная на змену падмурка канстытуцыйнага і дзяржаўнага ладу, у рамках якога яно некалі і атрымала свае паўнамоцтвы. Беларусь, усё больш страчвае ўніверсальныя адзнакі прадстаўнічай дэмакратыі і набывае выразныя абрысы дыктатуры ў яе класічным азначэнні – «як у падручніку».

У 1990-х намаганні ўлад краін Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, у адрозненні ад Беларусі, былі засяроджаны на ўмацаванні іхнай легітымнасці праз развіццё дэмакратычных інстытутаў. Больш дэмакратыі – больш ва ўлады правоў называць сябе законнай і сцвярджаць, што за ёй стаіць воля народа. Менш дэмакратыі – больш узурпацыі і ашуквання народа, інтарэсы якога нібы прадстаўляюць людзі ва ўладзе. Бо народ – гэта не група асоб, адабраных кіраўніцтвам, накшталт дэлегатаў «Усебеларускіх

народных сходаў». Народ першасны адносна ўлады. Але гэтак – у дэмакратыі. Калі ж гэтага няма – няма дэмакратыі, і ўлада, што дзейнічае пад «дэмакратычнай» шыльдай, трымаецца на гвалце і фальсіфікацыі, а не на праве. У той жа ступені вынішчаюцца і іншыя прававыя нормы, якія фармуюць паўнавартую дзяржаўнасць, у тым ліку дзяржаўны суверэнітэт.

Адмова ад дэмакратыі і стварэнне перашкод у ажыццяўленні грамадзянскага кантролю могуць прывесці (і заўсёды прыводзілі) да сур’ёзных эканамічных злоўжыванняў, асабліва ў варунках нярынкавай эканомікі. Узгадненне фінансавых (падатковых) зносін паміж уладай і народам яшчэ ў манархій і спарадзіла першыя ў гісторыі формы парламентаў – Генеральныя штаты (ў Францыі з XIV ст.). Кантраляванне народных сродкаў – адна з галоўных парламенцкіх функцый і перадумова падзелу ўлад. У аніводнай з дзяржаў свету, якія фармальна адносяць сябе да «дэмакратый», апрача Беларусі, кіраўнік выканаўчай улады не можа збіраць у сябе назапашаныя за кошт дзяржаўнай уласнасці фінансавыя сродкі, якія не праходзяць праз бюджэт. Такая нацыянальная адметнасць надае асаблівую пікантнасць карупцыйным драмам у найвышэйшых эшалонах беларускай эканамічнай эліты (як, напрыклад, нашумелая справа Жураўковай у 2004 годзе).

Рэальнае дамінаванне выканаўчых органаў у шэрагу краін нідзе не прызнаецца натуральным станам рэчаў. Яно трактуецца як (часовае) адхіленне ад нормы, выклікане экстраардынарнымі акалічнасцямі і звычайна звязанае з неабходнасцю

менавіта фармаванне і ўмацаванне інстытутаў дэмакратыі. Гэтае адхіленне дапушчальнае да пэўных меж, па-за якімі яно ператвараецца ў пахавальніка саміх дэмакратычных прынцыпаў. З пэўнага пункта паняткі «выканаўчая ўлада», «заканадаўчая ўлада», «судовая ўлада», «парламент», «прэзідэнт» і г.д. страчваюць усялякі сэнс. Беларускаму кіраўніцтву ніяк не хапае логікі растлумачыць, не супярэчачы самому сабе, чым жа адметная «беларуская мадэль». Прэтэнзіі сусветнай супольнасці да Беларусі вынікаюць зусім не з ацэнкі «беларускай эканамічнай мадэлі» (якая, у рэшце рэшт, міжнароднай супольнасці да яе справа?) і не з маштабных геапалітычных праектаў малой, эканамічна непераканаўчай і мала каму вядомай краіны. А з таго, што беларуская ўлада, назваўшы сябе прэзідэнтам, парламентам і судом, пагадзілася гуляць паводле агульных дэмакратычных правіл.

Вядома, дэмакратыя не адзіная магчымая форма суверэнітэту, прызнаная міжнародным правам. Таму ўлада ў Беларусі і ейныя ідэолагі раз-пораз намякаюць на нейкія таямнічыя надзвычайныя віды дзяржаўнасці, уласцівыя «ўсходнееўрапейскай цывілізацыі». Але, калі шукаць у Беларусі іншыя формы легітымнасці, давядзецца нанова пачынаць беларускую гісторыю.

Калі адмовіцца лічыць Беларусь прадстаўнічай дэмакратыяй, адразу ўзнікаюць зусім няпростыя і драматычныя пытанні. Якая ж у нас форма ладу – сярэднявечнае веча, якое дае шанцы на княжанне, інстытут родаплемянных правадыроў, дыктатура пралетарыяту і найбяднейшага сялянства ці нешта яшчэ?

Хто персанальна, а галоўнае з якой цяпер рацыі знаходзіцца ва ўладзе? Новая легітымнасць – гэта змаганне за ўладу, якое ўжо не стрымліваюць ніякія дэмакратычныя прынцыпы. Кажучы паліталагічнай мовай, фактычна ўсё гэта раўназначна палітычнай рэвалюцыі, канчатковаму руйнаванню беларускага канстытуцыйнага ладу. З усімі адпаведнымі наступствамі.

Усе найбольш заўважныя еўрапейскія аўтарытарныя і таталітарныя рэжымы XX ст. фармаваліся сіламі, якія выкарыстоўвалі досыць традыцыйныя паводле формы сродкі палітычнага і ідэалагічнага змагання, у тым ліку такія экстраардынарныя, як, напрыклад, рэвалюцыя або дзяржаўны пераварот. Практычна ва ўсіх выпадках аднаасобная ўлада дыктатара абгрунтоўвалася ідэалагічнымі аргументамі і ўзнікала ў выніку перамогі адной з канкуруючых партыйных груповак. Культ правадыра афармляўся амаль рэлігійным расхвальваннем стандартнага набору гіпертрафіяваных асабістых якасцей («геніяльнасці», надзвычайнасці як арганізатара, «народнасці» ды інш.). Разам з тым абгрунтоўвалася роля аўтакратычнага кіраўніка як правадніка пэўнага наканавання, якое перасягала ягоную асабістую значнасць. Гэтая «місія» апісвалася ў шэрагу «кананічных» тэкстаў, прызначаных прадставіць унутрана несупярэчлівую легітымізацыю ўлады і ейных намаганняў у ажыццяўленні «місіі». Нярэдка менавіта аўтакратычныя лідары і былі аўтарамі такіх тэкстаў, у якіх выкладалася пэўная «філасофія» ўлады. Ва ўсіх выпадках рыторыка і логіка аўтакратый не надта адхіляліся ад «палітычнага дыскурсу» іх часу. Аўтарытарныя і таталітарныя рэжымы не проста «лаяліся» або пачыналі вайну з навакольнымі

грамадствамі – яны прэтэндавалі на «перамогу» ў рэалізацыі «ідэй» і своеасабліва вытлумачаных «каштоўнасцей».

У гэтым сэнсе беларуская рэальнасць сапраўды дэманструе шэраг цалкам спецыфічных рыс і практык, якія робяць Беларусь у значнай ступені «цяжкаўлоўнай» з гледзішча звыклых у XX і XXI стст. катэгорый паліталогіі і палітычнай філасофіі.

Першы беларускі прэзідэнт імкліва скокнуў з пазіцыі не надта вядомага, але прабіўнога дэпутата да найвышэйшай дзяржаўнай пасады ва ўмовах адсутнасці паўнавартай палітычнай дыскусіі і аморфнасці палітычнага жыцця грамадства. Гэта адбылося не праз выбар насельніцтвам адной з канкуруючых цэласных стратэгій, а пераважна ў выніку ягонай перавагі і амаль абсалютнай адпаведнасці чаканням людзей на тагачасным рынку харызм і слоганаў. Атрыманыя велізарныя паўнамоцтвы Аляксандр Лукашэнка выкарыстаў не для забеспячэння належнага функцыянавання палітычнага механізму, але для таго, каб узяць суцэльную ўладу і матэрыяльныя рэсурсы краіны ў свае рукі.

Трансфармуючыся з цягам часу, беларускія дзяржаўныя інстытуты, натуральна, паўтараюць «псіхафізіялогію» свайго лідара. Па сутнасці, у Беларусі створана непаўторная дзяржаўня сістэма, адзіным сапраўдным тэарэтыкам і канструктарам якой выступае сёння яе галоўны кіраўнік. Аднак, у адрозненне ад памерлых аўтакратычных палітычных феноменаў мінулага стагоддзя, Аляксандр Лукашэнка не меў сур'ёзнага палітычнага

досведу, не гартаваўся ў шматгадовым змаганні з ідэйнымі апанентамі, не пісаў прац і артыкулаў для абгрунтавання прэтэнзій на ўладу – яго і ягоных паплечнікаў.

Не дзіва, што галоўнай і пакуль адзінай бясспрэчнай палітычнай каштоўнасцю рэжыму стаў персанальна Аляксандр Лукашэнка. Збольшага таму ўлада робіць усё магчымае, каб ліквідаваць у грамадстве публічную палітычную прастору, якая толькі пачынае зараджацца. Не маючы больш-менш ладнай і абгрунтаванай сістэмы каштоўнасцей, улада палемізуе не з рэальнымі палітычнымі апанентамі і ідэямі, якім ёй па сутнасці няма чаго супрацьпаставіць, апрача «харызмы», а сама з сабой, пераконваючы перадусім саму сябе, што ейная эканамічная тактыка найлепшая.

Дамінаванне асабістага досведу прэзідэнта ў фармаванні «беларускай палітычнай і эканамічнай мадэлі» адбіваецца і на тым, што апошняя функцыянуе не як звычны тып дзяржаўнага ладу, а хутчэй як нейкі адзіны гаспадарчы арганізм, найславуты «вялікі саўгас». У гэтай мадэлі сапраўды няма месца для «палітыкі» і адзіны крытэр паспяховасці – гэта адносная эканамічная эфектыўнасць. Цалкам натуральна, што Аляксандр Лукашенка паводзіць сябе хутчэй як «дырэктар» (але і «ўласнік»), кіраўнік гаспадаркі, які ўмешваецца ва ўсе дэталі вытворчага працэсу і змагаецца за «роднае прадпрыемства», чым як прэзідэнт, палітычны лідар грамадства. Вобраз прэзідэнта, які ладзіць «селектарную нараду» аб уборцы ўраджаю або эмацыянальна выгаворвае высокапастаўленаму чыноўніку, не падобны ні да

якой з канцэпцый дзяржаўнага ўкладу, зафіксаваных гісторыяй палітычных інстытутаў. Хіба што ў перыяд заняпаду першабытнаабшчыннага ладу і ўзнікнення першых дзяржаў, калі цары «аралі і сеялі» побач са «сваім», за тымі часамі досыць нешматлікім, народам.

Аднак ва ўмовах несвабоды, замены палітычнай дыскусіі «вытворчай дысцыплінай», выключэння з унутранага жыцця грамадства палітыкі і палітычнага ўдзелу саміх па сабе, без дэталёвага праяснення ў публічнай палеміцы механізмаў перадачы паўнамоцтваў суверэна (ўсяго народа) інстанцыям улады немагчыма казаць аб народаўладдзі. Можна хоць штотыдзень ладзіць «выбары» і «рэферэндумы» – яны застануцца пустой прафанацыяй і сродкам элементарнай аднаасобнай дыктатуры. Разам з тым, такое становішча, вядома, мае мноства спакус для тых, хто здолеў прыстасавацца да сістэмы і знайсці для сябе зручную і даходную нішу.

## 2. Дзяржаўная ідэалогія, легітымнасць і панаванне

Беларуская палітычная мадэль усё менш лічыць для сябе неабходным дасягаць вонкавых прыкмет легітымнасці, замацоўваючы за сабой статус квазідэмакратычнай прасторы. У гэтай прасторы гульня ў агульнапрынятыя працэдуры вядзецца згодна з нормамі і крытэрамі, якія маюць перадусім унутраную вартасць. Улада магла б з лёгкасцю адмовіцца нават ад выбараў, калі б удалося знайсці нейкую іншую форму

ідэалагічнага і прававога апраўдання рэальна сфармаваных у Беларусі механізмаў кіравання.

У працэсе дэмантажу рэальнага народаўладдзя ключавую ролю ў захаванні ягонай вонкавай ілюзорнай абалонкі выконвае «дзяржаўная ідэалогія». Аб гэтым яшчэ ў 1929 годзе пісаў нямецкі сацыёлаг Карл Мангайм, змушаны пазней іміграваць у Вялікабрытанію. У ягонай хрэстаматыйнай працы «Ідэалогія і ўтопія» апісана, як нефункцыянальная «рацыянальна-прававая» легітымацыя ўлады падмяняецца «ірацыянальна-ідэалагічнай». Ні для чаго іншага «адзіная дзяржаўная ідэалогія», забароненая згодна класічным пастулатам аб дактрынальнай нейтральнасці дзяржавы канстытуцыямі шмат якіх краін свету, у тым ліку Рэспублікі Беларусь, папросту не патрэбна. Усё, што трэба дзяржаве, ужо ёсць у Канстытуцыі і нацыянальным заканадаўстве, калі яны, вядома, існуюць і не перапісваюцца штотыдзень.

Інакш кажучы, скланенне на розныя лады словазлучэння «інтарэсы народа» ў любой краіне, у любой дзяржаве – гэта пустаслоўе, калі падрабязна не растлумачаны, не абгрунтаваны і не выкананы дэмакратычныя працэдуры, праз якія інтарэсы народа выяўляюцца і рэалізуюцца. Тое ж датычыць выказванняў «ад імя» ўсяго народа, а не асабіста ад сябе ці пэўнай групы (партый як выразнікаў розных гледзішчаў). Калі ж працэдуры не дзейнічаюць, гэта азначае, што «народаўладдзе» ўсяго толькі дэмагагічная фігура маўлення, за якой стаіць выкарыстанне ў сваіх інтарэсах улады і эканамічных рэсурсаў групай асоб,

якія маюць важкія прычыны праз «ідэалогію» і рэпрэсіі хаваць сапраўднае становішча.

Да той пары, пакуль адна з палітычных груп не наважыцца, атрымаўшы ўладу, стаць адзінай, ліквідаваць сумленную канкурэнцыю і прыбраць сапернікаў – як мінімум з палітычнага поля, як максімум фізічна. Палітычная група робіцца клікай, дэмакратыя змяняецца аўтарытарнай або таталітарнай дыктатурай, ідэйны плюралізм і права кожнага на ўласнае меркаванне і самастойны пошук праўды – абавязковай дзяржаўнай ідэалогіяй. Апошняя звычайна мае трывіяльны змест і яе рэалізацыя малаэфектыўная без магутнага апарату гвалтоўнага прымусу. Манапалізаваныя дзяржавай медыі са сродку распаўсюду інфармацыі ператвараюцца ў зброю для прапагандысцкага абдурвання грамадзян, а культура цэніцца адпаведна таму, наколькі яны прыдатная палітычна абслугоўваць дыктатара і ягоную світу.

У беларускім кантэксце праблемай для пануючай палітычнай групы з'яўляецца адсутнасць выразна артыкуляванай сістэмы каштоўнасцей. Ёсць асоба кіраўніка дзяржавы, з папярэдніх часоў застаўся адміністрацыйны і бюракратычны механізм, але на месцы колішняга ідэалагічнага маналіту пустата. З адной боку, інтэлектуальны і культурны рэсурс цяперашняй улады надзвычай бедны; з іншага, рэальныя задачы, якія яна развязвае, немагчыма аформіць ні ў якую ўстойлівую ідэалагічную праграму.

Бо беларуская ўлада паняткамі свабоды, роўнасці і братэрства або ім падобнымі, вядома, нават не аперуе і ні на якія не патрэбныя ёй «светлыя заўтра» не спасылаецца. Неэфектыўная эканамічная стратэгія, памножаная на міжнародную палітычную і эканамічную ізаляцыю, прынцыпова не ў стане забяспечыць насельніцтву годныя ўмовы існавання – ні зараз, ні ў будучыні, нават самай аддаленай. Застаюцца не закаламучаныя староннімі дамешкамі прагматычныя інтарэсы самой улады. Улада, разам з гэтым, гэта не абстрактная катэгорыя; гэта заўсёды канкрэтныя людзі, якія займаюць у схеме кіравання пэўныя месцы, не толькі несучы канкрэтныя рызыкі, але і даючы канкрэтныя перавагі і магчымасці.

Беларусь у пэўным сэнсе знаходзіцца цяпер у стане «протадзяржаўнасці». Асвоіўшы асобныя вонкавыя дэмакратычныя формы – канстытуцыю, інстытуты прэзідэнцтва і парламента, выбарчую сістэму і г. д. – Рэспубліка Беларусь дагэтуль не згадзілася прыняць суцэльную дэмакратычную сістэму. Але без іншых элементаў дэмакратыі выбары не маюць сэнсу. Атаясамляць народаўладдзе з выбарамі і галасаваннем, нягледзячы на ўсю важнасць гэтых працэдур, элементарная паліталагічная непісьменнасць. Выбары як мінімум павінны ажыццяўляцца ва ўмовах свабоднага выражэння меркаванняў усіх грамадзян (іначай іх вынікі падобныя да «паказанняў, дадзеных пад прымусам»). Улада не павінна быць «прыватызаваная» адной з палітычных груп (колькасць якіх не мае прынцыповага значэння), якая атаясаміла сябе з дзяржавай. То-бок у краіне павінны быць рэальны падзел улад і ідэалагічны плюралізм,

інакш кажучы, розныя тэарэтычныя і светапоглядныя пазіцыі (хаця б, каб далёка не хадзіць, з прычыны розніцы ва ўзроўнях адукацыі).

«Протадзяржаўнасць» Беларусі выяўляецца ў цмянасці палітычных і прававых пасылак сфармаваных у краіне інстытуцыянальных зносін. У асобе свайго палітычнага кіраўніка, які адхрысціўся ад рацыянальнай схемы народаўладдзя, што прынесла яму перамогу ў 1994 годзе, Рэспубліка Беларусь нязменна дрэйфуе да станава-алігархічнага прынцыпу панавання.

3. 2006 год: электаральная руціна і паралельнае грамадства

Найзначнейшым адкрыццём, якое не без пэўнага здзіўлення зрабіла беларуская «дэмакратычная супольнасць» падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006 года, стала ўсведамленне таго хрэстаматыйнага факта, што рэальныя палітычныя выбары ў аўтарытарнай краіне, у якой няма сур'ёзнага ўнутранага крызісу, немагчымы. Гэта выключана самім характарам аўтарытарнага тыпу кіравання, уласцівымі яму метадамі і формамі ўтрымлівання ўлады. Вядома, аб «адкрыцці» можна казаць толькі ўмоўна. З 2001 да 2006 года сутнасць палітычнага рэжыму ў Беларусі не змянілася. Менавіта «элегантнае» ажыццяўленне згаданага вышэй прынцыпу не дазволіла дэмакратычным дзяржавам «дэ-юрэ» прызнаць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у 2001 годзе. Але толькі цяпер формула «выбары без выбараў», якая дагэтуль

мела, бадай, рытарычны сэнс, стала адной з банальнасцей, якія апісваюць фактычнае палітычнае жыццё ў Беларусі.

Адсутнасць сумленнай канкурэнцыі, уціск палітычных свабод, распаўсюд палітычнага вышуку і пераследаў за палітычныя погляды, ідэалагічная манаполія ўлады, масавы прапагандысцкі наступ, які базуецца на падтасоўваннях і правакацыях, выключэнне прынцыпова роўных магчымасцей распаўсюду інфармацыі і выказвання выбарцамі ўласнай пазіцыі… У такіх умовах вынікі выбараў характарызуюць хутчэй існую палітычную сістэму, чым сапраўдны патэнцыял палітыкаў, якія імкнуцца ўтрымацца ў «легальным» прававым полі.

Усведамленне ператварэння выбараў (за выняткам прэзідэнцкіх, якія зводзяцца да дэкаратыўна-прапагандысцкіх мерапрыемстваў) у руцінны інструмент кадравых абнаўленняў «ніжэйшых органаў», цалкам падкантрольны аўтарытарнаму цэнтру, шмат чаго вартае. І можа шмат чаго, прынамсі тэарэтычна, змяніць.

Прававыя і палітычныя інстытуты і практыкі аўтарытарызму (і таталітарызму) XX і ўжо XXI стст. заўжды скіраваны на максімальнае аддаленне механізму ратацыі вярхоўнай улады ад насельніцтва краіны, якое фармальна мае грамадзянскія правы. (Тая ратацыя можа адбывацца хіба што ў выніку сутыкнення і пераразмеркавання інтарэсаў у тонкім слоі палітычнай і эканамічнай алігархіі.) Менавіта гэтыя тэндэнцыі лагічнага

завяршыліся ў палітычнай рэфармацыі ў гады панавання А. Лукашэнкі.

Устойлівасць і легітымнасць (квазілегітымнасць) улады ў такіх варунках вызначаюцца не выражэннем палітычнай волі грамадзян у працэсе «выбараў», а ад супрацiўнага – узроўнем гатоўнасці ці негатоўнасці шырокіх грамадскіх груп да тых ці іншых формаў пратэставых або рэвалюцыйных дзеянняў. Бо іншых шляхоў змены ўлады непасрэдна насельніцтвам краіны «стабільны» аўтарытарны рэжым не мае.

Між тым, згаданая гатоўнасць залежыць ад цэлага шэрагу фактараў, дзе суб'ектыўныя якасці і палітычныя таленты далёка не заўсёды граюць галоўную ролю. Сакавік 2006 года зрабіў відавочным тое, што раней выказвалася толькі ў якасці гіпотэз, – наяўнасць у краіне значнага пратэставага патэнцыялу, як дынамічнага, так і пасіўнага. Зрэшты, гэта цалкам натуральна для любой краіны (і досыць праблематычна ў рэпрэсіўным таталітарызме), якраз утвараючы перадумову дэмакратыі.

Доўгі час менавіта апазіцыі адводзілася сімвалічная роля асноўнага «палітычнага дзеяча», адказнага за ажыццяўленне змен. Астатнюю частку грамадства, не задаволеную існым становішчам, гэта прымушала думаць, што іхнае месца ў «дэмакратычным працэсе» – зала чакання. Такое разуменне па сутнасці падтрымлівалася і самой палітычнай апазіцыяй. Зараз ідэя таго, што рашучых «прыхільнікаў змен» трэба шукаць і па-за межамі партыйных ячэек, стала агульным месцам. Аднак

нават найактыўнейшыя носьбіты «ценявога» «пратэставага патэнцыялу» часта не толькі знаходзяцца па-за зонай бачнасці і ўплыву структурна арганізаванай апазіцыі, але і прынцыпова не падзяляюць прынятыя ёю нарматывы палітычных паводзінаў.

Неаднаразовае абвяшчэнне найноўшага аб'яднання намаганняў і згуртавання ўсіх рухаў пад агульным, няхай нават калектыўным, кіраўніцтвам, з агульнымі лозунгамі і мэтамі дагэтуль не прывяло да нейкіх заўважных зрухаў. Магчыма, прыспеў час ссунуць акцэнты, пераключыўшы ўвагу з субардынацыі на каардынацыю і дыверсіфікацыю, стымулюючы развіццё іншых формаў дэмакратычнага досведу, апрача непасрэднага змагання за ўладу, дзеля якога, уласна, у дэмакратычных сістэмах і ствараюцца палітычныя партыі. У Беларусі, аднак, паўнавартая дэмакратычная сістэма, не паспеўшы ўтварыцца, была ліквідаваная. Аднак дэмакратычнае грамадства ў краіне існуе. Як «паралельнае» афіцыйнаму, з апорай на іншыя маральныя арыенціры, іншыя каштоўнасці, чым тыя, што, ліхаманкава змяняючы адна адну, няўцешна ўзрастаюць з патрэбы захаваць рэжым аднаасобнай улады і перыядычна разжоўваюцца нам БТ.

Беларускае «паралельнае» грамадства, якое існуе ў краіне, але і за мяжой, знаходзіцца пераважна ў цяні, а не на экране тэлевізара. Тым не менш, дзякуючы адноснай непераможнасці сучасных тэхналогій і адноснай жа адчыненасці меж, яно падтрымлівае актыўныя ўнутраныя і вонкавыя камунікацыі і можа развівацца не толькі ў рэчышчы дасягнення непасрэдных палітычных мэт. Аўтарытарызм, які – у адрозненне ад

таталітарызму – ідэалагічна і арганізацыйна надбудаваны над асабістымі ўласцівасцямі кіраўніка, амаль заўсёды дэградаваў і распадаўся пасля змены суадносін сіл, зняцця аўтакрата з улады або ягонага адыходу «натуральным чынам». З улікам гэтага для сучаснасці і будучыні прынцыпова важна здабыванне досведу незалежнага існавання, самастойнага мыслення, свабоды і звязанай з ёй асабістай адказнасці.

У гэтым сэнсе ўсё самавызначаныя арганізацыі і супольнасці – фармальныя ці нефармальныя, прыродаахоўныя, гістарычныя, культурныя, часова створаныя ў інтэрнэце і г. д. – з'яўляюцца ўдзельнікамі і суб'ектамі змен. Пашырэнне гэтай свабоднай ад аўтакратыі «паралельнай» прасторы, адбываецца аб'ектыўна, хаця і не кананічна, і з'яўляецца не менш неабходным, чым палітычная дзейнасць.

Святлана Навумава

# Сучасны беларускі палітычны дыскурс (Што і як мы гаворым пра палітыку)*

* Упершыню тэкст быў надрукаваны ў часопісе “Грамадзянская альтэрнатыва”, № 2, 1999 год. У дадзеным зборніку тэкст друкуецца з ласкавай згоды рэдактара “Грамадзянскай альтэрнатывы” В. Карбалевіча.



## Анатацыя

*У фокусе гэтага тэксту месціцца панятак беларускага палітычнага дыскурсу, а таксама дыскурс-даследаванняў, якія з 90-х гадоў мінулага стагоддзя ўвайшлі ў шэраг актыўных метадаў беларускай палітычнай навукі. Аўтарка аналізуе тагачасны (канца XX ст.) беларускі палітычны дыскурс, альбо што і як тады казалі палітыкі пра палітыку. Надзвычай важна вызначыцца з тлумачэннямі слоў, якія ўжываюцца ў моўных узаемадзеяннях у палітыцы: менавіта праз гэта высвятляюцца прынцыпы, нормы і правілы супольнага жыцця людзей у грамадстве. Звычайна палітыкі ў дэмакратыях выпрацоўваюць і ўжываюць універсальныя, кампрамісныя паняткі, каб іх разумелі ўсе. Але ў недэмакратыях, асабліва ў перыяды крызісу, палітычныя тэрміны набываюць featured рознае і цьмянае значэнне, безліч канатацый, што парушае стабільнасць грамадства. Аналіз палітычнага дыскурсу канца XX ст. дазваляе вызначыць праблемнае камунікацыйнае поле і канстатаваць рознаўзроўневасць і разнамоўнасць палітычных апанентаў у Беларусі. Яны гавораць на розных мовах, яны не разумеюць адзін аднаго, а таму дыскусія і развіццё краіны немагчымыя, бо парушаная асноўная ўмова развіцця – камунікацыя.*

Апошнім часам у айчыннай палітычнай навуцы вельмі заўважная цікавасць да дыскурс-даследаванняў. Панятак «дыскурс» не надта даўно ўвайшоў у сучасны паліталагічны лексікон, але ўжо трапіў у шэраг так званых «модных» тэрмінаў. З аднаго боку, гэта можна і трэба вітаць: увядзенне новых паняткаў і

новых падыходаў спрыяе прыросту ведаў пра аб’ект, дапамагае ўзнавіць звёны, якіх не стае ў прычынна-выніковых сувязях тых ці іншых працэсаў. З іншага боку, дыскурс-даследаванні не могуць і не павінны прэтэндаваць на стварэнне ўніверсальных і вычарпальных тлумачэнняў складанай палітычнай рэальнасці. Апошняя акалічнасць вымагае ўдакладнення самога панятку «дыскурс» у дачыненні да сферы палітыкі.

Дыскурс – гэта від моўнай камунікацыі, арыентаваны на абмеркаванне дзеянняў, падзей, фактаў, выказванняў адносна значных аспектаў сацыяльнай рэальнасці. Панятак «дыскурс» адным з першых выкарыстаў нямецкі сацыяльны філосаф Ю. Хабермас у пачатку 70-х гадоў XX ст. ў кантэксце тэорыі камунікацыі. Ён зыходзіў з таго, што праз слоўнае тлумачэнне, а значыць, праз мову, можа быць абмеркавана ўсё значнае для чалавека (ў тым ліку, заўважым, і самі структуры мовы). У такога роду моўным узаемадзеянні робяцца яўнымі нормы, прынцыпы, правілы супольнага жыцця людзей, фіксуюцца адрозненні таго, што ёсць, ад таго, што мае быць.

Пасля Хабермаса да даследаванняў дыскурсіўных практык звярталіся шмат якія даследчыкі. У прыватнасці, амерыканскі сацыёлаг Э. Гулднер у сваіх даследаваннях інтэлігенцыі як «новага класа» звярнуў увагу на тое, што адной з галоўных ягоных прыкмет ёсць валоданне культурай крытычнага дыскурсу. Гэта не толькі нейкая спецыфічная моўная супольнасць, але і частка культурнага капіталу, такая ж значная, як уласнасць на сродкі вытворчасці або грошы. Дыскурс – гэта не проста паўсядзённае

маўленне (хоць і яно можа стаць аб'ектам даследавання і крыніцай інфармацыі). Дыскурс – гэта мова па пэўных правілах, мова з выкарыстаннем адрэфлектаваных паняткаў, тых лексічных адзінак, якія ўсталяваліся. Дыскурс інтэлектуалаў – рацыянальны, стандартызаваны, пабудаваны па агульналагічных правілах – прыводзіць, на думку Гулднера, да аўтанамізацыі новага класа, які здольны змяніць сучаснае грамадства.

У сучасным грамадазнаўстве даследаванні дыскурсу вельмі папулярныя. У свой час дыскурс-аналіз зрабіў своеасаблівую рэвалюцыю ў даследчых практыках гуманітарных навук, аб'яднаўшы дзве такія сферы, як свет знакавага зместу (адлюстраванне) і свет сацыяльнага дзеяння (паводзіны). Сёння можна выдзеліць мноства кірункаў і канцэптуальных падыходаў у даследаванні дыскурсу – ад вузка лінгвістычных да культуралагічных у самым шырокім сэнсе гэтага слова.[1]

У гэтым артыкуле мы зыходзім з таго, што панятак «дыскурс» фіксуе зместавае адзінства тэксту і сацыяльнага кантэксту. Дыскурс – гэта не проста словы, але словы, якія выказваюцца тут і цяпер, у дадзены час і ў дадзеным сацыяльным кантэксце. Такім чынам, дыскурс-аналіз робіць сваім аб'ектам не толькі тэкст, але і экстралінгвістычныя фактары: веды аб свеце, меркаванні, установкі, мэты, сацыяльны досвед, стылістыку жыцця камунікантаў. Менавіта гэтыя чыннікі і робяць магчымым

1 Гл. пра гэта падрабязней у кн.: Методология исследования политического дискурса. Актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов. Выпуск 1. Мн., 1998. Сс. 7–9.

разуменне тэксту.[2] Даследчык дыскурсу не проста «разбірае» тэкст на складнікі, але спрабуе высвятліць, чаму адзін тэкст бывае зразуметы, а іншы застаецца за межамі разумення; чаму ў адных выпадках камунікáнты слухаюць і чуюць адзін аднаго, а ў іншых – размаўляюць быццам на розных мовах.

Як вядома, веды аб свеце ў кожнага чалавека арганізаваны ў пэўныя канцэптуальныя сістэмы, якія атрымалі назву «фрэймы». Фрэймы нагадваюць нейкія рамкі, у якія ў пэўным парадку ўкладваецца новая інфармацыя пра свет. Прыкладам такой рамкі можа служыць той ці іншы канцэпт, праз прызму якога чалавек прыватызуе новую інфармацыю. Гэтак, інфармацыя пра пашырэнне НАТО на ўсход у постсавецкім грамадстве можа разглядацца аднымі як праява агрэсіі імперыялізму, другімі як сведчанне сусветнай змовы, трэцімі як перамога дэмакратычных каштоўнасцяў і да т. п.

Фрэймы маюць канвенцыйную (дамоўную) прыроду, і калі ў двух і больш камунікантаў змест фрэймаў або прынамсі канцэптаў супадае, то ёсць імавернасць паразумення ў той ці іншай ступені. Калі ж падабенства ў фрэймах мы ў камунікантаў не назіраем, то разуменне не дасяжнае.

Вывучэнне дыскурсу асабліва важнае ў палітыцы. Не будзе перабольшаннем сказаць, што мова ў палітыцы адзін з галоўных інструментаў. У дачыненні да гэтай сферы чалавечага жыцця мы

2 Ван Дэйк Т. А. Язык. Познание. Коммуникация. М., 1989. Сс. 121–122.

можам казаць не толькі пра мову ўлады, але і пра ўладу мовы. Часам гэты бок палітыкі асабліва акцэнтуецца даследчыкамі. Як лічыць нямецкі палітолаг М. Гэтых, мы называем палітыкай тое, што маецца на ўвазе самімі людзьмі. Палітыка існуе толькі ў выглядзе мыслення, размовы, паводзінаў.[3] Вядома, панятак «палітыка» нельга лічыць чыста вербальным самавольствам, але і недаацэньваць у ёй ролю мовы таксама не варта.

* * *

Навошта патрэбны сёння дыскурс-даследаванні? Вядома, адказаць на гэтае пытанне можна элементарна: ад усялякіх даследаванняў ёсць нейкая карысць. Аднак у дадзеным выпадку нам хацелася б звярнуць увагу чытача на тое, што такія даследаванні носяць не толькі чыста акадэмічны, але і палітычна-практычны характар. Даследаванне сучаснага беларускага палітычнага дыскурсу, на маю думку, гэта адначасова даследаванне шанцаў трансфармацыі і яе магчымых шляхоў. На карысць гэтага тэзіса прывядзём прынамсі тры аргументы.

Па-першае, усялякае вымаўленае слова – гэта не толькі страсенне паветра, але і канструяванне нейкай іншай рэальнасці, якая мае пэўны ўплыў на рэальнасць першасную. Мабыць, не трэба забываць, што звыклае супрацьпастаўленне слова справе мае досыць умоўны характар. Слова таксама справа (нездарма кажуць, што словам можна параніць і нават забіць), асабліва ў

3 Гл.: Политология. 70–80-е годы. Сборник рефератов. М., 1993. С. 57.

палітыцы, дзе аб'ектам камунікацыі робяцца вялікія сацыяльныя групы. Сацыяльныя трансфармацыі не могуць не адбівацца і на мове, асабліва на мове палітычнай. Гэтак, перамены апошняга дзесяцігоддзя прынеслі ў наша жыццё новыя словы («плюралізм», «кансэнсус», «спікер», «рэйтынг» і інш.), а таксама новыя сэнсы старых слоў. Да прыкладу, дэмакратыя перастала быць «сацыялістычнай» або «буржуазнай», а правы чалавека пазбыліся прыстаўкі «так званыя». Мы не толькі фіксуем гэтыя перамены, але і заўважаем, што ў размове пра палітыку трансфармаванай мовай мы ўяўляем і, як вынік, творым і нейкую новую палітычную рэальнасць.

На жаль, апошні тэзіс пацвярджаецца і прыкладамі «ад супраціўнага». Гэтак, слова «парламент» у нашым штодзённым палітычным лексіконе аніяк не аднясеш да разраду часта ўжываных. Акрамя таго, як паказваюць даследаванні,[4] у тлумачэнні гэтага слова ў значнай частцы насельніцтва назіраецца досыць заўважны дэфект: парламент часцей разглядаецца не як орган прадстаўніцтва інтарэсаў, а як дарагая забава, збор людзей, якія шмат гавораць (а не працуюць!). Разгорнутая ў гэтым кантэксце прапагандысцкая кампанія напярэдадні рэферэндуму 1996 года яшчэ больш пераконвала аўдыторыю медыяў, што парламентарызм – гэта нешта неабавязковае, а часам нават і шкоднае. Досыць прыгадаць, што ў большасці артыкулаў і выступаў у афіцыйных медыях прадметам крытыкі рабіліся не толькі

4 У дадзеным выпадку аўтар спасылаецца на даследаванні, праведзеныя сумесна з Г. Максютам у межах праекта «Трансфармацыя псіхалагічных механізмаў сацыяльна-палітычнага выбару» ў 1996 годзе.

Вярхоўны Савет 13-га склікання, але і парламентарызм як такі. Усё гэта яшчэ больш аддаляла наша грамадства ад усведамлення каштоўнасці парламентарызму і, як вынік, ад дзеянняў для яго абароны. Няцяжка прагназаваць, што падчас найбліжэйшых выбарчых кампаній кандыдатам не раз давядзецца адказваць на пытанне «А навошта ён патрэбны, гэты парламент?». Такім чынам, слова зноў-такі ператвараецца ў справу і ігнараваць гэты чыннік было б неправамоцна.

Па-другое, вывучэнне дыскурсу – гэта вывучэнне магчымасці разумення, дыялогу і кансэнсусу як свайго роду грамадскай дамовы, а не прымусовага адзінства. Мы павінны ўсведамляць тое, што разуменне не дасягаецца аўтаматычна нават у тых выпадках, калі гаворка ідзе пра самыя простыя і нават штодзённыя рэчы. Чым складаней аб'екты, працэсы, сюжэты абмяркоўваюцца людзьмі, тым цяжэй ім паразумецца. Гэта пагатоў справядліва ў дачыненні да палітыкі, дзе камунікантамі выступаюць часам вялікія грамадскія групы, якія могуць аперуваць паняткамі высокай ступені абстракцыі, г. зн. паняткамі шматзначнымі. Палітычны дыскурс – гэта дыскурс адносна значных для грамадства праблем, а яны заўсёды складаныя і шматаспектныя. Такім чынам, тут гаворка ідзе не аб разуменні як такім, а толькі аб тым ці іншым узроўні разумення.

Асноўная праблема разумення ў нашым выпадку можа быць сфармулявана як супярэчнасць паміж выкарыстаннем адзінай для ўсіх камунікантаў мовы ўзаемадзеяння (расейскай, беларускай або іншай) і выкарыстаннем палітычных паняткаў, якія

напоўнены для камунікантаў рознымі (часам супрацьлеглымі) сэнсамі. Вядома, у кожнага палітычнага панятку ёсць так званы нарматыўны сэнс, г.зн. той, што сустракаецца ў адпаведных слоўніках як форма фіксацыі супольнага сацыяльнага досведу. Але падчас камунікацыі гэтае нарматыўнае значэнне «абрастае» індывідуальнымі сэнсамі. Яны ўзнікаюць з асабістага сацыяльнага досведу, з сучаснай палітычнай практыкі, а часам з нейкага выпадковага спалучэння абставін, міжвольных вобразаў і асацыяцый. Мабыць, тут няма ярчэйшага прыкладу, чым лёс слова «дэмакратыя», якое мае такое мноства семантычных наслаенняў, што часта ўзнікае ўражанне, быццам яно ўвогуле пазбаўлена ўсялякага сэнсу або памяняла яго на супрацьлеглы.

Заўважым, дарэчы, што гэтая праблема існуе не толькі ў палітычным, але і ў паліталагічным дыскурсе. Слоўнік палітычнай навукі шмат у чым супадае са слоўнікам палітыкі. Такое супадзенне навуковай і штодзённай мовы, як вядома, бывае далёка не заўсёды. Гэтак, мова філалогіі далёкая ад мовы мастацкай літаратуры. Палітыка ж і паліталогія аперуюць тымі ж самымі паняткамі, што робіць праблему разумення ў даследчыцкім асяроддзі досыць істотнай.

Увогуле дасягненне разумення ў палітыцы – гэта не проста добрае пажаданне або маральны імператыў. Яно робіцца жыццёва важным, бо ўтварае неабходную ўмову стабільнага існавання і ўстойлівага развіцця грамадства. Гэта пагатоў важна ва ўмовах дэмакратыі, дух і літара якой –плюралізм і канкурэнцыя. Адсутнасць разумення ў гэтым выпадку прыводзіць да

канфліктаў, канфрантацыі і, як вынік, знішчэння дэмакратыі. Такім чынам, і тут праблема дыскурсу пераходзіць з галіны акадэмічных разваг у галіну актуальнай палітычнай практыкі.

Нарэшце, па-трэцяе, гаворачы пра палітычны дыскурс, мы гаворым пра механізмы і якасць палітычнага выбару. Гаворка ідзе не толькі пра фармалізаваную і ўзаконеную працэдуру дэлегавання паўнамоцтваў народам ягоным прадстаўнікам, але пра выбар у самым шырокім сэнсе гэтага слова. Строга кажучы, палітычны выбар робіцца чалавекам заўсёды. Трансфармацыйнае грамадства павялічвае колькасць актаў палітычнага выбару і істотна пашырае яго спектр. Чалавек атрымлівае магчымасць выбіраць «свае» газеты, партыю, лідара, кандыдата, алгарытмы паводзінаў. Пасля таталітарызму і аўтарытарызму яму даецца магчымасць выбраць паміж удзелам і няўдзелам у палітыцы. Нарэшце, гэта можа быць выбар стратэгічнага праекта для ўсёй краіны.

Як жа робіцца сам выбар? Калі разбіць гэтую працэдуру на складнікі, то яе можна звесці да некалькіх аперацый: суб’ект выбару разглядае ўсе прапанаваныя альтэрнатывы (кандыдатуры), суадносіць іх з уяўленнямі аб тым, «што такое добра і што такое дрэнна», г.зн. з тымі эталонамі, якія ў яго ёсць і якія дапамагаюць яму меркаваць, да якіх наступстваў прывядзе выбар кожнай з альтэрнатыў з гледзішча карыснасці для сябе і іншых. Такую працэдуру ў ажыццяўленні рацыянальнага выбару робіць кожны з нас. Вядома, пасля мільёнаў выбараў асобы яна ўжо «абкатаная» ў ейнай жыццёвай практыцы і не вымагае інструкцый або

шпаргалак. Але карысць ад гэтай абстрактнай схемы, несумненна, ёсць. Апошняя дэманструе, наколькі важныя эталоны для ажыццяўлення палітычнага выбару.

Такімі эталонамі служаць у палітыцы паняткі, тэрміны, устойлівыя вобразы і тлумачальныя схемы, г.зн. тое, што і ўтварае тканіну палітычнага дыскурсу. Калі ў чалавека сфармаваны дэфектныя эталоны, ён, найхутчэй, здзейсніць і дэфектыўны палітычны выбар. Гэта няцяжка праілюстраваць прыкладам з жыццёва-бытавой практыкі. Гэтак, калі падчас куплі нейкага тавару эталонам для нас выступае толькі таннасць або прыгожая ўпакоўка, мы рызыкуем зазнаць няўдачу. Гэта, дарэчы, і адбывалася з большасцю грамадзян у той момант, калі на наш спажывецкі рынак павалілі танныя, вонкава прывабныя разнастайныя тавары, якія страчваюць вартасць на другі дзень карыстання. Адрозненне ад палітыкі ў гэтым выпадку толькі ў тым, што навучанне правільнаму выбару і выпраўленне эталонаў адбываецца ў звычайным жыцці значна хутчэй. У палітыцы ўсвядоміць сувязь паміж дэфектыўным выбарам і яго наступствамі значна цяжэй, хоць такія ўрокі тут маюць нашмат вышэйшы кошт.

Фармаванне карэктных эталонаў сродкамі адукацыі, ведамі або практыкай – гэта адна з асноўных задач сённяшняга дня. Але, перш чым брацца за гэтую сапраўды патрэбную справу, неабходна зрабіць адпаведную дыягностыку. І тут нам таксама не абысціся без дыскурс-аналізу.

* * *

Першае пытанне, з якога звычайна пачынаецца дыскурс-аналіз, гэта пытанне пра тое, на якой палітычнай мове мы гаворым. На першы погляд гэтае пытанне можа падацца наіўным. Ці трэба над гэтым задумвацца, калі мы штодзённа, калі не штогадзінна, сутыкаемся з размовамі пра палітыку; мы можам заставацца іх староннімі назіральнікамі або рабіцца іх удзельнікамі, але ў любым разе мы цалкам разумеем, аб чым ідзе гаворка. Але так можа здавацца менавіта на першы погляд. Уважлівы разгляд дазваляе зрабіць выснову, што прычынамі палітычных спрэчак (ад спрэчак у чэргах і ў грамадскім транспарце да публічных маўленчых баталій палітыкаў) робіцца якраз неразуменне на ўзроўні базавых паняткаў і вызначэнняў. Заўважым, што звычка намінаваць тыя ці іншыя працэсы і з'явы неадпаведнымі ім словамі – гэта адна з істотных рыс постсавецкай палітычнай практыкі. Гэтак, словам «дэмакраты» называюцца людзі, якія арганізуюць аднаўленне «канстытуцыйнага ладу» (?) ў Чачні; словам «камуністы» – паслядоўныя змагары за аднаўленне беларускага парламентарызму; «ліберальна-дэмакратычнай» – партыя, у словах і справах якой няма ні лібералізму, ні дэмакратыі. Гэта можна растлумачыць і гістарычнымі прычынамі. Цяжка знайсці больш даухсэнсоўную сістэму намінацый і вызначэнняў чым тая, якая існавала падчас сацыялізму. Досыць прыгадаць, што вядомы выраз «па шматлікіх просьбах працаўнікоў», які друкаваўся ў прэамбуле якой-небудзь пастановы Партыі і ўрада, прымушаў заміраць сэрцы мільёнаў людзей, бо азначаў, што далей будзе нешта зусім для

працаўнікоў непрыемнае і непатрэбнае. Такая двухсэнсоўнасць (трох-, чатырох-, ... сэнсоўнасць) выкараняецца не вельмі хутка, асабліва калі не прыкладаць да гэтага асэнсаваных намаганняў. Больш за тое, гульня ў словы надае інтэлектуальнаму жыццю на постсавецкай прасторы пэўны шарм, асабліва ў размовах сярэдняга пакалення інтэлігенцыі, якая ў свой час паспяхова авалодала культурай палітычнага падтэксту.

Такім чынам, сёння гаворка павінна ісці аб праясненні сэнсаў палітычных паняткаў, якімі аперуюць розныя сацыяльныя групы, г.зн. укладанні свайго роду «дзікарослых» палітычных слоўнікаў са слоў і іх сэнсаў, якія ходзяць у сучасным беларускім грамадстве. Гэтая задача такая ж актуальная, як і складаная. Для яе развязання патрэбны асаблівыя методыкі, якія дазваляюць адэкватна выяўляць скарыстаныя сэнсы і разам з тым не ставіць рэспандэнта ў пазіцыю экзаменаванага. У адваротным выпадку мы рызыкуем атрымаць або сацыяльна-нарматыўныя адказы, або не атрымаць іх увогуле. Відаць, такія методыкі можна шукаць як у галіне сацыялогіі, так і ў галіне псіхалогіі.

Гэтак, аўтарка брала ўдзел у даследаванні, дзе ў якасці эксперыментальнай была ўзята група студэнцкай моладзі розных сталічных ВНУ.[5] Работа вялася ў рэжыме даследавання асобнага

5 Падрабязней аб гэтым гл.: Максюта Г., Наумова С. Слово как раздражитель аудитории: к вопросу об исследовании семантических пространств политических понятий // Методология исследования политического дискурса. Актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов. Вып. 1. Мн., 1998.

выпадку з ужываннем метаду свабодных асацыяцый. Наша даследчыцкая задача палягала ў тым, каб паказаць, якія прыкметы тых або іншых аб’ектаў палітычнай рэчаіснасці вылучаюцца падвыпрабабавальнымі асобамі; ці могуць супадаць гэтыя прыкметы ў розных падвыпрабабавальных (якія ўваходзяць тым не менш у адну сацыяльную групу); і ці можна на гэтай падставе даць агульнае для дадзенай групы вызначэнне аб’ектаў. Для развязання гэтай задачы ў якасці аб’ектаў намі быў выдзелены шэраг базавых палітычных паняткаў: «палітыка», «выбары», «улада», «мітынг», «дэпутат», «дыктатар», «эліта», «грамадзянскі абавязак», «дэмакрат», «партыя», «анархія». Групе рэспандэнтаў зачытваліся гэтыя словы і прапанавалася пасля кожнага слова запісаць першую асацыяцыю, якая прыйдзе ў галаву. Час для роздуму быў абмежаваны, таму тыя, хто не паспявалі своечасова зрэагаваць на прапанаванае слова, ставілі ў апытальным лісце прочырк. Атрыманыя вынікі былі прапанаваны для класіфікацыі незалежным экспертам, якія выдзелілі сярод іх словы-рэакцыі, якія маюць істотныя, а не канкрэтна-сітуатыўныя або выпадковыя параўнанні, метафары ці клішэ. Вядома, такі эксперымент меў лакальны характар і таму не мог прэтэндаваць на канчатковасць і бясспрэчнасць высноў. Разам з тым, не раскрываючы падрабязна яго працэдуры і вынікаў, прапануем чытачу для роздуму шэраг высноў.

Па-першае, у большасці выпадкаў рэспандэнтамі прапаноўваліся не нарматыўныя (замацаваныя ў слоўніках) сэнсы паняткаў. Супадзенне з эталонам у розных выпадках дэманстравалі ад 12 да 33 % рэспандэнтаў. Напрыклад, панятак «улада» часта

асацыявалася з гвалтам, пакарэннем, дыктатурай. У свядомасці большай часткі рэспандэнтаў улада і ёсць дыктатурай, а дыктатура і ёсць уладай. Такім чынам, улада для іх звязаная не з працэдурамі перамоў і ўзгаднення інтарэсаў, а з гвалтам і ўціскам. У гэтай логіцы змагацца за ўладу – ганебна, балатавацца – «рвацца да ўлады», што ў нашым этычным кантэксце варта ўсялякага ганьбавання.

Па-другое, большасць удзельнікаў эксперымента аперуе канкрэтна-сітуацыйнымі, а не абстрактнымі сэнсамі. Гэта азначае, што абстрактныя палітычныя паняткі ўспрымаюцца імі толькі ў канкрэтнай, адчуванай, знаёмай форме. Гэтак, больш за 70 % рэспандэнтаў да слова «ўлада» прапанавалі такія асацыяцыі, як «трон», «грошы», «кароль», «АМАП», «злачынства», «дурдом» і інш. Слова «палітыка» больш чым у паловы апытаных асацыюецца са словамі «газета», «грошы», «людзі», «бруд», «балталогія». Але ж шмат у чым менавіта панятак «палітыка» ёсць сэнсавым ключом да разумення ўсіх палітычных працэсаў.

Па-трэцяе, большасць прапанаваных паняткаў у значнай часткі рэспандэнтаў выклікалі негатыўныя асацыяцыі. Гэтак, на слова «палітыка» негатыўныя былі асацыяцыі ў 60 % апытаных, на слова «мітынг» – у 32 %, на слова «выбары» – у 26 %, на слова «ўлада» – у 22 %. Зыходзячы з гэтага можна зрабіць выснову, што ў шмат каго палітыка ўвогуле выклікае хутчэй адмоўныя, чым станоўчыя эмоцыі. Вядомае клішэ «палітыка брудная справа» ў іхнай свядомасці замацавана досыць трывала.

Такія высновы прыводзяць нас да думкі аб неабходнасці далейшых даследаванняў у гэтай галіне. Любая палітычная камунікацыя можа прэтэндаваць на эфектыўнасць толькі ў тым выпадку, калі камуніканты маюць уяўленні аб слоўніках адзін аднаго. Можна меркаваць, што такіх слоўнікаў у грамадстве можа быць некалькі – у залежнасці ад стылявых асаблівасцей жыцця, сацыяльнага досведу, дэмаграфічных і іншых параметраў.

* * *

У залежнасці ад замацаванага палітычнага слоўніка ў грамадстве будуць мець месца разнастайныя дыскурсіўныя колы. Увогуле гэтую з'яву можна характарызаваць як цалкам нармальную, але толькі з той умовай, што гэтыя колы не ізаляваны адно ад аднаго і могуць наладжваць міжсобку камунікацыю. У адваротным выпадку мы маем праблему драбнення і інкапсуляцыі дыскурсаў, калі прадстаўнікі розных дыскурсных груп гавораць быццам на розных мовах, не разумеючы адзін аднаго. Іхны дыялог робіцца бессэнсоўным, як калі б на пытанне аднаго чалавека «Каторая гадзіна?» іншы адказваў бы: «Дзякуй, я ўжо пападвячоркаваў». У палітычнай сферы такое драбненне зусім не бяскрыўднае. Як ужо згадвалася вышэй, праблема неразумення ў сферы палітыкі – гэта просты шлях да адчужэння, напружанасці, канфліктаў і канфрантацыі ў грамадстве.

Сёння з жалем можна канстатаваць, што прыкметы такога драбнення абрысаваліся і ў беларускім грамадстве. Водападзел

праходзіць найперш па лініі «дыскурс улады – контрдыскурсія».[6] Яго можна добра назіраць на прыкладзе дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсы. Таксама заўважым, што ў беларускім грамадстве медыі граюць адметную ролю. Яны робяцца цэнтрамі артыкуляцыі палітычных пазіцый. Прэса не толькі інфармуе, адукоўвае, забаўляе, але і бярэ на сябе функцыю, якую, паводле вядомага выказвання, можна назваць функцыяй «калектыўнага арганізатара». Падкрэслім, што гаворка ідзе не аб партыйнай прэсе (што было б натуральна), а аб агульнанацыянальных медыях. Сёння большасць беларускіх грамадзян, якія цікавяцца палітыкай, падзяляюцца не на прыхільнікаў камуністычнай або ліберальнай, сацыял-дэмакратычнай або нацыянальнай ідэі, а на чытачоў «Навін» або «Народнай газеты», «Советской Белоруссии» або «Народнай волі» і г.д. Менавіта таму прэса робіцца адэкватнай крыніцай для аналізу беларускага палітычнага дыскурсу ўвогуле.

Як паказваюць вынікі нашага даследавання, існуе нешта асаблівае, спецыфічнае ў палітычным дыскурсе газет у залежнасці ад іх моўнай прыналежнасці. Беларуская і расейская – гэта не проста розныя ў лінгвістычным сэнсе мовы зносін. Беларуская мова заўсёды нясе на сабе пячатку апазіцыйнасці, тым часам як расейская можа выкарыстоўвацца як у афіцыйным дыскурсе, так і ў контрдыскурсіі. Увогуле мовай палітычнага дыскурсу ў Беларусі ёсць пераважна расейская. Разам з тым усё больш прыкметным робіцца так званы двухмоўны дыскурс.

6 Контрдыскурсія – апазіцыйны дыскурс, дыскурс, які крытыкуе ўладу.

Яго асаблівасці можна назіраць на прыкладзе двухмоўных (беларуска-расейскіх і расейска-беларускіх) газет. Двухмоўе – гэта адметная, калі не ўнікальная, рыса беларускіх медыяў. Адна частка экспертаў кваліфікуе гэта як недахоп. Гэтак, на думку А. Дзірвановіча, двухмоўе прычыняецца «да прыніжэння прафесійна-выдавецкага ўзроўню перыёдыкі... Уласна беларускамоўныя і расейскамоўныя выданні выглядаюць значна больш цэласнымі».[7] Іншыя – і аўтарка артыкула належыць да іхнага ліку – мяркуюць, што двухмоўе вынікае з натуральнай блізкасці моў і не можа служыць праявай дэмакратычнасці саміх медыяў. На практыцы рэальнае двухмоўе пашырае кола спажыўцоў асобных медыяў і шмат у чым спрыяе аб'яднанню вакол таго ці іншага перыядычнага выдання чытачоў розных ідэалагічных кірункаў.

Аднак само па сабе двухмоўе асобных выданняў яшчэ не развязвае праблемы падзелу дыскурсаў на расейскі і беларускі. Вядомая блізкасць расейскай і беларускай моў робіць магчымым пераход з адной на адну нават у межах адных і тых самых тэкстаў. Такі прыём выкарыстоўваецца не толькі каб надаць тэксту большую выразнасць, але і каб вызначыць палітычную пазіцыю аўтара. Паказальнае ў гэтым сэнсе ўжыванне слоў «отечество» і «бацькаўшчына», якія, з'яўляючыся сінонімамі, успрымаюцца ў межах беларускага палітычнага дыскурсу як апануючыя паняткі. Слова «отечество» часта ляжыць у адным сэнсавым шэрагу з паняткамі «СССР», «інтэграцыя»,

7 Белорусская деловая газета. 1998. № 34.

«славянская ідэя». Наадварот, слова «бацькаўшчына» мае наўпроставае дачыненне да абазначэння беларускага патрыятызму і апазіцыйнасці. У звязку з гэтым робіцца магчымым іх ужыванне (з захаваннем напісання) у іранічнай танальнасці ў ідэалагічна адрозных паводле зместу тэкстах.

Намі таксама была зроблена спроба вызначыць тыя вобразы палітыкі, якія прапануюць чытачу дзяржаўныя і недзяржаўныя медыі. Крыніцавую базу даследавання ўтварылі матэрыялы беларускай прэсы за 1997–1998 гг. (кантэнт-аналіз, дыскурс-аналіз і рытарычны аналіз).[8]

Атрыманыя вынікі пададзены ў табліцы 1 (у % ад матэрыялаў, прысвечаных палітычнай тэматыцы).

8 У выбарку трапілі матэрыялы такіх газет, як «Советская Белоруссия», «Народная газета», «Рэспубліка», «Звязда», «Народная воля», «Свабода» («Навіны»), «Белорусская деловая газета» за чэрвень 1997 года і травень 1998 года (ўсяго 50 нумароў).

Табліца 1

| Тэмы | Усяго ў сярэднім | Дзяржаўная прэса | Недзяржаўная прэса |
|---|---|---|---|
| афіцыйныя дакументы | 6,0 | 9,7 | 2,3 |
| афіцыйная хроніка | 9,4 | 14,7 | 4,2 |
| аналіз унутрыпалітычнай сітуацыі | 17,8 | 18,3 | 17,6 |
| аналіз вонкавапалітычнай сітуацыі | 10,5 | 8,8 | 12,2 |
| інтэграцыя ў рамках СНД | 11,5 | 14,3 | 8,9 |
| заканадаўства | 8,9 | 5,3 | 12,4 |
| правы чалавека | 12,5 | 12,6 | 12,3 |
| апазіцыя | 6,7 | 4,6 | 8,7 |
| палітычныя партыі і грамадскія рухі | 7,1 | 4,8 | 9,3 |
| медыі | 6,1 | 4,6 | 7,5 |
| выбары | 3,5 | 2,3 | 4,6 |

Другая калонка табліцы (сярэднія лічбы) пададзена намі толькі для таго, каб паказаць яе прынцыповую неінфарматыўнасць. Падаваць сярэднія лічбы адносна тэматычных прыярытэтаў медыяў увогуле – гэта тое ж самае, што рахаваць сярэднюю тэмпературу па шпіталі. Вобразы палітыкі ў дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсе досыць розняцца адзін ад аднаго. Гэтак, для афіцыйнай прэсы змест палітыкі складае, найперш, дзейнасць дзяржавы: амаль 66 % матэрыялаў расказваюць пра гэта.

Гэта разам узятыя афіцыйныя дакументы, афіцыйная хроніка, аглядныя матэрыялы па ўнутранай і вонкавай палітыцы, матэрыялы па інтэграцыі. Палітыка вачыма дзяржаўнай прэсы практычна беспартыйная і пазбаўленая апазіцыі. Разам з тым у ёй рэдка робяць розніцу паміж апазіцыяй і палітычнымі партыямі (ўсе партыі – гэта апазіцыя, а апазіцыянеры – гэта тыя, хто стварае палітычныя партыі). У тых нешматлікіх матэрыялах, якія прысвечаны такім тэмам, дамінуе агульная скептычная танальнасць. Для іх характэрны выказванні: «канапавыя партыі», «карлікавыя партыі», «кучка амбіцыйных палітыкаў», «палітыкі, якія нікога не прадстаўляюць за выняткам сябе» і інш. Такім чынам, дзяржаўнай прэсай ствараецца ўяўленне аб тым, што адсутнасць недзяржаўнага сектара палітыкі – гэта палітычная норма, а стабільнасць – гэта адсутнасць палітычнага плюралізму. Заўважым, што такі падыход на тле недастатковай колькасці інфармацыі аб палітычных партыях увогуле яшчэ больш узмацняе «эфект адсутнасці» апошніх у рэальным палітычным жыцці Беларусі.

Недзяржаўная прэса ў большай ступені паказвае палітыку як сферу плюралістычную, хоць і ў ёй дамінуюць матэрыялы, якія каментуюць і аналізуюць дзейнасць афіцыйных улад. Разам з тым у ёй больш ці менш раўнамерна прадстаўлены матэрыялы аб дзейнасці партый, апазіцыі, медыяў.

Гаворачы пра вонкавую палітыку, і дзяржаўная, і недзяржаўная прэса вялікую ўвагу надаюць праблеме зносін Беларусі і СНД, пераважна Беларусі і Расеі. Разам з тым змест і танальнасць

матэрыялаў прынцыпова розняцца. Гэтак, у першым выпадку ключавымі выступаюць такія словы і словазлучэнні, як «агульная гісторыя», «агульныя лёсы», «паэтапнае ўз'яднанне», «гістарычная справядлівасць», «свята», «братнія народы», «узаемная выгада», «парытэт», «Беларусь не будзе цяжарам» і інш. У другім – «занепакоенасць», «пагроза суверэнітэту», «шкода нацыянальным інтарэсам», «сумнеўная выгада», «Беларусь – заложніца (у зносінах паміж Расеяй і Захадам)» і інш.

Асобнага каментара вымагаюць і лічбы, якія сведчаць пра долю матэрыялаў, прысвечаных праблеме правоў чалавека (12,6 % у дзяржаўнай і 12,3 % у недзяржаўнай прэсе). Трэба заўважыць, што асноўную масу матэрыялаў, якія трапілі ў гэтую катэгорыю, у дзяржаўнай прэсе ўтварылі артыкулы, якія датычаць сацыяльна-эканамічных правоў грамадзян (права на жытло, на працу, на сацыяльнае забеспячэнне, на ахову здароўя). Разам з тым большасць з іх (72 %) прысвечаны канкрэтным калізіям у жыцці тых ці іншых людзей. У гэтым сэнсе найбольш папулярны сюжэт, выходны пункт якога – парушэнні (бяздушнасць) у дзеяннях мясцовых улад, якія жорстка крытыкуюцца газетай. Недзяржаўная прэса ў большасці сваёй робіць акцэнт на палітычныя правы, прысвячаючы свае матэрыялы такім тэмам (ад часцейшых да радзейшых), як: лёс палітзняволеных, неправамоцныя дзеянні міліцыі і праваахоўных органаў у дачыненні да тых ці іншых грамадзян, пераслед прадстаўнікоў апазіцыі і палітычных партый.

* * *

Дзяржаўныя і недзяржаўныя медыі прапануюць не толькі розныя вобразы палітыкі, але і прынцыпова розныя тлумачальныя схемы таго, што адбываецца. Тлумачальная схема – гэта своеасаблівы фрэйм (рамка), якая так ці інакш арганізуе адбіццё рэчаіснасці ў свядомасці чалавека. Яна мае выгляд стандартных, часам шаблонных тлумачэнняў таго, што адбываецца, скрозь прызму якіх чалавек успрымае новую інфармацыю і новыя веды пра аб'ект (у нашым выпадку – пра палітычную рэальнасць).

Аналізуючы матэрыялы ўжо згаданых газет за 1996–1999 гады,[9] мы паспрабавалі вылучыць ключавыя лексемы, якія сустракаюцца падчас аналізу шэрагу важных праблем. Да ліку апошніх былі аднесены: праблема распаду СССР, праблема інтэграцыі з Расеяй, праблема рэфармавання, праблема пашырэння НАТО. На наш погляд, менавіта яны служаць свайго роду раздзяляльнымі лініямі ў беларускім грамадстве, бо фіксуюць стаўленне да мінуўшчыны (СССР), бачанне будучыні (рэфармаванне і інтэграцыя) і вонкавапалітычныя арыентацыі. Да гэтага спіса мы таксама дадалі дзве цалкам сітуацыйныя праблемы, якія ўзніклі апошнім часам: дэфіцыт харчовых тавараў і стаўленне да праблемы РНЕ і сучаснага фашызму ўвогуле, якія выступаюць ілюстрацыямі для пацвярджэння найболш агульных тэзісаў. Вынікі аналізу пададзены ў табліцы 2.

9 Акрамя ўжо згаданых, у выбарку трапілі па пяць нумароў кожнай газеты за студзень–сакавік 1999 года.

Табліца 2

| Праблема | Дзяржаўная прэса | Недзяржаўная прэса |
|---|---|---|
| Распад СССР | «распад СССР – гэта вынік здрад, змовы былых камуністычных лідараў», «распад СССР – адна з самых драматычных старонак XX ст.», «распад СССР ёсць вынікам перамогі Захаду ў халоднай вайне» | «распад СССР – натуральны вынік крызісу сацыялістычнай сістэмы, доказ банкруцтва дзяржаўнай эканомікі», «распад СССР – драматычная, але цалкам заканамерная з’ява», «СССР прайграў у канкурэнтным змаганні з Захадам» |
| Інтэграцыя з Расеяй | «інтэграцыя з Расеяй – аднаўленне гістарычнай справядлівасці», «у аснове інтэграцыі ляжыць гістарычнае братэрства славянскіх народаў», «супрацiўнікі інтэграцыі ёсць у кіраўніцтве Расеі, хаця народы імкнуцца да яднання», «ад яднання эканомік выйграюць абедзве краіны, бо на Захадзе мы нікому не патрэбны» | «немагчыма рэальная інтэграцыя розных эканамічных сістэм», «інтэграцыйная рыторыка не суправаджаецца рэальнымі крокамі для збліжэння», «у Расеі ёсць у Беларусі свае інтарэсы, дзеля якіх і падтрымліваецца ідэя інтэграцыі», «інтэграцыйныя праекты павінны быць пралічаны і ўзважаны на шалях узаемнай выгады» |

| | | |
|---|---|---|
| Рэформы | «Беларусь ідзе сваім адмысловым шляхам рэфармавання», «трэба захаваць усё найлепшае, што было падчас сацыялізму», «Беларусь пазбегла памылак сваіх суседзяў і праводзіць паступовыя, асцярожныя змены» | «у Беларусі рэформы практычна не праводзяцца», «у Беларусі адбываецца кансервацыя савецкай сістэмы», «эканамічны крызіс ёсць вынікам таго, што рэформы не ажыццёўлены», «гістарычны досвед даказаў пераканаўчасць рыначнай мадэлі гаспадарання, таму патрэбны рыначныя рэформы» |
| Пашырэнне НАТО | «пашырэнне НАТО – гэта рэальная пагроза для Беларусі», «пашырэнне НАТО суправаджаецца ўкараненнем заходніх стандартаў і каштоўнасцей», «НАТО – рэальны вораг Беларусі і Расеі», «Беларусь – фарпост у супрацьстаянні НАТО» | «пашырэнне НАТО – гэта вынік распаду СССР», «у гэтым працэсе Беларусь можа стаць закладніцай у зносінах паміж Усходам і Захадам», «імкненне былых сацыялістычных краін у НАТО цалкам натуральнае, бо ў гэтым яны бачаць гарантыі супраць аднаўлення савецкага рэжыму» |

| | | |
|---|---|---|
| Дэфіцыт харчавання | «дэфіцыт харчавання – гэта вынік ажыятажнага попыту (купляць сталі значна больш, чым звычайна)», «частка харчавання вывозіцца ў Расею, бо цэны на прадукты харчавання там вышэйшыя», «дэфіцыт харчавання ёсць вынікам нядбайнасці і недысцыплінаванасці некаторых гаспадарнікаў», «дэфіцыт харчавання звязаны з недахопамі ў сістэме цэнаўтварэння» | «дэфіцыт харчавання – гэта наўпроставы вынік функцыянавання сацыялістычнай сістэмы ў сельскай гаспадарцы», «прадукты выгадней вывозіць за межы краіны», «дэфіцыт узнік як вынік агульнага заняпаду ў эканоміцы і асабліва ў сельскай гаспадарцы», «дырэктыўныя метады больш не эфектыўныя» |
| РНА і сучасны фашызм | «узнікненне групы, роднаснай РНЕ, – гэта вынік русафобскай палітыкі часткі пануючай эліты», «дзеянні падлеткаў з РНЕ – гэта звычайнае хуліганства, якому надаецца надта вялікае значэнне», «дзеянні прадстаўнікоў РНЕ вартыя ганьбавання, але тады неабходна караць і іншыя нацыяналістычныя сілы, напрыклад БНФ» | «дзеянні малойчыкаў РНЕ – гэта наўпроставая праява фашызму, гэта сапраўдная карычневая небяспека», «дзейнасць прадстаўнікоў РНЕ і іншых арыентаваных на фашызм груповак адбываецца праз маўклівае патуранне ўлад» |

Панаванне ў палітычным дыскурсе медыяў жорсткіх тлумачальных схем надае палітычнай камунікацыі своеасаблівы рытуальны характар. Гаворка ідзе аб камунікацыі, у межах якой суб'ект аперуе пэўным наборам клішэ. Ён выказвае шэраг фраз і аргументаў, якія робяць яго пазнавальным і сярод прыхільнікаў, і сярод супраціўнікаў. У гэтых умовах сэнс тэкстаў адыходзіць на другі план, на першым жа – сам факт ягонага з'яўлення ў газеце, якая належыць да таго ці іншага палітычнага лагера. Знаходжанне ў межах рытуалу ў пэўным сэнсе адпавядае прысязе на вернасць. І рэч тут не столькі ў наяўнасці афіцыйнай цэнзуры, колькі ў наяўнасці «ўнутранага цэнзара» ў рэдактараў і аўтараў, якія вызначаюць, што можа, а што не можа быць надрукавана, напрыклад, у «Советской Белоруссии» або «Навінах».

У межах рытуальнай камунікацыі немагчымая прадуктыўная палеміка, бо ў ёй завочнаму апаненту падаюцца не столькі канкрэтныя аргументы, колькі моўныя клішэ, якія сталі апазнавальнымі знакамі. Возьмем, напрыклад, адзін з цэнтральных паняткаў сучаснага палітычнага дыскурсу – «народ». Для яго вызначэння ў дзяржаўнай прэсе характэрныя наступныя звароты: «няхай народ разважыць», «упершыню за ўсю гісторыю беларускі народ мае магчымасць сам вырашаць, якой павінна быць улада ў нашай дзяржаве», «трэба даць народу выказаць сваё меркаванне», «народ зможа вызначыць, чыя праўда, а чыя віна», «народ – гэта звычайныя людзі», «беларускі народ наказаў кіраўніку дзяржавы», «дэмакратыя – гэта перадусім волевыяўленне народа, і найвышэйшая яе праява – усенародны сход і рэферэндум».

У недзяржаўных медыях панятак «народ» ужываецца ў іншай танальнасці: «народ – людзі, якія не разбіраюцца ў палітычных пытаннях і ўтвараюць большасць у нашым грамадстве», «паслухмяны народ», «ашуканы народ», «шматпакутны народ», «людзі, якія не маюць уяўлення аб палітыцы і механізмах функцыянавання палітычнай сістэмы», «большасць насельніцтва гатовыя падтрымліваць толькі прывабную фігуру правадыра», «не грамадзяне, а падданыя», «народнасць – галоўны палітычны трук улады», «народу не патрэбны палітычныя правадыры, яму патрэбны дэмакратычныя інстытуты».

І ў адным, і ў другім выпадку гаворка ідзе не пра змястоўны аналіз, а пра свайго роду лексемы-сімвалы, з якімі цяжка спрацоўваць на рацыянальным узроўні.

Заўважым таксама, што тлумачальныя схемы дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсы выстройваюцца ў адзіны лагічны ланцужок. У першым выпадку мы маем справу з больш ці менш паслядоўна выкладзенай левай ідэяй у яе постсацыялістычным варыянце. Гэта не чысты сацыялізм або камунізм з сакралізацыяй Маркса–Леніна, ідэяй дыктатуры пралетарыяту і класавага змагання – гэта злучэнне настальгіі аб сацыялістычных практыках 70-х, імкненне да дзяржаўнай эканомікі, апалогія дысцыпліны і антызаходніцтва.

У другім выпадку гаворка можа ісці аб постсавецкім лібералізме, у якім мікшуюцца каштоўнасці дэмакратыі, правы чалавека, заклікі да рэфармавання і асцярожная арыентацыя

на Захад. Дыскурс недзяржаўнай прэсы адрозніваецца яшчэ і тым, што яна не прапануе нейкага адзінага праекта рэфармавання, пераважна абмяжоўваючыся крытыкай афіцыйнага курсу. Гэта цалкам зразумела. Недзяржаўная прэса (і, адпаведна, яе чытачы) сёння бадай ці не самая моцная ментальная апазіцыя існаму рэжыму. Таму яна не толькі і не столькі адлюстроўвае і праецыюе сітуацыю ў краіне, колькі крытыкуе і дэманструе іншыя ўзоры сацыяльных практык. Такім чынам, недзяржаўная прэса бярэ на сябе не проста функцыю, але, не пабаімся гэтага слова, пэўную палітычную місію, важнасць якой цяжка пераацаніць. Яе маральны аўтарытэт (а ступень даверу да недзяржаўнай прэсы большая за ступень даверу да апазіцыйных партый) можа адыграць істотную ролю і ў прасоўванні тых або іншых праектаў несацыялістычнага будучага Беларусі. Апошняе, заўважым, па-ранейшаму застаецца вельмі цяжкай для беларускага грамадства задачай.

Гаворачы аб розніцы ў вобразах палітыкі і тлумачальных схемах, якія прапануюцца дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсай, мы не павінны забываць, што гаворка ідзе не аб унутранай кухні саміх газет, а аб іх уздзеянні на свае аўдыторыі. Гэтыя вобразы тыражуюцца і замацоўваюцца ў свядомасці чытачоў, замыкаючы апошніх у іхных колах кантактаў. Менавіта таму чытачы адных газет ніяк не могуць зразумець чытачоў іншых газет, а іхныя ўзаемныя сутыкненні часцей нагадваюць размову сляпога з глухім.

Канстатацыя такога расколу ідэя не новая. Практычна ўсе праведзеныя ў краіне сацыялагічныя даследаванні пацвярджаюць гэта зноў і зноў. Аднак дваенне дыскурсаў сведчыць аб глыбіні і кансервацыі гэтага расколу. Апошняе азначае, што ні змена ўлады, ні рэалізацыя той ці іншай рэфарматарскай мадэлі не здольныя будуць хутка і бязбольна яго пераадолець. На гэтым тле сумную іронію могуць выклікаць пошукі «цудадзейнай» нацыянальнай ідэі, здольнай аб'яднаць нацыю. Відаць, сёння гаворка павінна ісці не пра алхімічныя пошукі залатой формулы згоды, а пра паступовую, удумлівую, калі хочаце, чорную работу над высвятленнем сэнсу слоў, рацыянальным пошукам разумення і тым самым аднаўленнем тканіны агульнага дыскурсу.

Віктар Чарноў

# Эканамічны падмурак беларускага неасавецкага аўтарытарызму (2008-2011)



Анатацыя

*У гэтым артыкуле сабраны аналітычныя нарысы Віктара Чарнова аб эканамічнай дынаміцы беларускага рэжыму, які ён кваліфікаваў як неасавецкі аўтарытарызм. Асноўныя акцэнты робяцца на аналізе працэсаў лібералізацыі беларускай эканомікі і пазнейшага адкату ад гэтай палітыкі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года. Заўважныя эфекты такой палітыкі, бадай, не адбіліся на некаторых міжнародных рэйтынгах Беларусі і не прывялі да якіх-небудзь відавочных унутраных палітычных і эканамічных зменаў, а наадварот, падштурхнулі Беларусь да яшчэ большага збліжэння з Расеяй. Гэта прывяло ў 2011 г. да продажу «Белтрансгазу», атрымання жаданых тарыфаў на прыродны газ і новага вітка крэдытавання беларускай эканамічнай мадэлі. Аўтар аналізуе кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя наступствы гэтай палітыкі з гледзішча ўмацавання беларускай мадэлі неасавецкага аўтарытарызму.*

Сумнеўныя эфекты эканамічнай лібералізацыі ў Беларусі 2008-2009 гг.

У лістападзе 2009 г. беларускай эканамічнай лібералізацыі споўнілася два гады. Сярод незалежных беларускіх аналітыкаў меркаванні аб незваротнасці беларускіх рэформаў падзяліліся. Шмат хто лічыць рэформы чыста дэкларатыўнымі і прадказвае, што з першымі прыкметамі заканчэння сусветнага эканамічнага крызісу ўсё вернецца да ранейшага стану. На думку шэрагу аналітыкаў, гэта тлумачыцца адсутнасцю рэальнага запыту

на рэформы з боку грамадства. Вядома, рынкавая рыторыка адзінкавых прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партый і незалежных эканамістаў не бярэцца да ўвагі: яна заўсёды існавала як своеасаблівы інфармацыйны фон, які ніяк не ўплывае на дзеянні пануючага класа. На наш погляд, эканамічныя рэформы шмат у якіх аспектах пачынаюць праходзіць пункт незвароту; адзінае пытанне, што ўзнікае, – ці гатовае беларускае кіраўніцтва ісці далей у сваёй палітыцы эканамічнай лібералізацыі? Інакш кажучы, якія ўнутраныя межы гэтай палітыкі? Насамрэч эканамічны крызіс 2008 г. ў Беларусі ў значнай ступені папярэднічаў глабальнаму крызісу. Беларускі крызіс вынікаў з самога характару развіцця беларускай эканомікі – глабальны крызіс толькі пагоршыў унутраныя праблемы, назапашаныя апошнімі гадамі.

З іншага боку, досвед запозненай мадэрнізацыі, гісторыя якой адсочваецца з сярэдзіны XIX ст. сцвярджае незваротнасць беларускіх рэформаў. Неліберальныя рэжымы часта загадваюць праводзіць ліберальныя рэформы не ў выніку ціску з боку грамадства (знізу ўверх), а праз вонкавы ціск, напрыклад, ваенную пагрозу. Зрэшты, сёння пытанне ваеннай пагрозы для беларускай пануючай эліты не стаіць. Аднак ва ўмовах адкрытай эканомікі Беларусь сутыкнулася з жорсткай канкурэнцыяй звонку, асабліва адносна працоўных рэсурсаў. Невыпадкова з пачатку 2007 г. краіна ўдзельнічае ў гонцы заробкаў. З гэтай нагоды лічым дарэчным працытаваць прэзідэнта Лукашэнку: «Нізкая зарплата

здольная разбурыць нават найвялікшую дзяржаву»[1]. Глабальны крызіс гонку зарплат на пэўны час прыпыніў.

Але якія б ні былі прычыны эканамічнага росту ў апошнія гады, намаганні з мэтай рэфармаваць беларускую эканоміку даюць плён. У кастрычніку Сусветны банк апублікаваў рэйтынг «Вядзенне бізнесу – 2010»[2], у якім Беларусь паднялася на 24 пазіцыі – з 82-га на 58-е месца з 183 краін (у 2007 г. яна займала 115-е месца). Беларусь таксама ўвайшла ў пяцёрку краін свету з найбольшай дынамікай абнаўлення дзелавога клімату.

Эксперты Сусветнага банка адзначылі паляпшэнне ва ўсіх шасці аспектах, што ўлічваюцца ў рэйтынгу Сусветнага банка, а менавіта ў працэдурах, звязаных з рэгістрацыяй кампаній, наймannем працоўнай сілы, атрыманнем дазволаў на будоўлю, рэгістрацыяй уласнасці, падаткаабкладаннем і міжнародным гандлем. Аднак асноўны ўнёсак зроблены толькі адным аспектам: менавіта спрашчэнне рэгістрацыі кампаній дазволіла Беларусі выйсці на 7-е месца, пакінуўшы ззаду амаль усе

1 З выступу прэзідэнта Лукашэнкі па дзяржаўным тэлебачанні 18 траўня 2001 года.

2 Даследаванне датавана 2010 годам, бо менавіта налета кампаніі ў розных краінах будуць мець справу з апісаным у даследаванні рэгуляваннем вядзення бізнесу.

еўрапейскія краіны[3]. Згодна з разлікамі экспертаў, радыкальнае спрашчэнне гэтай працэдуры дазволіць эканамічным агентам эканоміць 21.5 млн. долараў за год. Што тычыцца чынніку, што вызначае прыцёк капіталу – абароненасць інвестараў – то замест чаканага прагрэсу мы бачым невялікі рэгрэс: летась Беларусь заняла 109-е месца (дагэтуль яна была на 105-м)[4]. Пра тое ж сведчаць звесткі Белстату: за дзевяць месяцаў 2009 г. доля замежных інвестыцый у беларускую эканоміку (акрамя крэдытаў замежных банкаў) склала 1.5% ад агульнага аб'ёму інвестыцый у асноўны капітал (за 2008 г. гэты паказчык быў 1.4%). Дзясяткі інвестыцыйных форумаў, праведзеных у апошнія гады ўнутры краіны і па-за яе межамі, не далі ніякіх заўважных вынікаў. Ва ўмовах, калі інвестарам не гарантуецца захаванне актываў, права ўласнасці і магчымасці распараджацца прыбыткам на сваю думку, немагчыма чакаць нечага іншага.

Увогуле, як адзначаюць незалежныя эксперты, у нашай краіне прасцей зарэгістраваць кампанію, чым дбаць пра яе, бо прагрэсу ў ключавых чынніках справавога клімату для ўжо існых кампаній не відаць. А калі актыўны прадпрымальнік не

3 Эксперты Сусветнага банка адзначаюць, што працэс адкрыцця бізнесу ў Беларусі быў значна спрошчаны: аб'яднаны чатыры розныя этапы, адменена патрабаванне аб натарыяльным засведчанні і мінімальнай суме статутных фондаў. Скараціўся час, неабходны для адкрыцця ўласнага бізнесу: сёння яно вымагае 5-ці крокаў за 6 дзён (у Еўропе і Цэнтральнай Азіі гэта ў сярэднім 6.7 крокаў і 17.4 дня).

4 Эксперты Сусветнага банка ацанілі індэкс абароненасці інвестараў на 4.7 бала па 10-бальнай шкале.

стане крыніцай пазітыўнай інфармацыі аб дзелавым клімаце, наіўна чакаць значнага росту замежных інвестыцый. Гэтаксама неразумна чакаць развіцця прадпрымальніцкага патэнцыялу беларускага насельніцтва.

Як афіцыйныя, так і незалежныя эксперты зважаюць на апошнія пазіцыі Беларусі адносна якасці падаткаабкладання (ўжо чатыры гады запар). Уключэнне ў рэйтынг новых краін не змяняе сітуацыі. Паводле падлікаў экспертаў Сусветнага банка, штогод прадпрымальнікі змушаны выдаткоўваць 900 гадзін (летась – 1188 гадзін), каб заплаціць 107 (летась – 112) падатковых узносаў. Падатковы цяжар застаецца высокі. Кампаніі страчваюць 20.1% прыбытку, што ўдвая больш, чым у краінах Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Агулам падаткі і зарплаты забіраюць 40% прыбытку кампаній.

Нягледзячы на відавочны прагрэс у стварэнні спрыяльных умоў для вядзення бізнесу, самі бізнесмены стрымана рэагуюць на дасягнутыя вынікі. Звесткі сацыялагічнага апытання, праведзенага ўлетку 2009 г. недзяржаўнай сацыялагічнай лабараторыяй «НовАК» сярод кіраўнікоў 516 малых і сярэдніх прадпрыемстваў і 112 індывідуальных прадпрымальнікаў ва ўсіх рэгіёнах краіны[5], паказваюць, што ў пытанні аб якасці змен умоў вядзення бізнесу ў параўнанні з 2007 г. меркаванні падзяліліся 50/50. 32% рэспандэнтаў адзначылі, што ўмовы палепшыліся, і столькі ж – што пагоршыліся; 29% рэспандэнтаў не заўважылі змен, 7% не

5 http://naviny.by/rubrics/.../ic_news_113_319006/

змаглі адказаць. Што тычыцца толькі ІП, то амаль палова рэспандэнтаў (47%) адзначылі пагаршэнне ўмоў вядзення бізнесу. Адрозненні паміж дзвюма групамі (МСП і ІП) таксама відаць у меркаваннях аб канкрэтных аспектах бізнес-асяроддзя: прахаджэнні адміністрацыйных працэдур, стаўленні дзяржаўных органаў і чыноўнікаў да прадпрымальніцкай дзейнасці, магчымасці арэндаваць новыя памяшканні. А вось адносна пытанняў, якія тычацца змен умоў крэдытавання і працэдур кантролю фінансава-гаспадарчай дзейнасці, адрозненні ў меркаваннях паміж гэтымі дзвюма групамі рэспандэнтаў якраз няма.

## Крызіс лібералізацыі

Адна з асаблівасцяў беларускага кірунку эканамічнага развіцця – гэта нестандартнае размеркаванне рэсурсаў. Важным механізмам пазапланавага размеркавання рэсурсаў з'яўляецца палітыка крэдытнага фінансавання, якая ажыццяўляецца праз банкі, якія кантралююцца дзяржавай. Дзяржаўныя банкі функцыянуюць не як прыватны сектар, а як дзяржаўная каса дапамогі вытворчаму сектару. У той час калі ва ўсім свеце ўзровень крэдытнага фінансавання падае праз узрослую рызыку, у Беларусі ён імкліва расце. На дзень 1 жніўня 2009 г. непагашаны крэдытны капітал сягнуў 55.6 млрд. рублёў, што на 47.8% больш, чым у пачатку жніўня 2008 г. Адначасова сума непагашаных або пралангаваных крэдытных выплат вырасла ў 2.9 разы. На 1 ліпеня 2009 г. аб'ём праблемных крэдытаў банкаў краіны сягнуў 1.5 трлн. рублёў (вырас у 1.8 разы).

Які вынік гэткай фінансавай шчодрасці? За 9 месяцаў ВУП краіны знізіўся на 0.3%, прамысловая вытворчасць – на 4.5%, рух тавараў – на 12.5%; экспарт за 8 месяцаў знізіўся на 44.5%. Відавочна, што выдадзеныя крэдыты выкарыстоўваюцца не для мадэрнізацыі і рэструктурызацыі вытворчасці, а для падтрымання на плаве патэнцыйных банкрутаў. Тым часам эканамічныя праблемы пагаршаюцца. Пацвярджэннем таму – блакаванне тавараў на складах на суму 6.3 млрд. і незавершаная праграма па нерухомасці (15.3 тысячы рублёў на 1 верасня 2009 г.), падзенне выручкі (на 1.8%) і павелічэнне выдаткаў на продаж (на 3% у студзені-чэрвені 2009 г.). У выніку мы бачым імклівае зніжэнне цэнавой канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі нават у нішы тавараў, вытворчасць якіх вымагае базавых тэхналогій. За апошнія 7 месяцаў усе беларускія прадпрыемствы атрымалі супольны прыбытак ад продажу ў памеры 9.5 млрд. рублёў. Гэтых грошай не хопіць нават для пагашэння пазык, не кажучы аб аднаўленні вытворчасці без дапамогі замежных інвестараў. Яшчэ адзін доказ пагаршэння становішча прадпрыемстваў краіны – гэта раптоўнае павелічэнне аб'ёму страт мёртвага грузу. На дзень 1 жніўня 2009 г. гэтая сума сягнула 1.1 млрд. рублёў, што ў 4.4 разы больш, чым у жніўні 2008 г. Не дзіва, што памер пенсій не павялічваўся з жніўня 2008 г., што знізіла іх рэальны памер (з улікам карэктавання індэксаў спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) на 9.7% у верасні 2009 г. ў параўнанні з вераснем 2008 г. Між тым, менавіта пенсіянеры служаць падмуркам абрання прэзідэнта Лукашэнкі. Пачалося і зніжэнне рэальнай заработнай платы: у жніўні 2009 г. яна ўпала на 1.3% у параўнанні з жніўнем 2008 г.

Ціск адмоўных эканамічных паказчыкаў паўплываў на заканадаўчыя ініцыятывы з боку ўрада. У верасні Прэзідэнт Беларусі падпісаў Указ № 477, які дае ІП значныя прэферэнцыі ў вытворчасці экспартнай прадукцыі. Цяпер яны павінны плаціць толькі адзін гандлёвы збор у памеры 35 тысяч рублёў у месяц (менш за 9 еўра). Прадпрымальнікам нават дазволена не класці заробленай за мяжой валюты на свае банкаўскія рахункі.

На дзень 1 ліпеня на складах застаюцца тавары прамысловых прадпрыемстваў на суму больш за 7.3 трлн. рублёў. Доля фондаў гатовай прадукцыі ў агульнай сярэднямесячнай вытворчай магутнасці ў першым паўгоддзі 2009 г. складае 94.6% (у першым паўгоддзі 2008 г. – 49.9%). Увесь гэты аб'ём дадатковай прадукцыі, што захоўваецца на складах, відавочна, быў уключаны ў разлік ВУП.

Заклік прэзідэнта рэарганізаваць працу Савета міністраў так, каб ён стаў Міністэрствам гандлю (каб усе міністэрствы займаліся толькі гандлем), не даў бачных вынікаў. Бо, па-першае, прадпрымальніцкая дзейнасць разглядаецца не як лакаматыў эканамічнага развіцця (гэтую ролю выконвае бюракратыя), а як «памочнік»; па-другое, мы зноў бачым няздольнасць бюракратыі не толькі прымаць самастойныя пастановы, але і чуць свайго лідара.

Цэнаўтварэнне ёсць адным з фарпостаў кірунку эканамічнага развіцця Беларусі. Змаганне паміж беларускімі прадпрымальнікамі і дзяржавай за права першых самастойна вызначаць цэны

на тавары ідзе з пачатку 90-х гадоў, і ў гэтым змаганні заўсёды перамагала дзяржава. 22 верасня Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Указ № 141, які прадугледжвае лібералізацыю палітыкі цэнаўтварэння на шырокі спектр тавараў штодзённага попыту. Указ таксама прадугледжвае свабоднае фармаванне цэн на тавары рознічнага гандлю, за выняткам пераліку з 50 пазіцый (у т. л. некаторых прадуктаў харчавання, лекаў і дзіцячых тавараў). Аднак гэтая пастанова тычыцца толькі гандлёвай надбаўкі, а Указ Прэзідэнта ад 1999 г. № 285 «Аб некаторых мерах па стабілізацыі цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь» не адменены. Такім чынам, вытворцы, як і раней, змушаны эканамічна абгрунтоўваць рост цэн на сваю прадукцыю і рабіць высокаінтэнсіўныя разлікі падчас фармавання цэн, замест таго каб вызначаць іх згодна рынкавай патрэбе.

Лібералізацыя цэн адна з рэкамендацый МВФ беларускім уладам у межах пагаднення stand-by, якое прадугледжвае выдзяленне Беларусі крэдытных рэсурсаў для падтрымання эканомікі. Аднак праяў працягу лібералізацыі цэн няшмат. У верасні 2008 г. міністр эканомікі Мікалай Зайчанка заявіў, што канчатковы пераход да свабоднага цэнаўтварэння будзе здзейснены, калі малыя і сярэднія прадпрыемствы «сягнуць крытычнай масы» і павялічаць свой уклад у ВУП на 40-45% (сёння гэты ўклад складае 8-10%).

У кастрычніку ў працэсе лібералізацыі была ўзгоднена сістэма дзяржаўнага кантролю. Згодна з Указам Прэзідэнта № 510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядальніцкай) дзейнасці ў

Рэспублiцы Беларусь», уведзена адзiная працэдура кантрольна-наглядальнiцкай дзейнасцi, якая грунтуецца на арыгiнальных падыходах. Упершыню ўведзены закрыты пералiк кантрольна-наглядальнiцкiх органаў i сферы iх кантролю (нагляду). Органы, не ўключаныя ў пералiк, не маюць права правяраць гаспадарчыя суб'екты.

Цяпер забаронена правяраць нядаўна створаныя суб'екты гаспадарання цягам двух гадоў з моманту iх дзяржаўнай рэгiстрацыi (двухгадовы маратoрый). Пазапланавы кантроль над гэтымi арганiзацыямi можа мець месца толькi ў выпадку вычарпальнага абгрунтавання прычын, пералiчаных ва ўказе. Правiла планавых аўдытаў, якiя ажыццяўляюцца перыядычна (не часцей за адзiн раз на год) незалежна ад добрасумленнасцi аўдытаванай асобы, замяняецца новым механiзмам планавання паводле ейнага аднясення да той цi iншай групы рызыкi.

Усе суб'екты гаспадарання ў зоне рызыкi класiфiкуюцца паводле крытэраў, якiя ўлiчваюць патэнцыяльную небяспеку заканадаўчых праваапарушэнняў у гэтай сферы дзейнасцi для дзяржавы i грамадства. Тыя крытэры вычарпальна прадстаўлены ва ўказе: напрыклад, гаспадарчыя суб'екты з высокай рызыкай будуць кантраляваццa не часцей за раз на тыдзень, з сярэдняй рызыкай – раз на тры гады, з нiзкай рызыкай – раз на пяць гадоў. Калi вынiкi кантролю не выявяць парушэнняў заканадаўства, то наступная праверка гаспадарчага суб'екта высокай рызыкi адбудзецца толькi праз два гады, сярэдняй рызыкi – толькi праз пяць гадоў.

Варта адзначыць, што будзе павялічана адказнасць службовых асоб кантрольных органаў за парушэнне працэдуры праверак, у тым ліку за правядзенне пазапланавага кантролю. Гэта тычыцца адміністрацыйнай і дысцыплінарнай адказнасці службовых асоб (аж да іхнага звальнення). За пазапланавы кантроль з карыслівых або іншых асабістых інтарэсаў, прычыненне шкоды падкантрольным суб'ектам (прычыненне значнай шкоды правам і законным інтарэсам правяраемых суб'ектаў або грамадскім ці дзяржаўным інтарэсам) службовыя асобы нясуць крымінальную адказнасць. Праверка, што ажыццяўляецца ў апісаным вышэй кантэксце, прызнаецца незаконнай. Наступствы Указа № 510 цяжка прадбачыць, але, найхутчэй, яны будуць адмоўныя. Эфектыўнасць беларускага кіравання эканамічным развіццём у значнай ступені вызначаецца кантролем. Гістарычны досвед паказвае, што з паслабленнем кантролю эканамічныя сістэмы, якія грунтуюцца на цэнтралізаваным пераразмеркаванні рэсурсаў, чакае дэградацыя. Наглядны прыклад гэтаму – перабудовачны эксперымент Гарбачова. Гаворка ідзе аб адсутнасці грамадзянскай супольнасці і незалежных медыяў, якія здольны выконваць важную частку функцый кантролю.

Канец палітыкі балансавання паміж Расеяй і Захадам (2010-2011 гг.)

На тле адкату ад палітыкі лібералізацыі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. беларускі рэжым працягвае эканамічнае і энэргетычнае збліжэнне з Расеяй. Пасля падпісання 25 лістапада 2011 г.

ў Маскве пакету расейска-беларускіх эканамічных дакументаў аб'ём золатавалютных рэзерваў Нацбанка павялічыўся на $2.74 млрд. Такому шпаркаму росту спрыяла паступленне сродкаў ад продажу за $2.5 млрд. акцый ААТ «Белтрансгаз». Пасля распаду СССР гэта першы стратэгічны поспех «Газпрому», які шмат гадоў імкнецца выкупіць газатранспартныя сістэмы еўрапейскіх краін. Увядзенне 8 лістапада 2011 г. у прамысловую эксплуатацыю першай чаргі газаправода «Паўночная плынь» не спрычыніцца да зніжэння аб'ёму прыроднага газу, які экспартуецца цераз Беларусь у Еўропу. Наадварот, у 2012 г. аб'ём транзіту плануюць павялічыць на 4% – з цяперашніх 42.8 да 44.5 млрд. куб. м. Варта прызнаць, што, цалкам выкупіўшы беларускі газавы транзіт, Расея фактычна займела «Заходнюю плынь». Яна каштавала ёй значна танней за «Паўночную плынь» і тым больш за «Паўднёвую плынь», будаўніцтва якой Расея ўсё ніяк не распачне.

Продаж ААТ «Белтрансгаз» адбыўся агулам паводле беларускага сцэнара, сутнасць якога Менск з самага пачатку бачыў у прывязванні дамовы куплі-продажы акцый ААТ «Белтрансгазу» да пагаднення аб цэнах і тарыфаўтварэнні, кантракта аб пастаўцы газу ў 2012–2015 гг. і кантракта аб транзіце газу ў 2012–2015 гг. Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч назваў гэтую ўгоду ўнікальнай: упершыню ў гісторыі Еўропы суверэнная дзяржава адмовілася ад газатранспартнай сістэмы на карысць свайго партнёра па Мытным саюзе.

У сваю чаргу, страты Беларусі не абмяжоўвацца адным правам кіраваць газавым вентылем. Беларускія ўлады заўсёды бачылі ў кантролі над «Белтрансгазам» адно з увасабленняў беларускай «нацыянальнай ідэі» (Беларусь як своеасаблівы «мост» паміж Усходам і Захадам) і гарантыю запатрабаванасці Беларусі ў сусветнай палітыцы, бо менавіта Менск кантраляваў салідную долю расейскага газавага транзіту ў Еўразвяз. І гэта было важкай падставай лічыцца з А. Лукашэнкам. Продаж «моста» азначае і дэвальвацыю панятку «Беларусь як цэнтр Еўропы», які не абыдзеш і не аб'едзеш.

Пасля продажу Расеі «Белтрансгаз», Лукашэнка, безумоўна, страціў важны інструмент ягонай палітыкі лавіявання паміж Расеяй і Захадам. Па-першае, «Белтрансгаз», акрамя ўласнай газатранспартнай сістэмы, выступаў аператарам беларускага часткі газаправода «Ямал-Еўропа». Такім чынам, Менск страціў магчымасць уплываць і на гэтую газавую артэрыю. Па-другое, Беларусь страціла магчымасць кіраваць запасамі прыроднага газу ў падземных газасховішчах. Гэтыя аб'екты, здольныя забяспечыць энергію ўсім беларускім спажыўцам не менш як цягам месяца з суцэльнай загрузкай, знаходзяцца цяпер на балансе «Белтрансгазу». Па-трэцяе, акрамя росту энергетычнай залежнасці ад Расеі, вырасла залежнасць пазыковая. Між тым, парог эканамічнай бяспекі Беларусь ужо пераступіла. Паводле звестак Міністэрства фінансаў, на 1 лістапада 2011 г. вонкавая дзяржаўная пазыка склала $12.01 млрд., павялічыўшыся з пачатку года на 24%. Фінансавыя аналітыкі разлічылі, што пасля атрымання крэдыту ЕўрАзЭС і расейскага крэдыту

на будоўлю АЭС знешняя дзяржаўная пазыка вырасце да $25 млрд. Такім чынам, Беларусь можа трапіць у шэраг краін, вонкавая запазычанасць якіх шпарка набліжаецца да аб'ёму ВУП. У 2010 г. беларускі ВУП склаў $53.4 млрд. – па сканчэнні 2011 г. незалежныя эканамісты прагназуюць яго падзенне ў доларавым вылічэнні да $33-35 млрд. з прычыны дзвюх дэвальвацый беларускага рубля[6].

Важным чыннікам у беларуска-расейскіх зносінах у 2011 г. стала выстаўленне Расеяй жорсткіх умоў новых крэдытаў. Цяпер яны выдаюцца або пад заклад прамысловых актываў, або з умовай стабілізацыі макраэканамічных паказчыкаў. Згодна з крэдытнай дамовай, паступленне другога траншу крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у памеры $440 млн. планавалася не пазней за 31 кастрычніка 2011 г. Аднак эксперты фонду дагэтуль ацэньваюць, у якой ступені ўлады Беларусі выконваюць умовы крэдытнага пагаднення з гледзішча рэалізацыі эканамічных рэформаў у краіне.

Нягледзячы на тое, што беларускія ўлады не выканалі праграмы стабілізацыі эканомікі (адзін з прыкладаў – захаванне высокіх тэмпаў эмісійнага крэдытавання нацыянальнай эканомікі), няма сумневаў, што другі транш крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у найбліжэйшы час усё ж у Беларусь паступіць. Гарантыяй гэтаму служыць агульны прыліў інтэграцыйных

6 Падкрэслім: гаворка вышэй ішла толькі пра вонкавую дзяржаўную пазыку. Валавая ж вонкавая пазыка Беларусі (якая ўключае ў сябе пазыку органаў дзяржаўнага кіравання, грашова-крэдытнага рэгулявання, банкаў і іншых сектараў эканомікі) ўжо на 1 ліпеня 2011 г. сягнула $33.1 млрд.

настрояў, пік якіх прыйшоўся на лістападаўскае падпісанне ў Крамлі прэзідэнтамі Беларусі, Казахстана і Расеі Дэкларацыі аб еўразійскай эканамічнай інтэграцыі. Сёння палітыка дыктуе свае ўмовы эканоміцы, і да заканчэння ў Расеі прэзідэнцкай выбарчай кампаніі (ў сакавіку 2012 г.) не варта чакаць з'яўлення палітычных суб'ектаў, зацікаўленых у змене status quo.

Разам з тым, можна ўпэўнена канстатаваць, што, пасля атрымання саліднай фінансавай падтрымкі Крамля, Лукашэнка ў значнай ступені страціў цікавасць да аднаўлення нармальных зносін з Захадам. Ягоная абыякавасць да гэтага толькі ўзмацнілася, калі стала ясна, што істотная фінансавая дапамога Беларусі з боку Захада сёння малаверагодная як з эканамічных, так і з палітычных прычын. Зусім невыпадкова неўзабаве пасля рэвізіі на нарадзе 10 лістапада кіраўніком дзяржавы планаў урада аб рэфармаванні эканомікі стала вядома, што прызначаны на пачатак снежня візіт у Менск місіі МВФ не адбудзецца. Фактычная адмова афіцыйнага Менска ад шчыльнай супрацы з МВФ на карысць фінансавай дапамогі з боку Расеі яшчэ раз пацвярджае: у палітыцы шматгадовага балансавання Лукашэнкі паміж Расеяй і Захадам наступіла не вызначаная па часе паўза, якая будзе доўжыцца да чарговага сур'ёзнага абвастрэння зносін Лукашэнкі з Пуціным, калі той вернецца ў прэзідэнцкае крэсла.

Якія б цяжкія ўмовы не выстаўлялі расейскія банкі, рэальныя крэдытныя дамовы заключаюцца Менскам усё ж такі не з МВФ, а менавіта з расейскімі фінансавымі суб'ектамі. Аднак выгада

ад супрацы з МВФ не абмяжоўваецца нізкімі адсоткавымі стаўкамі. МВФ дае крэдыты пад праграму рэформаў, і – што не менш важна – крэдытная супраца з МВФ дае інвестарам з цывілізаваных дзяржаў станоўчую інфармацыю. Што да Расеі, то ейная зацікаўленасць у структурных рэформах у Беларусі выклікае вялікія сумневы. Расея, якая ёсць па сутнасці сыравінным прыдаткам Еўропы і Кітая, сама мае патрэбу ў комплекснай мадэрнізацыі, аднак усе спробы пачаць рух у бок рэформаў блакуюцца сыравінным лобі.

### Тактычныя выгады ў абмен на стратэгічную дэградацыю

Новыя прэферэнцыі для Беларусі з боку Расеі прызначаны для таго, каб Лукашэнка не адчуў сябе «загнаным у кут». Гэтая тактыка мае плён. Адсюль, у прыватнасці, той энтузіязм, з якім ён вітаў перспектыву ўступлення Беларусі ў СГА пасля таго, як працэс уступлення завяршыла Расея.

Працэс інтэграцыі тым часам набірае абароты. 19 снежня прэзідэнты Расеі, Беларусі і Казахстану падпісалі ў Маскве новы пакет інтэграцыйных дакументаў. «Мы зараз рэальна стварылі першы наш наднацыянальны орган, які будзе займацца інтэграцыяй. Мы стварылі нашу Еўразійскую камісію, і гэта самы сур’ёзны крок у справе фармавання нашай Еўразійскай эканамічнай прасторы і пазней стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза»[7],– сказаў Прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў

7 http://naviny.by/pda/material/?type=news&id=383085

на цырымоніі падпісання дакумента. Яшчэ ў час прэзідэнцтва Ельцына Лукашэнка выношваў план стварэння наднацыянальных органаў у межах Саюзнай дзяржавы. Пасля адстаўкі Ельцына мінула 12 гадоў. З 1 студзеня 2012 г. першы наднацыянальны орган з стадыі дэ-юрэ пяройдзе ў стадыю дэ-факта, але наперакор першапачатковым планам гэта прывядзе не да пашырэння паўнамоцтваў Лукашэнкі, а да іх абмежавання.

Такім чынам, сумарны эфект для беларускай эканомікі ад дасягнутых з Расеяй дамоўленасцей аб пастаўках газу і нафты можа скласці ў 2012-2015 гг. $11.6 млрд. эканоміі (з разліку прагназаванай урадам эканоміі $2.9 млрд. за год). Менавіта такой (ці крыху меншай) можа быць цана, якую цягам чатырох гадоў Крэмль будзе змушаны плаціць за ўваходны квіток Беларусі ў свой глабальны праект – Еўразійскі эканамічны саюз. І гэта, можна сказаць, асноўны адносна станоўчы – прычым больш для рэжыму Лукашэнкі, чым для краіны – вынік перамоў аб газе і нафце, які, аднак, мае чыста тактычнае значэнне.

Стратэгічна ж інтэграцыйныя зніжкі і іншыя тактычныя выгады ад атрымання новай порцыі расейскіх датацый, гэтак неабходных для выжывання рэжыму Лукашэнкі, пагражаюць Беларусі каласальным пройгрышам. Яны ўзмацняюць яе самаізаляцыю ад Захаду, энергетычную і пазыковую залежнасць ад Расеі і на нявызначаны час (магчыма, на чатыры гады панавання цяперашняй улады) адсоўваюць рынкавыя рэформы ў Беларусі, падаўжаючы тым самым жыццё

«беларускай эканамічнай мадэлі развіцця» і кансервуючы працэсы самаарганізацыі ўнутры архаічнага беларускага грамадства. Досвед мінуўшчыны сведчыць аб тым, што савецкая і дасавецкая панавальныя эліты наважваліся на больш-менш сур'ёзныя рэформы толькі сутыкнуўшыся з пагрозай суцэльнай эканамічнай дэзарганізацыі. Беларускі неасавецкі аўтарытарызм наўрад ці выпадзе з гэтай заканамернасці, стаўшы на гэтым тле гістарычным выняткам. Таксама не выключана, што тактычныя выгады, атрыманыя ў абмен на згоду ўдзельнічаць у расейскіх інтэграцыйных ініцыятывах, могуць прывесці да стратэгічнай паразы і самога рэжыму Лукашэнкі.

Ірына Бугрова

# Ідэнтычнасць Беларусі: З досведу інтэрпрэтацыйнай паліталогіі☆

☆ Упершыню тэкст быў надрукаваны ў часопісе “Грамадзянская альтэрнатыва”, №1/1999 год. У дадзеным зборніку тэкст друкуецца з ласкавай згоды рэдактара “Грамадзянскай альтэрнатывы” В. Карбалевіча.



«Захад унікальны, але не ўніверсальны».
С. Хантынгтан

«Універсальнасць – гэта лакальнасць без сцэн».
М. Торга

Анатацыя

*Інстытуцыйныя традыцыі, а таксама каштоўнасці і кодэксы паводзінаў, якія перадаваліся праз пакаленні, часта маюць цэнтральнае значэнне ў працэсах трансфармацыі. На падставе гэтага тэзіса ў гэтым даследаванні разглядаецца, якія формы дзяржаўнасці існавалі на тэрыторыі Беларусі з часоў Вялікага Княства Літоўскага. Разам з тым, аналізуючы структуру гарадоў і канфесійную гісторыю, І. Бугрова спрабуе вызначыць, як цягам стагоддзяў фармаваліся найважнейшыя аспекты беларускай ментальнасці і якія змены яны зазнавалі. З гледзішча аўтаркі, развіццё беларускай ідэнтычнасці пераважна характарызуецца наступнымі асаблівасцямі: ідэнтыфікацыя найперш на мясцовым узроўні праз пануючы адасоблены лад жыцця ў вясковых згуртаваннях і неадэкватныя гарантыі дзяржаўнай бяспекі; уніканне канфліктаў як дамінуючае значэнне ў выніку шматлікіх войнаў і рэпрэсій, калектыўнага досведу фізічнага знішчэння; перавага юніянісцкіх або федэральных формаў кіравання праз частую змену дзяржаўнай прыналежнасці.*

*Сінтэз і канкурэнцыя заходне- і ўсходнееўрапейскіх уплываў адлюстроўваюцца адпаведна ў перавазе або Польшчы, або Расіі і асабліва ў зносінах паміж Рымска-каталіцкай і Рускай праваслаўнай цэрквамі і ў стварэнні Ўніяцкай (Грэка-каталіцкай) царквы. Хаця руска-праваслаўны варыянт патрыярхальнай суб'ектнай культуры ў рэшце рэшт перамог у гэтым спаборніцтве, заходне-каталіцкі або ўніяцкі варыянты актыўнай буржуазнай культуры заўсёды прысутнічалі ў латэнтнай форме. Таму беларуская палітычная культура характарызуецца амбівалентнасцю: для яе дуалізм супрацьстаяння культурных праектаў гэтак жа характэрны, як і ярка выяўленае імкненне да гармоніі.*

## 1. Да пастаноўкі пытання: межы дыскурсу

Праблема ідэнтычнасці, з асаблівай сілай заяўленая на рубяжы 80–90-х гг.[1], адлюстравала шмат якія змены, што адбываюцца ў свеце. Найбольш радыкальныя з іх былі выкліканы дэканструкцыяй біпалярнага свету, ліквідацыяй адной з супердзяржаў і адпаведна разбурэннем колішняй сістэмы міжнародных камунікацый. Пэўнасць, якая склалася пад уплывам «ялцінскай» мяжы, што размежавала свет на дзве сістэмы, знікла. Практычна на працягу паўстагоддзя яна спрашчала працэс

1 Bayart J.-F. L'illusion identitaire: Fayard, Paris, 1996; Grosser A. Les identités difficiles. Paris, 1996; Linz J. and Stepan A. Problems of Democratic Transition and Consolidation. Southern Europe, South America, and Post-Communist Europe. Baltimore, 1996; Разуваев В.В. Национальная идентичность и внешняя политика России // Кентавр, 1993, № 5. С. 3–15 і інш.

ідэнтыфікацыі, забяспечваючы некаторую сацыяльна-палітычную кансалідацыю і ідэалагічны рэсурс афіцыйнай улады абапал размежавальнай лініі.

Сёння працэс стварэння новых камунікацый аказваецца вельмі складаным. З аднаго боку, ён звязаны з пошукам палітычнымі акцёрамі новай ідэнтычнасці, самаацэнкай, самаразуменнем; з другога боку – з распазнаваннем сябе ў трансфармаванай прасторы суседзяў, рэгіёна, кантынента, свету. І ў гэтым сэнсе ён нагадвае эксперыменты з галіны «палітычнай уфалогіі», дзе кантакцёры маюць справу з «неапазнанымі аб'ектамі», у якасці якіх выступаюць новыя дзяржавы ці іх хаўруснікі. Гэта, безумоўна, робіць працэс камунікацыі яшчэ больш непрадказальным, а часам і канфліктным, уносячы ў яго элементы недаверу і засцярогі.

Сярод шматлікіх метадаў, з дапамогай якіх магчыма развязаць праблемы ідэнтычнасці і аптымізацыі камунікацый, усё большае прызнанне набывае метад палітычнай культуры як «тлумачальнай катэгорыі» (Г. Алманд, С. Вэрба). «Гэты панятак надае псіхалагічнаму і суб'ектыўнаму вымярэнню палітыкі пэўную здольнасць быць тлумачальнымі чыннікамі»[2], практычным інструментам «разумення» працэсаў, якія адбываюцца. У нейкай ступені ён робіцца функцыянальна незаменным, калі гаворка ідзе аб «разуменні», пошуку ідэнтычнасці канкрэтнай краіны ці народа, у нашым выпадку – Беларусі. Досвед

2 Almond G., Verba S. The Civic Culture Revisited. Boston, 1980. P. 19.

рэканструкцыі палітычнай культуры Беларусі можа служыць своеасаблівым «герменеўтычным ключом» да сучаснага беларускага палітычнага «тэксту», які адмыкае яе магчымасці ў новай камунікацыйнай прасторы.

## 2. Гістарычная рэтраспектыва

### 2.1. Традыцыі і імідж дзяржаўнасці

Развязанне праблемы ідэнтычнасці ўключае абавязковы зварот да гістарычнай памяці народа, ягоных традыцыйных уяўленняў аб уласнай дзяржаўнасці, яе вытоках. Нягледзячы на скептычнае стаўленне пэўнай групы даследчыкаў да пытання аб існаванні ў беларусаў значнага гістарычнага досведу дзяржаўнасці, непрадузяты погляд на гісторыю сведчыць пра тое, што было б несправядлівым цалкам адмаўляць у ім Беларусі – хутчэй можна казаць аб спецыфічным варыянце гэтага досведу.

Гісторыя Беларусі налічвае некалькі спроб стварэння ўласнай дзяржаўнасці. Першая з іх звязана з узнікненнем першых княстваў-дзяржаў на яе сучаснай тэрыторыі. Нягледзячы на досыць развітыя для таго часу дзяржаўныя формы, яны, аднак, не сталі цэнтрамі імавернай беларускай дзяржавы, а ўвайшлі ў склад мацнейшых задзіночанняў, у прыватнасці Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ).

З часоў ВКЛ мадэль дзяржаўнай ідэнтыфікацыі беларусаў мела дуалістычны пачатак: з аднаго боку, ва ўмовах кампактнага

пражывання складваліся механізмы самаідэнтыфікацыі, якія дазвалялі беларусам адрозніваць сябе ад іншых народаў; з іншага боку, фармаванне беларускага этнасу адбывалася на тле пастаяннай лучнасці яго з іншымі народамі (ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расейскай імперыі, СССР), што абумовіла ўстойлівыя юніяніསцкія ўяўленні ў палітычнай культуры беларусаў. Гэты сіндром венгерскі даследчык Іштван Біба назваў «няшчасцем», «бездапаможнасцю народаў малых краін Усходняй Еўропы»[3]. Сутнасць яго – у нядольнасці народаў гэтых краін самастойна развязаць пытанне аб стварэнні ўласных нацыянальных дзяржаў у той перыяд, калі яны ўзнікалі па ўсёй Еўропе (XVI–XVIII стст.). З той толькі розніцай, што шмат якія з гэтых народаў (венгры, славакі) аказаліся здольнымі яго развязаць пазней – у XIX – пач. XX стст.; для беларусаў жа гэты перыяд аказаўся яшчэ больш працяглым. Юніяніսцкія ўяўленні значна адлюстраваліся і ў постсавецкім досведзе Беларусі, што будзе разгледжана далей.

Неабходна канстатаваць, што ў гістарычнай традыцыі беларусаў адсутнічае вобраз моцнай дзяржавы, самастойнага геапалітычнага цэнтра, «збіральніка зямель», які б аб’яднаў раскіданыя аўтэнтычныя этнічныя элементы ў нацыю. Наадварот, з прычыны адметнага геаграфічнага становішча Беларусі, якая знаходзіцца на мяжы двух цэнтраў саперніцтва – заходняга рымска-каталіцкага і ўсходняга праваслаўна-візантыйскага – яе тэрыторыя на працягу большасці гістарычнага

3 Szucs J. Les trois Europes: L’Harmattan, Paris. 1985. P. 108.

часу пастаянна падпадала пад перадзел. У розныя часы землі этнічных беларусаў або пераходзілі ад дзяржавы да дзяржавы (Польшчы, Расеі, Нямеччыны, Літвы), або перажывалі ўнутранае адміністрацыйнае перакройванне[4]. Пастаянна змяняў месца і галоўны адміністрацыйны цэнтр дзяржавы. Статус сталіцы мелі розныя гарады (Полацак, Наваградак, Вільня, Менск). Мабыць, менавіта гэтым тлумачыцца тое, што самаідэнтыфікацыя беларусаў была пераважна лакальная і грунтавалася на прыналежнасці да пэўнай тэрыторыі, мясцовасці, рэгіёна («тутэйшыя»), канфесійнай групы (праваслаўныя, каталікі і г.д.), клана, роду, сям'і, не ўздымаючыся да ўзроўню нацыі і дзяржавы.

Даследаванні, праведзеныя ў 1995–1996 гг. у межах міжнароднага праекта «Фаталізм і яго ўплыў на эканамічныя рэформы і дэмакратычныя працэсы» (INTAS)[5], пацвердзілі дагэтуль існую прыярытэтную значнасць лакальнай ідэнтыфікацыі перад агульнанацыянальнай. У іерархіі інтарэсаў, якімі кіраваліся грамадзяне падчас выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Савет РБ (у 1995 г.), першыя пазіцыі занялі асабістыя (75,4%), рэгіянальныя (49,1%), зямляцкія (46,1%) інтарэсы; за імі ішлі партыйныя і групавыя, а перадапошняе і апошняе месца занялі нацыянальныя (31,1%) і дзяржаўныя (30,5%). І ў гэтым сэнсе нацыянальная кансалідацыя выглядае няпростай задачай.

4 Газета «Нью-Йорк Таймс» вельмі рэзка выказалася з гэтай нагоды, назваўшы Беларусь «краінай, праклятай геаграфіяй і гісторыяй» (гл.: Гапова Е. Беларусь: от советского правлення до ядерной катастрофы // Свабода. 1997. 2 верасня).

5 Аўтарка гэтага артыкула каардынуе дадзены праект па Беларусі.

Агульнавядома, што працэс кансалідацыі дзяржавы адбываецца пад уплывам вонкавых і ўнутраных чыннікаў. Вонкавыя чыннікі тлумачацца неабходнасцю абароны ад магчымай агрэсіі звонку. Унутраныя чыннікі ёсць вынікам развіцця ўнутрыдзяржаўных працэсаў: стварэння адзінай эканамічнай інфраструктуры, уніфікацыі палітычна-прававой сістэмы, стварэння адзінай культурнай, моўнай прасторы. Псіхалагічны механізм гэтага працэсу грунтуецца на пачуццях бяспекі і прадказальнасці зносін паміж чальцамі супольніцтва. У выпадку беларускай дзяржаўнасці ўзаемадзеянне ўнутраных і вонкавых чыннікаў на працягу гісторыі часта праяўлялася канфліктнасцю; інакш кажучы, чыннік вонкавай агрэсіі не заўсёды аднолькава ўспрымаўся ўсімі чальцамі грамадства як пагроза бяспецы. Гэта тлумачылася няўстойлівасцю прававога стану розных сацыяльных згуртаванняў і груп (напрыклад, канфесійных), якія не заўсёды звязвалі асабістую бяспеку з тагачаснай дзяржавай, а таксама слабай унутранай кансалідацыяй па-рознаму арыентаваных груповак мясцовай эліты, калі вонкавы канфармізм пераважваў куды больш небяспечную дзейнасць па кансалідацыі нацыі.

Тым не менш сёння ў грамадскай свядомасці беларусаў існуюць два вобразы дзяржавы, якія ўяўляюць сабой варыянты праекцыйнай мадэлі беларускай дзяржаўнасці. Гэта так званая «інтэлектуальна-элітарная» мадэль ВКЛ і «масавая» – Савецкага Саюза і, адпаведна, БССР. У іх адлюстраваны дзве канцэптуальна супрацьлеглыя версіі ролі дзяржавы ў жыцці грамадства, зносін дзяржавы і грамадства. Першая версія

грунтуецца на ідэі прававой дзяржавы, абмежавання сфер яе кампетэнцыі з боку грамадства. Другая ўзыходзіць да ідэі сацыяльна справядлівай дзяржавы, з яе значным кантролем над грамадствам, размеркавальнай сістэмай і патэрналісцкімі чаканнямі. Кожнай з версій адпавядае свой сімвал-носьбіт (нацыянальны герой), у якім беларусы бачаць ідэал дзяржаўнага мужа. У першым выпадку гэта Л. Сапега, віцэ-канцлер ВКЛ, адзін з распрацоўнікаў Статута 1588 г.; у другім – П.М. Машэраў, адзін з найлюбімейшых партыйных кіраўнікоў БССР у 70–80-я гг.

Супярэчлівая гісторыя дзяржаўнасці беларускага народа выпрацавала ў беларусах агульныя арыентацыі-ўяўленні ў стаўленні да дзяржавы. У іх адсутнічае моцная нацыянальная ці нацыянальна-вызваленчая ідэя, якая адлюстроўвала б імкненне народа да незалежнасці і ягоныя прэтэнзіі на гістарычную актыўнасць на падставе ўласнага лёсу. Змест гэтых уяўленняў складае хутчэй ідэя пакутніцтва («шматпакутны беларускі народ») і вітальнай мэтазгоднасці («абы горш не было»). У адпаведнасці з ёй асоба абстрагуецца ад дзяржавы, якая заўсёды ўяўляецца некіруемай і варожай яму сілай, імкнучыся не выклікаць да сябе яе цікавасці. Адначасова ён адчувае да дзяржавы падданніцкую прыхільнасць, якая тлумачыцца тым неабходным мінімумам умоў, якія яна дае чалавеку для выжывання.

### 2.2. Арганізацыя палітычнай улады: *vice versa*

У арганізацыі палітычнай улады ў Беларусі можна з пэўнай дакладнасцю выдзеліць два асноўныя перыяды, супастаўленне

якіх дае магчымасць казаць аб сітуацыі «перарванай традыцыі». Узнікае пытанне: якая з традыцый была больш аўтэнтычная для беларусаў і, адпаведна, на якую з іх беларусы маюць большае аўтарскае права?

Першапачатковы працэс афармлення ўлады на беларускіх землях практычна не адрозніваўся ад аналагічных працэсаў у іншых рэгіёнах Еўропы. Эвалюцыя палітычнага ладу Беларусі ішла па лініі пераемнасці раннефеадальных інстытуцый дзяржаўнай улады, умацавання асноў феадальнай дзяржавы. Вялікае Княства Літоўскае (XIV–XVI стст.) мела ўсе прыкметы абмежаванай феадальнай манархіі на чале з вялікім князем (каралём, уладаром). У ВКЛ, як і ў раннефеадальных дзяржавах, значная роля належала Радзе, якая складалася з найзнатнейшых людзей дзяржавы, усё больш узмацняла свае становішча і ўдзельнічала ў прыняцці ўсіх найважнейшых дзяржаўных пастаноў.

Рост сацыяльнай ролі служылага (шляхецкага) стану адбіўся ў з'яўленні інстытуцыі прадстаўнічай улады, так званага Сойму, які збіраўся рэгулярна з XIV ст. Спачатку ён выконваў ролю шырокага сходу панавальнага класа для атрымання інфармацыі і абмеркавання прынятых валадаром і Радай пастаноў; пазней яго заканадаўчыя функцыі пашырыліся. З часам Сойм стаў найвышэйшым заканадаўчым органам улады ў ВКЛ, а затым у Рэчы Паспалітай, і менавіта яму належала права

выбіраць караля, які быў звязаны дамовай з найвышэйшымі прадстаўнікамі шляхты[6], ад якіх залежала яго выбранне.

Рэч Паспалітую часта называлі «шляхецкай рэспублікай», аснову якой складалі шматлікія «шляхецкія вольнасці». «Сацыяльны плюралізм», які «даў штуршок да з'яўлення ў досыць ранні перыяд станаў, парламентаў і іншых інстытуцый, якія прадстаўлялі інтарэсы арыстакратыі, духавенства, купецтва і іншых груп»[7], быў у такой жа ступені характэрны для развіцця беларускага грамадства XIV–XVIII стст., як і для іншых краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расейскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай вызначыла для Беларусі не толькі новае геапалітычнае становішча, але і прывяло да радыкальных сацыяльна-культурных трансфармацый. Беларускія землі былі інкарпараваныя ў магутную бюракратычную, моцна цэнтралізаваную дзяржаўную сістэму Расеі і падпарадкоўваліся законам абсалютнай манархіі, якая мела статус імперыі. Беларусь апынулася ў сітуацыі «адваротнага руху» – *vice versa*, у прасторы адваротных культурных кодаў. Апеляцыя да прызнання аўтаноміі розных грамадскіх суб'ектаў мянялася на апеляцыю да моцнай дзяржаўнай улады. «Бо тут (у Расеі – аўт.) не склаліся ніякія іншыя механізмы інтэграцыі

6 Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мінск, 1991. С. 126–128.

7 Хантингтон С. Запад уникален, но не универсален // Мировая экономика и международные отношения. 1997. № 8. С. 86.

і інстытуцыялізацыі грамадства, абмежавання баярскіх і дваранскіх прывілеяў і прэрагатыў, акрамя моцнай дзяржаўнай улады»[8]. Новая рэальнасць для Беларусі выявілася:

- у пераходзе ад абмежаванай манархіі, ад рэспубліканскіх элементаў панавання (няхай нават у варыянце шляхецкай рэспублікі) да формы абсалютнай манархіі (неабмежаванага самадзяржаўя);

- у скарачэнні наяўных інстытуцый палітычнага ўдзелу (у першую чаргу, інстытуцыі выбараў) і замене іх інстытуцыямі прызначэнняў і вертыкальнага падпарадкавання;

- у рэзкім змяншэнні прасторы гарызантальных зносін, у зборы дысперснай улады (аўтаноміі мясцовай феадальнай знаці (магнатаў), федэральных зносін Рэчы Паспалітай і ВКЛ, самастойнасці гарадоў згодна магдэбургскаму праву) і паступовай манапалізацыі яе і канцэнтраваннні ў імперскім цэнтры;

- у паступовай правінцыялізацыі беларускіх зямель, наданні ім статусу «імперскай перыферыі».

Сутыкненне двух палітычных дыскурсаў прывяло да з’яўлення і даўгачаснага існавання культурнага канфлікту на тэрыторыі Беларусі. Ён адлюстроўваў сутыкненне двух гістарычных

8 Гаджиев Д.А. Размышления о политической культуре современной России // Мировая экономика и международные отношения. 1996. № 2. С. 28.

тыпаў арганізацыі палітычнай прасторы – сацыяцэнтрычнага (ўсходняга) і персонацэнтрычнага (заходняга)[9] – ці двух тыпаў палітычнай культуры – патрыярхальна-падданніцкага і актывісцка-падданніцкага (Г. Алманд, С. Вэрба), якія адначасова прысутнічалі ў сацыяльна-культурным кантэксце Беларусі, вызначаючы яго амбівалентнасць. Гэты канфлікт быў часткова пераадолены на карысць сацыяцэнтрычнага дыскурсу ў перыяд існавання СССР.

## 2.3 Менталітэт беларусаў: асаблівасці культурнага кода

Менталітэт уяўляецца як асаблівы спосаб, альбо, хутчэй, механізм, успрымання і першаснага апрацоўвання сацыяльнай інфармацыі, які грунтуецца на калектыўным бессвядомым. Узыходзячы да ўстойлівых структур сацыяльна-псіхалагічнай дзейнасці чалавека, феномен менталітэту ўключае ў сябе істотную для ідэнтычнасці народа ці краіны праграмную інфармацыю. Ён у значнай ступені вызначае панавальны тып палітычнай культуры, яе дынаміку, кірунак змен. Даследаваўшы асаблівасці менталітэту таго ці іншага народа, можна з пэўнай дакладнасцю прадказаць алгарытм ягоных паводзінаў у канкрэтных сітуацыях. Трэба заўважыць, што чым менш інстытуцыялізаваныя тыя ці іншыя працэсы, тым больш правілы і працэдуры змяняюцца псіхалагічнымі механізмамі сацыяльнай арыентацыі, сярод якіх не апошнюю ролю граюць устойлівыя структуры менталітэту народа, сацыяльнай групы.

9 Оболонский А.В. Драма российской политической истории: система против личности. М.: Институт государства и права РАН, 1994.

*Геаграфічны і геапалітычны чыннікі* фармавання беларускага менталітэту вызначаюцца своеасаблівым становішчам Беларусі. Яе землі і ў прамым, і ў пераносным сэнсе заўсёды знаходзіліся на скрыжаванні міжнародных шляхоў, уплываў, інтарэсаў, культур. З аднаго боку, гэта спрыяла развіццю гандлю, рамёстваў, адукацыі, рабіла землі адкрытымі для кантактаў; з іншага – стварала пастаянную пагрозу нападаў звонку.

Тэрыторыя Беларусі была амаль пастаянным тэатрам ваенных дзеянняў[10], часта насуперак сваёй волі, робячыся буфернай зонай ці «разменнай манетай» у спрэчцы мацнейшых сапернікаў, як, напрыклад, падчас вайны паміж Маскоўскай дзяржавай і Польскім Каралеўствам, а затым Рэччу Паспалітай (XVI–XVII стст.), Паўночнай расейска-шведскай вайны (пач. XVIII ст.). Асабліва разбуральныя і цяжкія былі для Беларусі войны XX ст., якія вызначылі антываенную скіраванасць сучаснай палітычнай культуры беларусаў са спецыфічнай сімвалізацыяй Айчыннай вайны 1941–45 гг.

Пастаянная небяспека апынуцца ў сітуацыі вайны, навалы ці проста прыходу новай улады стварылі архетып эфектыўнай псіхалагічнай мабілізацыі і адаптацыі. Яго характарызуюць такія якасці, як стрыманасць, цярплівасць, прывычка да цяжкасцей жыцця, нейкая замкнёнасць, схільнасць хаваць свае

10 Былі перыяды, калі войны на тэрыторыі Беларусі доўжыліся дзесяцігоддзямі з кароткімі перапынкамі. Практычна ў гісторыі Беларусі нельга адшукаць 30–40 год, якія не былі б адзначаны вайной (за выняткам апошняга дзесяцігоддзя).

пачуцці, апатычнасць. Як адзначалася ў Расейскай энцыклапедыі, выдадзенай у пачатку XX ст., «па натуры беларусы занадта апатычныя, але гэта найхутчэй вынік гістарычных умоў, чым прыкмета малаталенавітасці»[11]. Неабходнасць выжываць ва ўмовах павышанай небяспекі прычынілася да пэўнай ізаляванасці прыватнага жыцця беларусаў, уменне існаваць аўтаномна, «адгароджвацца ад суседзяў, нават калі гэта шкодзіць карысці»[12]. Даследчыкі, якія вывучаюць менталітэт і характар беларусаў, адзначаюць таксама, што фармаванню іхняга своеасаблівага ізаляцыянізму спрыялі спецыфічныя геаграфічныя ўмовы значнай часткі Беларусі, размешчанай у балоцістай, лясістай ці пясчанай мясцовасці. Рэдкія пасяленні, раскіданыя быццам на астравах, маглі доўгі час не ўступаць ні ў якія кантакты[13]. На гэтым тле ўзнікала своеасаблівая культура самадастатковай камунікацыі, апоры на ўласны досвед і мясцовыя традыцыі.

Беларусы ў архетыпе ніколі не прэтэндавалі на велізарную жыццёвую прастору – ім было досыць той, на якой змяшчалася іхняе прыватнае жыццё, але ў межах гэтага прыватнага жыцця яны захоўвалі і бераглі сваю незалежнасць. Шмат якія ваенныя факты розных гістарычных перыядаў зафіксавалі характэрную рысу паводзінаў беларусаў у стаўленні да акупацыйных уладаў, да войскаў непрыяцеля: у большасці выпадкаў гэтае стаўленне

11 Русская энциклопедия. СПб., 1907. Т. 3. С. 401.

12 Тамсама. С. 401.

13 Коялович М.О. Чтения по истории Западной России. Изд. 4-е. СПб., 1884.

было абыякавае[14]. Супраціў чыніўся тады, калі акупацыйны рэжым ажыццяўляў прамы гвалт і знішчэнне людзей ці калі апаганьваліся агульнапрызнаныя святыні, каштоўнасці.

Стрымана-канфармісцкая рэакцыя на прыход чужаземцаў мела латэнтную матывацыю, у структуры якой дамінаваў матыў лаяльнасці ў імя бяспекі. Разам з тым вытокі яго звязаны са звычкай да асобнага існавання, пра якую казалася вышэй, прыярытэтамі лакальнай ідэнтыфікацыі над агульнадзяржаўнай, якая, у сваю чаргу, ва ўмовах дзяржаўнай нявызначанасці была адзінай магчымай гарантыяй бяспекі[15]. Вядома, што ў часы ўсіх найбуйнейшых войнаў XIX–XX стст. на акупаванай тэрыторыі Беларусі ствараліся нацыянальныя ўрады, якія спрабавалі зацвердзіць незалежнасць Беларусі[16]. Фактычна гэтым спробам ад самага пачатку была наканавана няўдача. І не толькі таму, што наваствораныя структуры мелі найчасцей вузкагрупавы характар і змушаны былі апеляваць да

14 Гісторыя Беларусі. Пад рэд. А.Г. Каханоўскага і інш. Мн., 1996. С. 195, 399.

15 Сведкі расказваюць гісторыю часоў вайны 1812 г., калі Напалеон нібы спыніў на дарозе жанчыну і спытаў у яе, за каго яна ў гэтай вайне. На што жанчына адказала: «Ды я б хацела, каб француз, заняўшы Маскву, пагнаў, пагнаў ды і сам не вярнуўся!..» (Гісторыя Беларусі. Мн., 1996. С. 195). Адказ жанчыны можна разумець як жаданне, каб французы разбіраліся з Масквой (Расеяй) самі па сабе, а народ жыў сам па сабе, без тых і без гэтых.

16 Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов: В 4-х т. Мн., 1961. Т. 3; 1979. Т. 4; Мазинг Г.Ю., Ерусалимчик Л.Ф., Березина, год 1812-ый. Мн., 1991; Доўнар-Запольскі М.В. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Мн., 1994; Долготович Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах. Мн., 1994; Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993.

акупацыйнага рэжыму, але і, як гэта ні падасца парадаксальным, таму, што нацыянальнае аб'яднанне з гледзішча лакальнай (ці мястачковай) бяспекі несла непрадказальнасць і пагрозы.

Выняткам з'яўляецца, бадай, вызваленчае змаганне беларускага народа перыяду Вялікай Айчыннай вайны, якая дала прыклады масавага гераізму, патрыятызму і партызанскага руху. Аднак і ў гэтым выпадку ўвесь спектр паводзінных рэакцый хутчэй пацвярджае, чым абвяргае архетыпныя структуры менталітэту беларусаў – супраціў і актыўнае змаганне з гітлераўскай арміяй былі рэакцыяй на масавы генацыд вермахта ў акупаванай зоне.

*Этнічна-канфесіянальны і культурны чыннікі* заўсёды граюць значную ролю ў працэсе самаідэнтыфікацыі народа, фармаванні асаблівага тыпу палітычнай культуры. Беларускае грамадства на працягу стагоддзяў стварыла свой тып зносін з рэлігіяй, які стаў часткай сацыяльна-культурнай арганізацыі беларусаў. У цэлым іх вызначала поліканфесійнае асяроддзе, аснову якога складалі суіснаванне і саперніцтва дзвюх асноўных канфесій – праваслаўя і каталіцтва.

Першапачаткова хрысціянства на беларускіх землях сцвердзілася ў форме праваслаўя, якое мела найбольшы ўплыў у Кіеўскай Русі і падпарадкоўвалася адзінаму цэнтру ў Канстанцінопалі. Шмат якія даследчыкі схільныя лічыць, што працэс хрысціянізацыі меў у Беларусі негвалтоўны характар,

у адрозненне ад хрышчэння кіеўскіх і наўгародскіх зямель[17]. Гэта дало падставу сцвярджаць, што пазнейшая рэлігійная лаяльнасць беларусаў мае глыбокія карані.

У XIII і асабліва ў XIV стст. у ВКЛ узмацняўся ўплыў каталіцкай царквы, чаму спрыяла заключэнне ў 1385 г. Крэўскай уніі паміж ВКЛ і Польскім Каралеўствам. З канца XIV ст. каталіцызм становіцца ў ВКЛ прыярытэтнай рэлігіяй, якая мела прывілеяваны стан у параўнанні з праваслаўем і дзяржаўную падтрымку. Падзел ВКЛ на дзве канфесіі вызначыў не толькі розніцу рэлігійных арыентацый насельніцтва, але і пацвердзіў змаганне дзвюх дзяржаў – Маскоўскай і Польскай – за пашырэнне ўплыву на суседнія тэрыторыі, у якой часовую перамогу атрымала Польшча. Як адзначае гісторык А. Кіштымаў, «беларусы цягам некалькіх стагоддзяў існавалі на мяжы супрацьстаяння двух славянскіх цэнтраў – Польскай Кароны і Маскоўскага царства», і таму ў «рэлігійным жыцці Беларусі заўсёды было больш палітыкі, чым рэлігіі»[18]. Найхутчэй менавіта моцная залежнасць рэлігійных і вонкавапалітычных арыентацый вызначыла досыць унікальную этнічна-канфесійную атмасферу ў ВКЛ, якая грунтавалася на сацыяльна-культурным дуалізме і кансэнсуснай культуры.

17 Тарасаў С. Адкуль прыйшло хрысціянства ў Беларусь? // Полацк, 1991, № 10; Анціпенка А. Еўрапейскасць і хрысціянская ідэя беларускасці // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 2. Мн., 1992. С. 260–261; Зайкоўскі І. Роля канфесійнага фактару ў нацыянальнай свядомасці беларусаў // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 2. Мн., 1992. С. 263–264 і інш.

18 Кіштымаў А. Менталітэт беларусаў вачамі рускага // Беларусіка – Albaruthenica: Мн., 1992. С. 203–204.

Саперніцтва дзвюх канфесій своеасабліва спрыяла ўсталяванню адноснай рэлігійнай раўнавагі паміж імі, пошуку кампрамісу дзеля захавання пэўнай самастойнасці ВКЛ. Кожная з клерыкальных груповак усведамляла небяспеку ператварэння любога рэлігійнага канфлікту ў ваеннае процістаянне дзяржаў, таму пазбягала крайніх, гвалтоўных метадаў. У рэчышчы гэтых тэндэнцый праваслаўная канфесія спачатку зраўнялася ў правах з каталіцкай, а затым паміж імі была заключана царкоўная унія (Берасцейская унія 1596 г.), якая паклала пачатак новаму кірунку хрысціянства – уніяцтву. Уніяцтва не прадугледжвала спалучэння канфесій, але было свайго роду кампрамісам паміж «каталіцкім папацэзарызмам» і «праваслаўным цэзарэпапізмам»[19]. Згодна Берасцейскаму пагадненню, на беларускіх землях захоўваліся праваслаўныя звычаі, абраднасць і святы, а таксама набажэнства на царкоўнаславянскай мове. Адначасова прызнавалася вяршэнства папы рымскага і каталіцкага веравучэння. Пад канец XVIII ст. ўніяты ўтваралі 70% насельніцтва Беларусі, а сярод вяскоўцаў іх было 80%[20]. Новая царква стала здольнай процістаяць не толькі дагматызаванаму праваслаўю, але і экспансіяністкай палітыцы акаталічвання і апалячвання, што праводзіла Рэч Паспалітая.

Этнічна-канфесійная сітуацыя ў Беларусі спрыяла з'яўленню своеасаблівага тыпу сацыяльна-культурнага ўзаемадзеяння, якое адбілася ў беларускім менталітэце. У яго аснове два

19 Бердяев Н.А. Философия свободы. М., 1989. С. 167.

20 Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 66.

элементы – дваістасць і гармонія – утвараюць натуральны пачатак. Часта даследчыкі для тлумачэння беларускага менталітэту звяртаюцца да твора беларускага паэта-філосафа І. Канчэўскага (псеўданім – Ігнат Абдзіраловіч) «Адвечным шляхам». У сваім творы ён пісаў: «Беларусь, пачынаючы з X стагоддзя да сённяшняга часу з'яўляецца полем змагання двух напрамкаў еўрапейскай <...> культуры – заходняга і ўсходняга. Дзесяцігоддзі блукання сведчаць пра тое, што беларусы, як украінцы і балканскія славяне, не змаглі шчыра далучыцца ні да аднаго, ні да другога напрамку. <...> Блуканне паміж Захадам і Ўсходам і шчырая непрыналежнасць ні да аднаго, ні да другога ўяўляецца асноўнай прыкметай гісторыі беларускага народа. <...> Жыццё патрабавала сінтэзу, гарманізацыі абодвух напрамкаў, але гэта, як відаць, зрабілася немагчымым»[21].

Сапраўды, дваістае становішча Беларусі і адначаснае імкненне да нейкай раўнавагі стварала адпаведны архетып свядомасці, жыццёвы код, які адлюстраваўся ў своеасаблівай версіі праваслаўя на беларускіх землях.

*Рэгіянальная версія ўсходнеславянскага менталітэту і беларуская версія праваслаўя* адрозніваліся ад велікарускага і класічнага візантыйскага. Для беларусаў не была характэрна ўласцівая расейскаму менталітэту схільнасць да крайнасцей, да рэзкіх пераходаў – ад дэспатызму да анархіі, ад меланхалічнай

21 Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам. Мн., 1993. С. 9, 15.

сузіральнасці да жорсткасці, ад схільнасці да гвалту да ахвярнасці і бескарыслівай дабраты, ад рабства да бунту ды інш.[22]

З аднаго боку, для беларусаў, як і для ўсіх праваслаўных славян, асновай светаўладкавання была не асоба, а калектыў, грамадства з ягонымі ідэаламі брацкай любові і салідарнасці. І таксама, як і ў расейцаў ды ўкраінцаў, у беларусаў «...патрабаванні асобы да грамадства дзеля набыцця ўсё большых правоў для сябе ўспрымаліся <...> як нешта амаральнае»[23].

З іншага боку, менталітэт ніколі не меў у беларусаў такога самадастатковага глабальнага характару, як у расейцаў, калі асабістае зліваецца з агульным, калі служэнню грамадскай справе аддаюцца ўсе сілы асобы і тым самым абумоўліваюцца ейныя правы[24]. Для беларусаў, як ужо адзначалася, больш характэрна адчуванне ўласнай незалежнасці, аўтаномнасці. У іхнім менталітэце асоба не прэтэндуе на правы – разам з тым ейны мікракосм незалежны, ён не злучаецца з макракосмам, а выхад за межы мікракосму часцей за ўсе лакальна акрэслены (вёскай, горадам, зямлёй).

Істотна і тое, што беларусы ў традыцыі хрысціянства «ўспрымаюць сусвет як светаўладкаванне, у якім усё мае сваё пэўнае,

22 Бердяев Н. Русская идея: Основные проблемы русской мысли XIX и нач. XX в. Париж, 1946. С. 5–7.

23 Люкс Л. Евразийство // Вопросы философии. 1993. № 6. С. 202.

24 Евразийство. Декларация. Формулировка. Тезис. Берлин. 1926, С. 3.

боскай воляй вызначанае месца»[25], якое ніхто не можа парушаць. Іх пакорлівасць лёсу адбіваецца ў своеасаблівым кансерватызме і інертнасці і не схільная да выбуху ў «рускім бунце, бессэнсоўным і бязлітасным» (А. Пушкін). Сваю незадаволенасць беларусы хаваюць унутры сябе, сублімуючы яе ў вонкавую ветлівасць і гасціннасць. Гэтая ўласцівасць адзначана даследчыкам Э. Дубянецкім як «амбівалентнасць пачуцця»[26].

Менавіта ў структурах падсвядомасці хаваюцца вытокі беларускай талерантнасці, гутаперчавасці (В. Абрамава), пластычнасці (А. Кіштымаў). Яны, безумоўна, не ёсць вынікам свядомага выбару, а толькі імкненнем свядомасці да камфорту, раўнавагі ва ўмовах раздвоенасці.

Менталітэт беларусаў мае яшчэ адно істотнае, на нашу думку, адрозненне ад менталітэту расейцаў. У структуры расейскага менталітэту значнае месца займае так званы жыццясэнсавы кампанент. Спасціжэнне сэнсу жыцця, сузіральнасць, канструяванне ідэалу з'яўляюцца складовымі часткамі філасофіі «рускай ідэі» і абавязковым атрыбутам зямнога жыцця расейцаў. Такім чынам, «рускі чалавек» быццам не жыве зямным жыццём: для яго характэрна «імкненне да трансцэндэнтнага, якое адносіцца ці то да вечнасці, да іншага сусвету, ці то да

25 Трубецкой Н. Наследие Чингисхана // Вестник МГУ. Сер. «Социально-политические исследования». 1991, № 4. С. 40.

26 Дубянецкі Э. Мэнталітэт беларусаў: спроба гісторыка-псіхалагічнага аналізу // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 2. Мн., 1992. С. 195.

будучыні, да гэтага сусвету»[27]. Губляючы з поля зроку праект, расеец губляе і цікавасць да жыцця. Філосаф Л. Карсавін пісаў пра гэтую ўласцівасць расейцаў: «Дзеля ідэалу ён гатовы адмовіцца ад усяго, ахвяраваць усім; усумніўшыся ў ідэале ці ў яго хуткім ажыццяўленні, ён уяўляе сабою ўзор нячулай скацінападобнасці ці міфічнай абыякавасці да ўсяго»[28].

У іншай парадыгме працуе менталітэт беларусаў. Для іх не характэрна абсалютызацыя ідэалу і ўвогуле праекцыйнасць: будучыня мае вельмі блізкія межы. У адрозненне ад расейцаў з іхняй каштоўнасцю жыцця ў будучым, для беларусаў важная вартасць жыцця ў цяперашнім, «тут і цяпер». З гэтай прычыны іхнія ўяўленні аб духоўнасці не ператвараюцца ў аскетычны абсалют, а канкрэтызаваны ў стандартах паводзінаў. Забягаючы наперад, можна сказаць, што для беларусаў заўсёды былі досыць чужыя труізмы сацыяльных праектаў у выглядзе глабальнай перабудовы свету.

Усё гэта, мабыць, яшчэ і таму, што версія беларускага праваслаўя не месціць экспансіяніскіх імкненняў, прысутных у візантыйскай месіянскай традыцыі. Беларускаму менталітэту не ўласцівы ні геапалітычны, ні канфесійны экспансіянізм. Як адзначалася раней, жыццёвая прастора беларуса лакалізаваная і ў яе межах знаходзіцца сфера пошуку гармоніі. Можна сказаць, што ў беларускім менталітэце прысутнічаюць кампаненты і заходне-, і

27 Бердяев Н. Истоки и смысл русского коммунизма. М., 1990. С. 9.

28 Русская идея. М., 1992. С. 322.

ўсходнееўрапейскай культуры, але еўрапейскай, а не еўразійскай, як у расейцаў. «Еўразійства, – падкрэсліваюць даследчыкі праблемы А. Буценка і Ю. Калеснічэнка, – аб'ектыўная якасць, уласцівая толькі расейскай дзяржаве і яе насельнікам з таго часу, як дзяржава размясцілася на двух кантынентах: у Еўропе і Азіі <...> што вымагала ад грамадзян і кіраўнікоў улічваць <...> гэтую геапалітычную і расава-этнічную рэальнасць...»[29].

Далучэнне беларусаў да еўразійства пачалося з канца XVIII ст., калі беларускія землі аказаліся ў складзе Расейскай імперыі. Да гэтага часу спробы арганізаваць лакальную прастору, узмацніўшы тым самым тып культуры, што складваўся на беларускіх землях, праяўляліся ў намаганні стварыць аўтакефальную царкву, а таксама ў падпісанні царкоўнай уніі.

Уніяцтва, на думку шмат каго з даследчыкаў, магло стаць спосабам захавання этнічнай цэласнасці, нацыянальнай своеасаблівасці беларускага народа, прадвеснікам нацыянальнай беларускай царквы[30]. Палітычна ўніяцтва было скіравана на Захад, а псіхалагічна – заставалася ў той жа пазіцыі ўсходнеславянскага праваслаўя. Такім чынам, не парушаючы базавых каштоўнасцей беларусаў, яно месціла рэзерв самарэфармавання ў кірунку

29 Бутенко А.П., Колесниченко Ю.В. Менталитет россиян и евразийство: их сущность и общественно-политический смысл // Социологические исследования. 1996. № 5. С. 98.

30 Ігнатоўскі В. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991; Станкевіч А. Хрысціянства і беларускі народ. Вільня, 1940; Лыч Л. Рэлігія і нацыянальная самасвядомасць беларусаў. Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 2. Мн., 1992. С. 59–68.

ўраўнаважвання амбівалентнай ментальнасці беларусаў. Аднак яму не давялося адыграць рэвалюцыйнай ролі накшталт заходнееўрапейскага пратэстантызму. Спачатку спроба гвалтоўнага і мэтанакіраванага акаталічвання, а затым русіфікацыя вызначылі яго кароткі гістарычны лёс.

*Імперска-праваслаўная культурная дамінанта* прадугледжвала не толькі палітычнае падпарадкаванне беларускіх зямель Расейскай кароне, але і іх нацыянальна-культурную асіміляцыю. Гэта дасягалася рознымі спосабамі. З канца XVIII ст. пачаўся перавод уніятаў у праваслаўе ва ўмовах гвалту і рэпрэсій з боку праваслаўнай царквы і дзяржавы, якой гэтая царква была падпарадкавана[31]. А ў 1839 г. уніяцтва было ліквідавана цалкам. Згодна перапісу 1897 г., праваслаўнае насельніцтва ўтварала значную большасць сярод беларусаў – 81,2%; каталікоў адпаведна было 18,8%[32]. Царскім урадам праводзілася актыўная перасяленчая палітыка, а таксама насаджэнне расейскай мовы. Выкарыстанне беларускай мовы не дазвалялася ні ў школе, ні ў дзяржаўных установах, ні ў друку (акрамя этнаграфічных публікацый)[33], што прычынілася да практычна суцэльнага выціскання беларускай мовы ў сферу гутарковай гаворкі пераважна сялянскага стану.

31 З 1797 г. расейскі імператар афіцыйна лічыўся кіраўніком рускай праваслаўнай царквы. Гл. таксама: Хаўстовіч М. Скасаванне уніі // З гісторыяй на «Вы». Мн., 1994. С. 107–117.

32 Минская старина. Мн., 1911. Вып. 11. С. 4–9.

33 Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х частках. Ч. 1. Мн., 1994. С. 334.

Паступова адбывалася кардынальная пераарыентацыя ў бок расейскай версіі праваслаўя. Ва ўмовах імперыі гэтая версія прадугледжвала зрастанне рэлігіі з дзяржавай, яе ідэалагічнае забеспячэнне і падтрымку, а таксама паступовую эвалюцыю ад каштоўнасцей абшчыны да каштоўнасцей імперыі[34] («самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць»), якая не закранула сутнасці фундаментальных арыентацый камунітарысцкага тыпу.

Для насельніцтва беларускіх зямель канчаткова аформіўся кансэнсусны тып культуры, які грунтаваўся на дваістым культурным кодзе і валодаў гібкім механізмам псіхалагічнай адаптацыі. Выпрацаваны ва ўмовах дваістасці культурных уплываў і нявызначанасці выбару, ён палягаў у намаганні дасягнуць і захаваць грамадскую згоду. Адзначым, што згода трактавалася ў ім як самакаштоўнасць, як табуяваны сімвал, які не можа быць разбураны. Асноўныя прыкметы гэтага тыпу культуры – непрымальнасць канфліктаў і супярэчнасцей, схаваная незадаволенасць і псіхалагічнае напружанне (як вынік непераадоленых супярэчнасцей); імкненне да стабільнасці; непрынясце радыкалізму і адкрытай апазіцыі. Зазвычай кансэнсусны тып культуры звязаны з кансервацыяй традыцыйных асноў грамадства, знаёмых і зразумелых усім, з недаверам да навацый, якія разбураюць звыклую «грамадскую тканіну».

Склалася канфесійная сітуацыя, што не спрыяла развіццю працэсу самавызначэння беларусаў як самастойнага этнасу.

34 Оболонский А.В. Драма российской политической истории: система против личности. М., 1994. С. 15–16.

У афіцыйнай палітыцы русіфікацыі значнае месца адводзілася этнічнай пераарыентацыі беларускага насельніцтва. Тэорыі «панславізму», «заходнерусізму» сцвярджалі, што беларусы – гэта тыя ж расейцы. Афіцыйна падтрымлівалася самавызначэнне беларусаў у залежнасці ад веры: усе праваслаўныя беларусы («рускай веры») аўтаматычна называліся «рускімі», каталікі («польскай веры») – «палякамі». Такім чынам, тэрмін «беларусы» нібы знікаў з ужытку і, адпаведна, выціскаўся са свядомасці.

Апынуўшыся ў складзе Расейскай імперыі, Беларусь трапіла ў зону дзеяння жорсткіх дзяржаўных установак адносна веры і свабоды сумлення. Праваслаўе ў этатызаваным варыянце рабілася не столькі верай, колькі ідэалогіяй і забяспечвала не столькі камунікацыю людзей паміж сабой (аўтаномію грамадства), колькі сувязь падданых з дзяржавай (узмацненне самадзяржаўя). Гэта накладала значны адбітак на працэс утварэння грамадзянскай культуры беларусаў, на ўяўленні аб месцы рэлігіі ў палітыцы і грамадстве. Іншыя рэлігіі, застаючыся па-за межамі афіцыйнай трыяды – «самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць» – былі больш адкрытыя сацыяльнай эвалюцыі. У гэтым плане каталіцтва стала часткова востравам захавання беларускай мовы і цэнтрам беларускага нацыянальнага адраджэння (асабліва ў пач. ХХ ст.)[35].

35 Грыгор'ева В. Каталіцкае духавенства ля вытокаў беларускага адраджэння // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 2. Мн., 1992. С. 293–297.

Размежаванне беларусаў на дзве асноўныя канфесіі з розным грамадскім статусам вызначыла пазней не толькі нацыянальна-культурныя прыярытэты і механізм самаідэнтыфікацыі беларусаў (праз прыналежнасць да расейцаў ці палякаў), але таксама сацыяльна-групавую (станавую) дыферэнцыяцыю і рэгіянальную субкультурную спецыфіку. Менавіта ў гэты час афармляецца пачаты яшчэ ў Рэчы Паспалітай працэс культурна-камунікацыйнага дыстанцыявання паміж беларускай нацыянальнай элітай (інтэлігенцыя, грамадскія і духоўныя дзеячы, шляхта) і асноўнай часткай народа. Большая частка беларусаў, прадстаўленая найперш сялянствам, спавядала праваслаўе – беларуская эліта арыентавалася ў значнай ступені на каталіцызм. Іхняе існаванне ў розных культурных кантэкстах часта праяўлялася ва ўзаемным неразуменні і перашкаджала наладжваць камунікацыі.

*Савецкі перыяд* не ўяўляе сабой значнай цікавасці з гледжання фактарнага аналізу рэлігіі ў палітычнай культуры Беларусі, бо царква не мела ніякай значнай ролі ў яе жыцці.

Рэлігійная палітыка савецкай улады фармальна вызначалася прынцыпамі свабоды сумлення і аддзялення царквы ад дзяржавы. Насамрэч аддзяленне царквы ад дзяржавы прывяло да амаль суцэльнага выгнятання яе з грамадскага жыцця і замяшчэння камуністычнай партыяй, якая, узурпаваўшы правы галоўнага ідэалагічнага дэміурга, мадэрнізавала хрысціянскія каштоўнасці ў вучэнні марксізму–ленінізму і не магла пагадзіцца мець побач з сабой ідэалагічнага канкурэнта.

З гэтай прычыны царква спачатку страціла сваё значэнне адзінай і абсалютнай уладальніцы ісціны і пасрэдніцы веры, а затым стала аб'ектам жорсткіх рэпрэсій.

Прынцып свабоды сумлення аказаўся толькі свабодай выбару паміж верай у бога і ягоным адмаўленнем. Таму вера ў бога стала своеасаблівым дысідэнцтвам для савецкага грамадства, адлюстраваннем сумневу ў камуністычнай ідэі.

## 2.4. Асаблівасці палітычнай культуры Беларусі савецкага перыяду

У агульнай савецкай сацыяльна-культурнай прасторы Беларусь мела своеасаблівы дыскурс. Ён зусім адэкватна праецыюе яе будучы постсавецкі лёс, хоць у патэнцыяле змяшчае значна шырэйшы спектр выбару. За гады савецкай улады Беларусь «адшліфавала» найбольш цэльны, калі можна так сказаць, гарманічны ўзор савецкай палітычнай культуры.

Павышаныя адаптацыйныя якасці беларускага народа, успрымальнасць і цярплівасць дазволілі не толькі прыстасавацца да бальшавіцкага рэжыму, але і з выгадай для сябе выкарыстаць створаную ім сацыяльна-эканамічную мадэль. Свой «спецыфічны твар» у савецкай сістэме каардынат Беларусь атрымала ў пасляваенныя гады. Яго шмат у чым вызначыла сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя. Да знядоленага пасля вайны насельніцтва Беларусі было скіравана некалькі міграцыйных плыней: былых вайскоўцаў, аселых на тэрыторыі Беларусі пасля

яе вызвалення, а таксама дэмабілізаваных пасля хрушчоўскай ваеннай рэформы; працоўных і спецыялістаў, якія аднаўлялі яе эканоміку. У выніку гэтых міграцый за 30 пасляваенных гадоў колькасць, напрыклад, расейцаў («русских») у Беларусі павялічылася на 103%, украінцаў – на 120%, а беларусаў – усяго толькі на 21%, што прычынілася да зніжэння іхнай удзельнай вагі ў агульным складзе насельніцтва з 81,1 % да 77,9%[36]. Адзначым, што большая частка нетутэйшага насельніцтва асядала ў гарадах. У выніку прарасейскай палітыкі, якая праводзілася саюзным цэнтрам, блізкасці паводле гучання расейскай і беларускай моў, а таксама нязначнага ўплыву беларускамоўнага інтэлектуальнага асяроддзя на агульнасацыяльныя і культурныя працэсы беларуская мова практычна цалкам была выціснута з гутарковай сферы.

Вясковае насельніцтва, мабілізаванае ў гарады на «будоўлі індустрыялізацыі» (асабліва ў канцы 50-х – 70-я гг.), нюансавала новы тып культуры, што ўзнікла ў гарадах у гэты час. ««Сялянская нацыя» рынула ў горад, дзе яе чакала гарадская культура – расейска-савецкая»[37]. Гэтую культуру наўрад можна было назваць «расейска-савецкай», бо, акрамя расейскай мовы, у ёй увогуле не было этнічных прыкмет; тым не менш яна сапраўды была не беларускай, а хутчэй поствaеннай індустрыяльнай культурай, якія нівелявала шмат якія этнічныя

36 Марцуль Г.С., Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі: Насельніцтва. Фармаванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў. Беларускае замежжа. Мінск, 1997. С. 51, 55.

37 Дубовец С. Белорусы уходят... // Неман. 1991. № 10. С. 189.

прыкметы. Сялянства, вонкава запазычыўшы атрыбуты гарадскога жыцця (у тым ліку прыстасаваўшыся да расейскай мовы), прынесла ў горад свае звычкі, стэрэатыпы, менталітэт.

Увесь гэты складаны «мікст» меў тэндэнцыю да інтэграцыі, а не дыферэнцыяцыі на субкультурныя элементы, што прывяло да фармавання досыць цэльнай адукацыі на падмурку этнічна-сацыяльнай маргінальнасці. «...Беларусь – значна маналітная ў этнічным сэнсе <...> Агульная танальнасць культуры тут задаецца культурай беларусаў»[38], – сцвярджае даследчык Ю. Шаўцоў, маючы на ўвазе тое, што беларусы ўтвараюць 78% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. З гэтым можна пагадзіцца толькі часткова, беручы пад увагу сур'ёзную карэкцыю «культуры беларусаў» на «савецкасць», якая ў дадзеным выпадку можа быць азначаная як «рафінаваны варыянт» маргінальнасці. Не выпадкам у некаторых навуковых колах на хвалі беларускага адраджэння ўзнікла ідэя аднаўлення беларускай самабытнасці праз культываванне фальклорных форм культуры, якія захавалі яе першапачатковасць, а значыць і сапраўдную «беларускасць».

Умацаванне ў Беларусі асабліва прыкметнага варыянта савецкай культуры цалкам зразумелае. Беларусь перажыла амаль суцэльнае знішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі (а таксама яўрэйскай і польскай інтэлігенцыі) ў часы сталінскіх

38 Шевцов Ю.В. Особенности социально-политической структуры и геополитического положення Беларуси // Belarus-Monitor. Специальный выпуск. 1997, февраль. С. 57.

рэпрэсій і ў гады вайны. На месцы разбуранага гарадскога самабытнага архітэктурнага асяроддзя ўзнікла новае, з савецкай сімволікай, пазбаўленай гістарычных традыцый. Такім чынам, ад канчатковага забыцця сваіх каранёў беларусаў выратавала, як гэта ні парадаксальна, найперш «сама савецкая нацыянальная палітыка»[39], якая вымушана была прымаць вонкавыя атрыбуты роўнасці нацый і дэманстраваць іхні «росквіт».

Асаблівае месца ў сацыяльна-культурным кантэксце Беларусі займала і займае Вялікая Айчынная вайна, якая стала для беларусаў своеасаблівым «гістарычным компасам». Тэма вайны стварала новую стылістыку культурнай прасторы. Дызайн гэтай прасторы фармаваўся пад уплывам шчырых пачуццяў беларусаў, зацікаўленай афіцыйнай прапаганды, мемарыялізацыі падзей вайны, таленавітых твораў найлепшых беларускіх празаікаў В. Быкава, А. Адамовіча, С. Алексіевіч. У выніку тэма вайны была кананізаваная і ўтварыла значны сегмент культуры Беларусі, у тым ліку і палітычнай. Яна кампенсавала невыразнасць нацыянальнай гісторыі Беларусі ў савецкай гістарыяграфіі і дала беларусам магчымасць ідэнтыфікаваць сябе з ваенным подзвігам, партызанскім змаганнем. Афіцыйнай ідэалогіі і прапагандзе гэта прыносіла двайную карысць: па-першае, ідэнтыфікацыя беларускага народа адпавядала савецкай гісторыі, а па-другое, нацыянальныя пачуцці

39 Sahm A., Belarus: Eigenstaatlichkeit auf Widerruf, Beitrag zur Konferenz “Die zweite nationale Wiedergeburt”, Mannheim, 23–25.9.1997; Clem Ralph S., Belorussians, in: Graham Smith (Ed.), The Nationalities Question in the Soviet Union, New York–London 1990. P. 109–122.

(нацыянальны гонар) адрываліся ад этнічных каранёў. У гэтым сэнсе досыць дарэчным уяўляецца ўжыванне тэрміна «партызанскі нацыяналізм». Вобраз Беларусі як «партызанскай» ці «ветэранскай» рэспублікі быў не проста метафарай – яму адпавядаў набор нарматыўных якасцей і ўзораў паводзінаў. Цэнтральнае месца ў ім адводзілася пачуццю няскоранасці вонкаваму ворагу, бясстрашнасці і мужнасці, а таксама прыхільнасці дысцыпліне. Галоўнай сімвалічнай фігурай рабіўся вобраз камандзіра партызанаў – «бацькі», народнага мсціўцы і абаронцы і адначасова бацькі вялікай партызанскай сям'і, якія наладжваў партызанскі быт. Ваенны дыскурс паступова стаў часткай палітычнай ідэалогіі і абавязковым элементам сацыяльнай палітыкі Беларусі, а таксама чыннікам сацыялізацыі некалькіх пакаленняў.

У палітычнай культуры пасляваеннай Беларусі склаўся своеасаблівы тып зносін паміж грамадствам і ўладай, які нібы завяршаў гамеастазіс сістэмы. Правадыры, якія сталі кіраваць кампартыяй і саветамі, былі найчасцей выхадцамі з асяроддзя былых партызанаў ці вайскоўцаў, што забяспечвала ім дадатковую легітымізацыю. Узоры паводзінаў, якія дэманстраваліся новай элітай, адпавядалі апісаным вышэй стандартам. «Хаджэнне ў народ», мяккі патэрналізм, бацькоўскае дбанне з элементамі строгасці, рэкламная пільнасць у дачыненні да «скаргаў і просьбаў працаўнікоў» станоўча ўспрымаліся большасцю насельніцтва Беларусі. Цікава, што гэтыя зносіны адлюстравалі не толькі савецкі досвед узаемадзеяння народа і ўлады, але і шматвяковую традыцыю сялянскага менталітэту.

Немалаважна, што беларуская панавальная эліта не была так дэманстратыўна адмежаваная ад народа «бастыёнамі Крамля», як маскоўская, і не была моцна карумпаваная на тле астатніх рэспублік. Узнік, так бы мовіць, «прыстойны канкубінат» народа і ўлады, які падмацоўваўся адносна паспяховым і стабільным матэрыяльным станам насельніцтва Беларусі[40]. Найбольш класічныя рысы гэты альянс атрымаў у перыяд знаходжання ва ўладзе П. Машэрава (1965–1980), які, да таго ж, спрабаваў праводзіць некалькі больш самастойную палітыку адносна Масквы. Ягоная гібель у аўтамабільнай катастрофе прынесла яму вобраз «нацыянальнага героя».

Шмат у чым са згаданых прычын, а таксама адзначаных вышэй уласцівасцей менталітэту беларусаў у БССР не сфармаваўся значны дысідэнцкі рух. Яго фрагментарныя праявы былі хутчэй вынікам уплываў расейскай, маскоўскай рэчаіснасці, чым уласна выпакутаванага іншавер'я. У якасці адасобленых латэнтных элементаў яны функцыянавалі ў асяроддзі інтэлігенцыі, галоўным чынам творчай, якая жыла ў сталіцы.

40 Некаторае павышэнне матэрыяльнага становішча адзначалася ў другой палове 60-х – сярэдзіне 70-х гг. К таму часу нацыянальны даход БССР павялічыўся амаль у 2 разы, адпаведна значна павялічыліся і тэмпы росту заработнай платы. У 1976 г. у БССР быў дасягнуты сярэднесаюзны ўзровень у выпуску прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва (а сельскагаспадарчай быў вышэйшы ў 1,5 разы). Нягледзячы на зніжэнне ў канцы 70-х гг. усіх вытворчых паказчыкаў, да 1985 г. рэальныя даходы на душу насельніцтва ў Беларусі былі вышэйшыя, чым у цэлым у СССР.

## 3. Пошук ідэнтычнасці на тле транзіту

На рубяжы сярэдзіны 80–90-х гадоў Беларусь, як і іншыя краіны былога СССР, апынулася на ростанях. За гэты час яна перажыла тры культурныя выклікі, кожнаму з якіх адпавядаў свой культурны праект.

### 3.1. Першы культурны праект для Беларусі: нацыянальна-дэмакратычная версія

Першы праект узнік у межах асноўнага канфлікту гэтага перыяду, які можа быць акрэслены як канфлікт паміж нацыянальным і імперскім. Як гэта ні здаецца парадаксальным, для Беларусі ён «толькі ў нязначнай ступені быў народжаны нацыянальнымі матывамі»[41]. У значна большай ступені ён змяшчаў пратэст супраць імперскага цэнтралізму, закрытасці ўлады і перараджэння камуністычна-савецкай бюракратыі, чым заяўку на ўласную дзяржаўнасць і ўвасабленне нацыянальнай ідэі.

Беларусь поруч з іншымі рэспублікамі апынулася ў прасторы канфлікту анаміі, асабліва характэрнага для транзітных краін: упершыню перад яе народам паўсталі пытанні «Што такое Беларусь?» і «Як жыць далей?». У той час толькі дзве палітычныя сілы рэальна канкуравалі ў змаганні за фармуляванне «ідэі для Беларусі» – камуністычная партыя і Беларускі народны фронт

41 Тиммерманн Х. На пути к авторитаризму? // Мировая экономика и международные отношения. 1997. № 7. С. 82.

(БНФ)[42]. Кампартыя мела досыць абмежаваныя рэсурсы для манеўра: яе ідэалагічны набор быў цалкам пазнавальны нягледзячы на вонкавыя навацыі. Таму ньюмейкерам, як яго назваў У. Мацкевіч[43], новай культурнай прасторы і першага постсавецкага праекта для Беларусі з'явіўся З. Пазняк, лідар БНФ. Праект прадугледжваў радыкальнае развязанне асноўнага канфлікту гэтага перыяду – суцэльную незалежнасць Беларусі, «беларусізацыю» грамадства, адраджэнне краіны. Ключавымі словамі нацыянальнай дактрыны БНФ сталі «незалежнасць», «адраджэнне», «свабода», «мова», «культура», а асноўным сімвалічным вобразам – Вялікае Княства Літоўскае. Досыць доўгі час яна была папулярная. Пад яе непасрэдным уплывам было прынята шмат важных заканадаўчых актаў, такія як Закон аб мовах (1990), Закон аб грамадскіх аб'яднаннях (1990), Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце (27 чэрвеня 1990 г.). Завяршэннем гэтай тэндэнцыі пасля вядомых жнівеньскіх падзей 1991 г.[44] стала зацвярджэнне Вярхоўным Саветам БССР пакету пастаноў аб незалежнасці і самастойнасці Беларусі і наданне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі статусу канстытуцыйнага закона.

42 Шырокі грамадскі рух, што ўзнік у 1988 г. на хвалі перабудовы, зрабіў значны ўнёсак у выкрыццё сталінскіх рэпрэсій і ў распаўсюд праўды аб Чарнобыльскай катастрофе. БНФ узначальвае вядомы лідар нацыянальнага адраджэння З. Пазняк.

43 Мацкевич В.В. Белорусская демократия: вопреки очевидности. Минск, 1996. С. 114.

44 У жніўні 1991 г. у верхніх эшалонах улады СССР быў створаны так званы Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП), які ставіў за мэту зняць з пасады Гарбачова і правесці антырэфарматарскі курс.

Безумоўна, працэс суверэнізацыі Беларусі не быў вынікам выключна дзейнасці БНФ. Досыць распаўсюджана меркаванне аб тым, што Беларусь апынулася перад няўмольным фактам вонкавых абставін. Яна вымушаная была дэклараваць незалежнасць, падпарадкоўваючыся «параду суверэнітэтаў», дзейнасці «нацыянальных франтоў» у рэспубліках былога СССР, а таксама абставінам, якія склаліся пасля жнівеньскага путчу і падпісання Белавежскіх пагадненняў. Тым не менш, насуперак устойліваму меркаванню, беларускае грамадства было толькі на першы погляд індыферэнтнае да праблемы незалежнасці і суверэнітэту сваёй краіны. Насамрэч яно мела досыць своеасаблівы погляд на гэтую праблему. Навіна прапанаваных змен выклікала ў беларусаў пэўны ўзровень чаканняў, якія знайшлі супярэчлівае адлюстраванне ў грамадскай свядомасці. Апытанні грамадскай думкі, што ладзіліся ў той час, давалі ўяўленне аб гэтай супярэчлівасці.

У снежні 1991 г. незалежнасць Беларусі і Пагадненне аб стварэнні СНД (у складзе Расеі, Беларусі, Украіны) падтрымалі 69% рэспандэнтаў, адхілілі 10%; у снежні 1992 г. гэта ўхвалялі толькі 42%, а не ўхвалялі 34%. Улетку 1992 г. да выхаду Рэспублікі Беларусь з СССР станоўча ставіліся толькі 30,7%, адмоўна – 52,6%, і гэта на тле таго, што 69% ухвалялі абвяшчэнне незалежнасці Беларусі[45]. З улікам вынікаў сакавіцкага рэферэндуму 1991 г., на якім 82,7% насельніцтва Беларусі выказаліся за захаванне СССР (самы вялікі адсотак падтрымкі сярод неазіяцкіх рэспублік), стала

45 Какой мы видим нашу Беларусь. Мн., 1993. С. 30, 37.

відавочным, што дамінанта грамадскай свядомасці беларусаў схілялася да юніяністцкага тыпу і трактаванне ідэі незалежнасці рэспублікі не выходзіла за межы нейкай аўтаноміі ў складзе СССР.

Гэтая сітуацыя стала вынікам тых шматлікіх гістарычных калізій, гаворка аб якіх ішла ў папярэдніх раздзелах. Непаўнавартасць нацыянальнага развіцця і юніяністцкае мысленне значна абмежавалі магчымасці ажыццявіць праект незалежнага развіцця Беларусі ў нацыяналістычным варыянце Пазняка. Тым не менш хацелася б адразу адзначыць, што гістарычны шанц у БНФ, які меў у пэўны момант высокі палітычны рэйтынг, быў. Толькі варта было памяркоўней і старанней прагназаваць характар перамен, не злоўжываючы аказаным фронту грамадскім даверам.

БНФ жа, наадварот, выбраў тактыку радыкалізацыі нацыяналістычнага боку праекта, абсалютызаваў яго этнічны і культурны кампаненты і тым самым адштурхнуў ад сябе шмат патэнцыяльных прыхільнікаў. Гвалтоўнае культуртрэгерства на тле цалкам прагматычных сацыяльна-эканамічных праблем насельніцтва не магло быць пазітыўна ўспрынята апошнімі. Беларусы – у адрозненне, напрыклад, ад літоўцаў – не гатовы былі трываць эканамічныя цяжкасці ў імя свабоды ці суверэнітэту краіны. Пагатоў ліквідацыя СССР і ўтварэнне дэ-юрэ самастойнай беларускай дзяржавы, а затым СНД згладзілі вострую форму канфлікту паміж нацыянальным і імперскім. Канцэпцыя нацыянальнага развіцця ў варыянце Пазняка паступова страчвала

сваю актуальнасць. Калі раней у грамадскай свядомасці беларусаў існавала небяспека стаць «закладнікамі саюзнага хаосу», то прыканцы 1992 г. з’явілася небяспека апынуцца ў нязвыклай для Беларусі пазіцыі сам-насам са сваімі праблемамі[46].

Беларусь працягвала заставацца ў полі культурнай анаміі. Аднак акцэнты ў ёй змясціліся ад пратэставых, дэструктыўных форм да неабходнасці выбару і канструктыўнай перабудовы культурнай прасторы.

### 3.2. Другі культурны праект для Беларусі: парламенцкая дэмакратыя

Спробу канструявання новай палітычнай прасторы спрабавалі ажыццявіць С. Шушкевіч – выбраны пасля жнівеньскага путчу Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання – і ягоны канкурэнт, старшыня ўрада В. Кебіч. І гэта быў другі культурны праект для Беларусі. Шушкевіч воляй лёсу апынуўся ля вытокаў «новага прышэсця» парламентарызму ў Беларусь. І, нягледзячы на тое, што Беларусь адна з нешматлікіх краін (акрамя яе гэтага не зрабіла толькі Арменія) пасля распаду СССР не правяла датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет, за некалькі гадоў ён зрабіў пэўную трансфармацыю ад савецкага

46 Апытанне беларускай службы «Грамадская думка» ў кастрычніку 1992 г. выявіла, што большасць насельніцтва (55,5%) цягнулася да той ці іншай формы хаўрусу як шляху развіцця Беларусі. 25,6% жадалі ператварыць СНД у новы саюз, 21,5% – стварыць саюз з Расеяй, 8,4% – стварыць Балтыйска-Чарнаморскі Саюз) і толькі 24,0% выбралі для Беларусі шлях нейтральнай дзяржавы. Астатнія рэспандэнты не вызначыліся.

органа ўлады да інстытуцыі парламенцкага тыпу. Шушкевіч меў непасрэднае дачыненне да гэтага працэсу яшчэ і таму, што ён апынуўся кіраўніком дзяржавы.

Ягоны праект грунтаваўся на нацыянальнай «згодзе», задзіночанні ўсіх сіл дзеля выхаду з крызісу і нацыянальна-дэмакратычнага рэфармавання краіны. У нейкі перыяд удалося аб'яднаць розныя палітычныя сілы, стварыўшы на базе самага шырокага грамадскага прадстаўніцтва Антыкрызісны камітэт (сакавік 1992 г.). Аднак занадта несумяшчальнымі аказаліся мэты яго ўдзельнікаў, і ён практычна так і не прыступіўся да працы.

Асноўным канфліктам гэтага перыяду стаў канфлікт паміж рынкам і дэмакратыяй[47], якія ў Беларусі (зрэшты, як і ў шмат якіх іншых постсавецкіх краінах) набыў характар канфлікту паміж дэкларацыяй рэформаў і іх сабатажам на практыцы. У самым пачатку 90-х гадоў у Беларусі была дастаткова спрыяльная грамадская атмасфера для рынкавых пераўтварэнняў у межах агульнай мадэрнізацыі. У снежні 1988 г. 56% апытаных сацыялагічнай службай «Грамадскае меркаванне» выказаліся за ўвядзенне ў краіне інстытуцыі прыватнай уласнасці (25% – супраць); у траўні 1991 г. прыватызацыю лічылі «адзіным магчымым шляхам выхаду з крызісу» 34% рэспандэнтаў, а 25% таксама былі не супраць прыватызацыі, аднак баяліся яе адмоўных вынікаў для народа. Увесну 1992 г. пераход да рынкавай

47 Вайнштейн Г. Посткоммунистическое развитие глазами западной политологии // Мировая экономика и международные отношения. 1997. № 8. С. 140.

эканомікі падтрымлівалі 54,2% жыхароў рэспублікі (а 17,9% былі супраць). Разам з тым 48,6% рэспандэнтаў аддавалі перавагу «больш працягламу, але сацыяльна ўзважанаму пераходу да рынку» (радыкальным і хуткім жадалі яго бачыць 24,9%)[48].

Праект Шушкевіча, які не стаў выверанай канцэпцыяй, а толькі стыхійным ньюмейкерствам, палягаў у падтрыманні рэфарматарскіх прынцыпаў, у недапушчэнні палярызацыі грамадства, у развіцці плюралізму і асноў дэмакратыі з захаваннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Ключавымі словамі гэтага перыяду сталі «рэформы», «рынкавая эканоміка», «лібералізацыя», «згода», «памяркоўнасць». Аднак у працэсе ажыццяўлення праекта прыярытэтнымі сталі не элементы рэформаў, а элементы «згоды». Боязь рэфармавання, жаданне дабіцца згоды як індульгенцыі для апраўдання магчымых негатыўных вынікаў рэформаў стала не толькі непасрэднай праявай спадчыны савецкай калектыўнай безадказнасці, але і адметнай рысай беларускага менталітэту з яго схільнасцю да кансерватызму і нерашучасцю, аднолькава характэрнымі як для народа, так і для прадстаўнікоў эліты.

Да таго ж, канструяванне новай дэмакратычнай прасторы ў духу парламентарызму з доўгатэрміновым узгадненнем правіл і працэдур і заканадаўча аформленымі рынкавымі пераўтварэннямі натыкалася на ліміт часу крызіснага існавання, а таксама на канкуруючы праект прэм’ер-міністра В. Кебіча. В. Кебіч, у

48 Какой мы видим нашу Беларусь. Минск, 1993. С. 5, 7, 15.

адрозненне ад С. Шушкевіча, быў прадстаўніком класічнай «партгосноменклатуры», адлюстроўваў ейныя інтарэсы і меў значную падтрымку ў парламенце з боку фракцыі «Беларусь» (аграрна-прамыслова-камуністычнай большасці).

Ягоны праект больш адпавядаў савецкаму традыцыяналізму. Ён грунтаваўся на дазаваным плюралізме (ў тым ліку датычна СМІ); на наменклатурнай капіталістычнай эвалюцыі і, адпаведна, на абмежаваным удзеле грамадства ў пераразмеркаванні рэсурсаў; на памяркоўным аўтарытарызме, замацаваным у інстытуце прэзідэнцтва[49]; на арыентацыі на падтрымку адэкватнага расейскага лобі. Выкарыстоўваючы рыторыку рэформаў, пэўныя сілы праводзілі «наменклатурную прыватызацыю»; адначасова ў парламенце ўсяляк блакавалася прыняцце законаў, накіраваных на стварэнне прававых асноў рынкавай эканомікі.

Адсутнасць рэальных рэформаў, адзінай нацыянальнай стратэгіі развіцця, непаслядоўнасць у правядзенні антыкрызіснай палітыкі прычыніліся да рэзкага пагаршэння сацыяльна-эканамічных паказчыкаў у краіне і падзення

49 У Беларусі перад прыняццем новай Канстытуцыі актыўна абмяркоўвалася пытанне аб дзяржаўным ладзе рэспублікі. Большасць насельніцтва падтрымлівала форму прэзідэнцкага кіравання – 53,4%, з іх з агаворкамі – 28,4%, а 17,7% у нечым падтрымлівалі, а ў нечым не. (Гл.: Какой мы видим нашу Беларусь. Минск, 1993. С. 37–39.)

ўзроўню жыцця[50]. У той жа час былі адзначаны першыя яўныя прыкметы дыферэнцыяцыі грамадства: з'явіўся невялікі слой прыватных уласнікаў, прадпрымальнікаў, чый дабрабыт моцна кантраставаў з неўладкаванасцю большасці.

Сацыялагічныя апытанні зафіксавалі абвастрэнне канфлікту анаміі. Разбурэнне ранейшых сацыяльных сувязяў, каштоўнасцей, змена статусу для большасці насельніцтва не суправаджаліся прапановай новых сфер удзелу, а выбар як сацыяльнае дзеянне яшчэ не зацвердзіўся ў грамадскай практыцы. У выніку ўзмацніліся такія сімптомы анаміі, як апатыя, няўпэўненасць, пачуццё прыгнечанасці, бесперспектыўнасці, непакой, падазронасць, недавер, агрэсіўнасць. Так, увесну–ўлетку 1993 г. існыя ўмовы жыцця як «нязносныя» і «зусім нязносныя» ахарактарызавалі 50,2% рэспандэнтаў, а чаканне змен да горшага выказалі 47,9% апытаных. У 1993–94 гг. значную частку насельніцтва турбавалі пагаршэнне матэрыяльнага стану (53,4%), рост цэн (87,0%), злачыннасць (40,1%), некампетэнтнасць уладаў (31,6%); 65,5% лічылі, што ў органах дзяржаўнай улады ў той ці іншай ступені распаўсюджаная карупцыя[51].

50 У 1994 г. аб'ём прамысловай вытворчасці ўтвараў 67% узроўню 1990 г., рэальная заработная плата ў параўнанні з 1990 г. знізілася на 41% (гл.: Линг С. Стратегия государства – достойная жизнь народа // Рэспубліка. 1997. 10 июля. № 127. С. 1).

51 Какой мы видим нашу Беларусь. Мн., 1993. С. 60, 62, 65; Цэнтральная газета. 1994, 6 мая. № 52, С. 4.

Такім чынам, сітуацыя, што склалася напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў[52], была вынікам узаемадзеяння двух культурных праектаў – Шушкевіча і Кебіча. Абодва праекты, нейтралізуючы і дэфармуючы адзін аднаго, былі ў рознай ступені скарэктаваныя, але іх так і не здолелі аб'яднаць, хоць абодва – кожны на свой манер – «гулялі» на полі дэмакратыі. У выніку новыя каштоўнасці, якія вызначалі культурны дыскурс перыяду, аказаліся ў значнай ступені дыскрэдытаванымі ў грамадскай свядомасці. Рынак стаў асацыявацца з разбоем, абагачэннем адзінак, карупцыяй, «прыхватызацыяй», мафіяй; дэмакратыя – з недзеяздольнай уладай, гаварыльняй, анархіяй. Да таго ж, яе няўдачы больш звязвалі з парламентам, функцыі якога ўвогуле мала хто разумеў, чым з урадам.

Амерыканская даследчыца С. Тэры тлумачыць сітуацыю, што ўзнікла ва ўмовах канфлікту паміж дэмакратыяй і рынкам, наступным чынам: «Цяжкасці жыцця, выкліканыя радыкальнымі эканамічнымі пераўтварэннямі, умацоўваюць палітычную нестабільнасць. Тая, у сваю чаргу, замінае стварэнню прававой і інстытуцыйнай інфраструктуры прыватызацыі і замаруджвае прыток замежных інвестыцый, што ў выніку спрыяе і працягу посткамуністычнага спаду, і далейшай палітычнай палярызацыі»[53]. Такім стаў і агульны стан у Беларусі, з той толькі розніцай, што радыкальных эканамічных рэформаў яна не зведала, і

52 Пасада Прэзідэнта прадугледжваецца Канстытуцыяй РБ, прынятай 15 сакавіка 1994 г.

53 Sarah M. Terry. Thinking about Post-Communist Transitions: How Different Are They? // Slavic Review. Vol. 52. No. 2. 1993. P. 334.

цяжкасці жыцця насельніцтва былі выкліканы не актыўнымі працэсамі мадэрнізацыі, а пакутлівай бяздзейнасцю, марнаваннем наяўных рэсурсаў. Таму гэта, з аднаго боку, прычынілася да рэзкага непрымання ўлады, а з іншага – не стварыла той крытычнай масы ўласнікаў, якія маглі б абараніць у крызісны момант дэмакратычныя пераўтварэнні.

Працяг посткамуністычнага спаду ва ўмовах функцыянавання слабых дэмакратычных інстытуцый (парламенту, шмат-партыйнасці, свабоды слова і г.д.) прывёў да крызісу экспектацый і настальгіі па мінулым стабільным жыцці ў значнай часткі насельніцтва. Так, у адпаведнасці з апытаннем, праведзеным у сакавіку 1993 г., 48,2% рэспандэнтаў жадалі б вярнуцца да ладу жыцця напярэдадні 1985 г.[54], а каля 30% выступалі за аднаўленне СССР. Рэтраспектыўны рух па шкале каштоўнасцей нёс у сабе пагрозу кансервацыі найбольш устойлівых савецкіх стэрэатыпаў і звужэнне патэнцыйнага рэфарматарскага рэсурсу.

Аднак было б памылковым ацэньваць гэты вынік толькі з песімістычных пазіцый. У галіне транзіталогіі ён вядомы як адзін з тыповых казусаў перыяду постаўтарытарнага пераходу[55]. Найважнейшым у гэтай сітуацыі было высветліць не ступень інертнасці грамадства, а ступень ягонай мабільнасці. З гэтага гледжання сацыялагічныя апытанні дэманстравалі немалы патэнцыял беларускага грамадства нават на тле настальгічных

54 Какой мы видим нашу Беларусь. С. 65.

55 Brzezinski Z. The Great Transformation // The National Interest. № 33. Fall 1993. P. 4.

рэмінісцэнцый. Паводле маніторынгу Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), у 1994 г. побач з 46,3% рэспандэнтаў, якія выступалі за плана-вую эканоміку, 51,0% падтрымлівалі рынкавую[56]. У іншых рэспубліканскіх даследаваннях 37,2% апытаных лічылі, што «эканамічны прагрэс магчымы ва ўмовах развіцця мясцовага самакіравання» (26,6% былі супраць)[57], нават на тле яго слабой эфектыўнасці, якая ўзыходзіла да савецкай традыцыі. Інакш кажучы, у грамадстве паступова ўзнікалі фрагменты новай грамадзянскай культуры ў выглядзе грамадзянскіх ініцыятыў і арганізацый (партый, грамадскіх арганізацый, незалежных прафсаюзаў, сродкаў масавай інфармацыі, даследчых цэнтраў і інш.).

Неабходна заўважыць, што працэс актывізацыі грамадзянскага ўдзелу быў звязаны з асваеннем новай для Беларусі гістарычна-сімвалічнай прасторы, падтрымку якой, акрамя БНФ, забяспечваў С. Шушкевіч. Разам з зацверджанымі ў 1991 г. у якасці дзяржаўных сімвалаў бел-чырвона-белым сцягам і гербам «Пагоня», якія вядуць свой радавод яшчэ ад першых княстваў Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага, культурны кантэкст беларускага грамадства фармаваўся пад уплывам абноўленых гістарычных ведаў, станаўлення нацыянальнай

56 Абрамова О. Менталитет народа Республики Беларусь и итоги парламентских выборов 1995 года // Belarus-Monitor. 1995, май–июнь. С. 22.

57 Эбертс П., Кларк П., Эверт М., Касьяненко А. Перспективы создания гражданского общества в Беларуси: развитие плюрализма на местах в бывшем Советском Союзе. Гомель, 1995.

этналогіі, этнапсіхалогіі, мовазнаўства і іншых, пераважна гуманітарных, дысцыплін.

Лінія дзяржаўнай і нацыянальнай незалежнасці, што ўваходзіла ў культурны праект Шушкевіча, пастаянна канфліктавала з лініяй Кебіча, які дэманстраваў прагматычную мэтазгоднасць шчыльнага хаўрусу Беларусі з Расеяй. Новая сімволіка і пафас незалежнасці былі зразумелыя далёка не ўсім, бо большасць насельніцтва не адчувала дыскамфорту і ў рамках Савецкага Саюза. Да таго ж, пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча шмат у каго асацыявалася з развалам СССР, з залішняй ізаляцыяй былых рэспублік адна ад адной. Таму да каштоўнасцей сумнеўнага кшталту, акрамя «рынку» і «дэмакратыі», дадаліся «незалежнасць» і «суверэнітэт».

Заўважым, што менавіта ў гэты перыяд узнікла дэмаркацыйная лінія з апазнавальнымі знакамі «рынак – дэмакратыя – суверэнітэт» з аднаго боку і «планавая эканоміка – цвёрдая ўлада – адноўлены СССР» з іншага. Яна падзяліла беларускае грамадства на прыхільнікаў рэформаў і прыхільнікаў рэстаўрацыі (альбо мадэрнізатараў і традыцыяналістаў). Па іроніі палітычнай сітуацыі абодва бакі, нягледзячы на дыяметральную супрацьлегласць каштоўнасных арыентацый, у нейкі момант сышліся ў адным і тым жа пункце каардынат, зрабіўшы стаўку на змены. «Час, народ, сітуацыя – усё ў гэты момант патрабавала змен у Беларусі, – пісаў публіцыст і палітолаг А. Майсеня. – Народ

стаміўся, людзі жадалі пачуць новыя імёны, якія далі б ім новую надзею і апору»[58].

Сімвалам гэтых змен стала постаць А. Лукашэнкі. Кожны з бакоў лічыў яго сваім. Шмат у чым менавіта таму на прэзідэнцкіх выбарах у ліпені 1994 г. ён перамог свайго асноўнага саперніка В. Кебіча з велізарнай перавагай – 81% супраць 14,1%.

Прэзідэнцкім выбарам лета 1994 г. папярэднічала прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. У якасці асновы дзяржаўнага ладу зацвярджалася мадэль прэзідэнцкай рэспублікі, якая стала кампрамісам паміж прыхільнікамі парламенцкай і прэзідэнцкай рэспублікі і адначасова данінай «параду прэзідэнталізму», што апанаваў рэспублікі былога СССР[59]. Згодна Канстытуцыі РБ, прэзідэнт з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады і меў значныя паўнамоцтвы. Але і парламент (Вярхоўны Савет) быў надзелены дастатковай уладай. Такі тып дзяржаўнага ладу прадугледжваў звычай (напрыклад, у ЗША) кансэнсусны характар зносін паміж

58 Майсеня А. Дурной пример – другим наука // Народная газета. 1994, 14 июля.

59 Падчас дыскусій пра форму дзяржаўнага ладу ў Беларусі не было моцнага праяўлення грамадскай пазіцыі за прэзідэнцкую ўладу. Шматлікія апытанні паказвалі, што за ўвядзенне пасады Прэзідэнта выказваліся ад 60% насельніцтва ў 1991 г. да 40–56% на працягу 1992–1993 гг., супраць – ад 30% да 35%. Разам з тым, сваіх надзей на паляпшэнне эканамічнай сітуацыі з увядзеннем пасады Прэзідэнта большасць насельніцтва не звязвала. На гэта спадзяваліся, напрыклад, толькі 28,5% працаўнікоў прамысловасці, 41,6% студэнтаў, 23,9% старшыняў сельсаветаў (Гл.: Бабосов М. Кто станет президентом? // Цэнтральная газета. 1994, 6 мая. С. 3.).

парламентам і прэзідэнтам і высокую ступень незалежнасці і адказнасці абедзвюх галін улады.

Бясспрэчна, прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь было сімвалічным эпізодам палітычна-культурнага дыскурсу гэтага перыяду. Ужо само па сабе яе з'яўленне было актам палітычнай культуры, у якім адбіліся гістарычныя традыцыі беларускага народа, ягоная прыналежнасць да Еўропы і прыхільнасць да дэмакратыі. Гэтым актам завяршаўся «падрыхтоўчы клас» беларускай дэмакратыі (абвяшчэнне асноўных дэмакратычных інстытуцый) і пачынаўся новы этап – замацаванне яе інстытуцый.

3.3. Трэці культурны праект: «імператарскае прэзідэнцтва»

Канцэптуальныя напрацоўкі ў транзіталогіі апошніх гадоў уводзяць у даследчыцкі арсенал два ключавыя паняткі – *transition* і *consolidation*. Сэнс першага з іх можа быць растлумачаны як «пераход да дэмакратыі», а другога прыблізна як «замацаванне ці ўсталяванне дэмакратыі»[60]. Па сутнасці, «усталяванне дэмакратыі» прадугледжвае доўгатэрміновую працу ўсіх галін улады, сфармаваных у адпаведнасці з Канстытуцыяй, па будаванні новай канстытуцыйнай прасторы, гатоўнасць грамадства прытрымлівацца ўсталяваных правіл. Ва ўмовах адсутнасці ў насельніцтва Беларусі адпаведнай культуры

60 Вайнштейн Г. Посткоммунистическое развитие глазами западной политологии // Мировая экономика и международные отношения. 1997. № 8. С. 145.

законапаслухмянасці і адначасова наяўнасці звычкі ўладапаслухмянасці, схільнасці да канфармізму асаблівая адказнасць ускладалася на ўладную эліту.

Першыя прэзідэнцкія выбары ўмацавалі значныя паўнамоцтвы датычна ажыццяўлення культурнага праекта за прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкам, які стаў пераможцам у своеасаблівым конкурсе праектаў. Адпаведная заяўка на прэзідэнцкую пасаду была зробленая ім загадзя ў звязку з ягоным дакладам на сесіі Вярхоўнага Савета XII склікання аб антыкарупцыйнай дзейнасці. Вынікам гэтага дакладу стала зняцце Шушкевіча з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета, у чым былі аднолькава зацікаўлены і ягоны даўні канкурэнт Кебіч, і Лукашэнка, які ўбіраўся ў сілу.

Сімвалічнае значэнне гэтага акта, аднак, сягала значна далей простых кадравых перастановак у найвышэйшым эшалоне ўлады і асабістай драмы спікера. Разам з дыскрэдытацыяй Шушкевіча ўзнікала небяспека дыскрэдытацыі і ліквідацыі той культурнай прасторы, адным з аўтараў якой ён быў. Як паказалі пазнейшыя падзеі, гэтак яно і сталася. Палітыка Шушкевіча паступова стала інтэрпрэтавацца як «злачынны нацыяналізм»; Шушкевіч нёс адказнасць за развал СССР (адзін з трох «белавежскіх зуброў»). Вербальныя сімвалы той палітыкі – «памяркоўнасць», «згода», «незалежнасць» – набылі пазней у выкананні Лукашэнкі выключна іранічна-насмешлівае і асуджальнае адценне.

Такім чынам, у культурным праекце Лукашэнкі канцэпцыя Шушкевіча, у тым ліку яе асноўныя элементы – незалежнасць, нацыянальная сімволіка, беларуская мова і, у рэшце рэшт, парламент – заняла месца антытэзы. Разам з тым у ім прысутнічалі запазычанні з праекта Кебіча, якія тычыліся інтэграцыі з Расеяй, аднаўлення былых саюзных сувязяў, а таксама некаторыя пункты аб роўных «умовах для дзяржаўнага і прыватнага сектараў эканомікі». У цэлым уся канструкцыя была досыць эклектычная і папулісцкая; сутнасць праекта, аднак, вызначалі формулы «змаганне з карупцыяй», «вяртанне нарабаванага», «навядзенне парадку», «аднаўленне саюзных сувязяў». Стылістыка праекта, такім чынам, вызначалася змаганнем, рэстаўрацыяй, парадкам.

У сітуацыі эканамічнага крызісу і расчаравання грамадства праект не толькі адпавядаў грамадскім настроям, але і быў адэкватны выканаўчаму майстэрству аўтара. Па-першае, ён адпавядаў настроям большай часткі насельніцтва, якая жадала вяртання да савецкіх, адносна дабрабытных часоў. Па-другое, ён не вымагаў надта складаных мадэрнісцкіх праектаў і рэфарматарскіх намаганняў, тым самым вызваляючы аўтара праекта ад асабістай адказнасці за рэформы. Па-трэцяе, яго ажыццяўленне не вымагала вялікай працы, бо шмат у чым грунтавалася на вядомых нормах і стэрэатыпах паводзінаў, абладжаных па-савецку (ў адрозненне, скажам, ад «шокавай тэрапіі» Бальцэровіча ці лібералізацыі па-гайдараўску). Па-чацвёртае, праект валодаў значнай ідэалагічнай і палітычнай мабільнасцю, бо дазваляў знаходзіць усё новыя і новыя аб’екты

змагання, перакладаючы на іх віну за правалы ў палітыцы, а таксама ўзмацняць кантроль над грамадствам і абгрунтоўваць пашырэнне ўладных паўнамоцтваў неабходнасцю навядзення парадку ў краіне і ўмацавання стабільнасці.

Такім чынам, рэстаўратарскі праект Лукашэнкі быў скіраваны на рэанімацыю савецкага традыцыяналізму і выкарыстанне яго мабілізацыйнага рэсурсу. У звязку з гэтым варта згадаць, што Беларусь была адной з найбольш паспяховых і практычна самай мадэрнізаванай рэспублікай у былым СССР (маецца на ўвазе ўзровень урбанізацыі, адукацыі, індустрыялізацыі і г.д.). Да таго ж, беларускія адметнасці савецкіх традыцый фармаваліся пад уплывам пасляваеннай мадэрнізацыі. Аднак, як у шмат якіх постсацыялістычных краінах, працэс мадэрнізацыі ў Беларусі меў толькі частковы характар: ён не кранаў асноў грамадзянскай супольнасці, не заахвочваў прыватнай ініцыятывы асобы – іншымі словамі, быў «мадэрнізацыяй без прыкмет мадэрнізацыі» (Р. Дарэндорф)[61].

Вяртанне да савецкага традыцыяналізму адначасова рэанімавала і каштоўнасці савецкай мадэрнізацыі з усімі яе кіраўнічымі схемамі. Ва ўмовах аднаўлення колішняй сістэмы зносін, якая грунтавалася пераважна на пазаэканамічным прымусе, адміністраванні, умацаванні ролі дзяржавы, адпадала неабходнасць у дэмакратычных інстытуцыях. Больш за тое, іх вызначанасць у сэнсе грамадскага і палітычнага плюралізму замінала

61 Пантич Д. Конфликты ценностей в странах транзита // Социологические исследования. 1997. № 6. С. 29.

аднаўляць адзіны цэнтр улады і падпарадкоўваць яму ўвесь грамадскі арганізм. Таму ажыццяўленне праекта дэманстравала пастаяннае імкненне да рэдукцыі дэмакратычнай прасторы.




Такім чынам, дэмакратыя і рэтрапраект Лукашэнкі, знаходзячыся ў розных культурных дыскурсах, не маглі не ўступіць у канфлікт. Ён можа быць ідэнтыфікаваны як канфлікт паміж дэмакратыяй і аўтарытарызмам з тэндэнцыяй да таталітарных праяў (гл. схему). Істотная дэталь – гэта тое, што канфлікт паступова радыкалізуецца і тое, што ссоўванне аўтарытарызму да крайняга пункта каардынат выходзіць за межы сутнасці праекта і не адказвае на дэмакратычны ўціск, а толькі адлюстроўвае асабістыя імкненні яго аўтара. Запланаваны як чыста аўтарытарны, праект Лукашэнкі ніяк не ўпісваўся ў межы Канстытуцыі, згодна якой ён быў выбраны

прэзідэнтам і выканання якой ад яго чакалі іншыя галіны ўлады (парламент, канстытуцыйны суд). Іх спробы вярнуць прэзідэнта ў канстытуцыйнае поле не маглі мець поспеху, бо ён працаваў у парадыгме ўласнага праекта, стылістыка якога не прадугледжвала шматлікіх ўзгадненняў і кампрамісаў. Больш за тое, «чысціня» стылю вымагала ліквідацыі гэтых працэдур як чужародных дэмакратычных запазычанняў. Канфлікт паміж дэмакратыяй і аўтарытарызмам развязаўся досыць радыкальна: прэзідэнтам быў прапанаваны новы варыянт Канстытуцыі, у якім разам з вонкавым захаваннем прыкмет дэмакратыі практычна знікалі размежаванне ўладаў, іерархія юрысдыкцыі, а значыць і гарантыя правоў і свабод грамадзян. Адначасова прэзідэнт атрымліваў неабмежаваную прастору для манеўру, вызваляючы сябе ад любых сур'ёзных стрымліванняў і проціваг. Шматлікія міжнародныя эксперты, прыцягнутыя для ацэнкі праекта прэзідэнцкай Канстытуцыі, аднадушна меркавалі, што гэты яе варыянт дае «практычна неабмежаваныя, некантралюемыя правы прэзідэнту ствараць, скасоўваць і пераўтвараць дзяржаўныя органы», «што канстытуцыйныя механізмы адкрыты для маніпуляцый з боку прэзідэнта», што праект усталёўвае «рэжым персанальнай улады» і «канстытуцыйны падмурак для дыктатуры»[62].

Тым не менш ва ўмовах вельмі жорсткага супрацьстаяння галін улады новы варыянт Канстытуцыі быў прыняты на рэферэндуме з нязначнымі касметычнымі «даробкамі»,

62 Основа для диктатуры // Свабода. 1996. № 86. С. 3.

якія надалі яму вонкава больш «добрапрыстойную» форму. Ён цалкам змяняў мадэль палітычнай сістэмы. Калі старая мадэль ідэнтыфікавалася як прэзідэнцкая рэспубліка, то новая асноўнымі параметрамі была бліжэйшая да прэзідэнцыялізму з моцным ухілам у бок персаніфікаванага аўтарытарызму, які «зазвычай стараецца замацаваць знікненне рэспублікі, г. зн. інстытуцыйнай улады, падпарадкаванай безасабовасці і ўсеагульнасці прававой нормы»[63].

Французскі палітолаг і правазнаўца Ж.-Л. Шабо назваў формулу прэзідэнцкага кіравання ў ЗША «імператарскім прэзідэнцтвам»[64], маючы на ўвазе важкасць паўнамоцтваў і ярка выражаную сімвалічнасць фігуры прэзідэнта ў ЗША. Прымаючы гэты вобраз, неабходна ўлічваць, што ключавым словам у ім з'яўляецца «прэзідэнцтва», у якім палягае спецыфіка адной з дэмакратычных інстытуцый з усімі яе атрыбутамі. У выпадку з палітычным рэжымам Беларусі цалкам магчыма выкарыстоўваць гэтую формулу ссоўваючы націск на слова «імператарскае», сэнс якога ў знікненні інстытуцыйных прыкмет дэмакратыі і акцэнтаванні персанальных валявых якасцей кіраўніка дзяржавы.

Такім чынам, у Беларусі не ўдалося забяспечыць *consolidation* выбраных на дэмакратычнай аснове інстытуцый улады. Яна аказалася «змытай адкатнай хваляй» назад, у ранейшы

63 Шабо Ж.Л. Государственная власть: конституционные пределы и порядок осуществления // Полис. 1993. № 3. С. 163.

64 Тамсама. С. 160.

аўтарытарны стан[65]. І гэта адбылося не толькі таму, што галоўны архітэктар культурнай прасторы быў найбольш зацікаўлены ў аўтарытарнай рэстаўрацыі і не ведаў іншага спосабу развязання неадкладных сацыяльна-эканамічных праблем. Але і таму, што такі спосаб быў найбольш прымальны для большай часткі насельніцтва, і таму, што сярод іншых прэтэндэнтаў не знайшлося годнага праекта, як і годнага лідара.

У выніку канстытуцыйных мадыфікацый палітычнай уладай была нібы ўхваленая мадэль адпаведнай палітычнай культуры і праецыюемы ёй тып асобы. Гэта мадэль традыцыяналісцка-падданніцкай аўтарытарнай культуры, арыентаванай на падтрыманне сістэмы, моцнай улады ў традыцыях савецкага этатызму і калектывізму. Аўтарытарны тып асобы, які ўтварае апірышча рэжыму, досыць добра апісаны ў літаратуры[66]. Асноўнымі структурнымі элементамі гэтага тыпу з'яўляюцца арыентацыя на моцную ўладу, падпарадкаванне і прыхільнасць гэтай уладзе, чаканне ад яе заступніцтва, мабілізацыя актыўнасці адпаведна заклікам улады, штодзённы канфармізм і палітычная адмежаванасць, дваядумства, прыхаваная агрэсія.

Ажыццяўленне праекта «імператарскага прэзідэнцтва» Лукашэнкі залежыць як ад унутранага рэсурсу ствараемай ім

65 Huntington S. The Third Wave. Democratization in the Late Twentieth Century. Norman. P. 25.

66 Гл., например: Adorno T. et al. The Authoritarian Personality N.Y., Harper, 1950; Greensten F. Personality and Politics. Princeton, 1987; Гозман Л.Я., Эткинд А.М. От культа власти к власти людей // Нева. 1989. № 7.

сістэмы, так і ад легітымізацыі яе ў грамадстве, бо развязанне канфлікту паміж дэмакратыяй і аўтарытарызмам на карысць аўтарытарызму ёсць вынікам толькі аднаразовага попыту на яго з боку грамадства.

4. Фатальнасць пройдзенага ці канфлікт для будучыні?

Да якога свету будзе належаць Беларусь? Ці пачне беларускае грамадства адлічваць крокі ад аўтарытарызму да дэмакратыі? Якая ідэнтычнасць стане вырашальнай у кансалідацыі беларускага грамадства? Гэтыя пытанні ўяўляюцца складанымі, аднак не фатальна рытарычнымі. Адказы на іх цалкам вызначаюцца тымі трансфармацыямі, якія адбываюцца ў сістэме каштоўнасцей і арыентацый беларускага грамадства.

Паводле вынікаў аднаго з найбольш маштабных даследаванняў каштоўнасных арыентацый, праведзенага прафесарам Мічыганскага ўніверсітэта Р. Інглгартам у 43 краінах свету з ахопам 70% іх насельніцтва, культурна-геаграфічны пункт Беларусі размешчаны амаль у ніжняй частцы квадрата, абмежаванага восямі «каштоўнасці беднасці» (даіндустрыяльнае грамадства) і «рацыянальна-легальныя арыентацыі». Адзначым, што ў момант фіксацыі (апытанне 1990–1991 гг.) яна займала пазіцыю, блізкую да такіх краін, як Расея, Балгарыя, Літва, Латвія[67]. Змены, якія адбыліся апошнім часам, сталі крыніцай

67 Inglehart R. Modification des valeurs, développement économique et évolution politique // Revue internationale des sciences sociales. 1995, septembre. № 145. P. 449.

росту каштоўнаснай дыферэнцыяцыі беларускага грамадства, якая вызначыла агульную сучасную карціну лакалізацыі розных тыпаў палітычнай культуры.

Абапіраючыся на разнастайныя звесткі сацыялагічных даследаванняў апошніх гадоў, можна з некаторай пэўнасцю акрэсліць арэалы распаўсюду існых тыпаў палітычнай культуры і атрымаць агульнае ўяўленне аб магчымых напрамках грамадскіх змен і верагодных канфліктных лініях. У найбольш разгорнутым выглядзе аксіяметрычны зрэз беларускага грамадства і фрагментацыі культуры атрыманы ў межах даследаванняў НІСЭПД. Іх вынікі даюць досыць рэлевантную карціну размежаваных каштоўнасных ліній.

Так, каштоўнасці этатычнага, антырынкавага, ураўняльнага кансерватыўнага парадку («каштоўнасці беднасці»), арыентацыю на ўсялякую інтэграцыю і аднаўленне «вялікай краіны» падтрымліваюць пераважна так званыя «слабыя» сацыяльныя групы (ўзрост ад 50 гадоў і больш; з нізкімі і вельмі нізкімі даходамі і матэрыяльным станам на ўзроўні беднасці або ніжэйшым за сярэдні; адукацыя – да 4-х ці да 8-мі класаў; сацыяльны статус – пенсіянеры, некваліфікаваныя працаўнікі, хатнія гаспадыні, якія жывуць пераважна ў сельскай мясцовасці, найперш у Магілёўскай, Гомельскай, Віцебскай абласцях). Для іх характэрны нецярпімасць, тлумачэнне няўдач вонкавымі акалічнасцямі ці «падкопамі ворагаў», моцныя арыентацыі на дзяржаўную падтрымку, нізкая вартасць такіх каштоўнасцей, як свабода, правы чалавека, дэмакратыя,

свабода выбару перакананняў і паводзінаў, уменне лічыцца з поглядамі іншых[68]. Гэтыя групы сёння ўтвараюць асноўную электаральную базу Лукашэнкі, з'яўляючыся апірышчам ягонага культурнага праекта. Яны ўвасабляюць тып патрыярхальна-падданніцкай культуры.

Другі сацыяльны масіў прадстаўлены досыць шматлікай прамежкавай групай, якая вызначаецца тыпам падданніцкай культуры. Арыентацыі гэтай групы маюць пераважна змешаны і часта супярэчлівы характар: напрыклад, рынкавая эканоміка – і моцны кантроль дзяржавы, правы чалавека – і непрымальнасць апазіцыі, дзеянні якой трэба абмежаваць, і г.д. Гэтую групу пераважна складаюць людзі ва ўзросце паміж 40 і 50 гадамі, з даходамі сярэднімі ці «на мяжы беднасці» і такімі сацыяльнымі статусамі, як працаўнікі сярэдняй кваліфікацыі, частка інтэлігенцыі, службоўцы (перадусім катэгорыя бюджэтнікаў), беспрацоўныя. Асноўныя арыентацыі гэтай групы – лаяльнасць да сістэмы, канфармізм, выжывальнасць, непрыманне радыкальных перамен.

Каштоўнасці іншага характару дэманструюць прадстаўнікі так званых актыўных, лідарскіх груп[69]. Іхнія арыентацыі ідэнтыфікуюцца ў тыпе актывісцка-падданніцкай культуры з тэндэнцыяй да фармавання новай грамадзянскай культуры,

68 Манаев О.Т. По тонкому льду // Белорусская ассоциация фабрик мысли. 1997. Вып. 2. С. 45–50.

69 Злотников Л. Интересы директоров и власти расходятся // Новости НИСЭПИ. 1997. Вып. 2, июнь. С. 26–28.

адной з адметных прыкмет якой з'яўляецца інстытуалізацыя свабоды выбару і адказнасці, у тым ліку адказнасць улады, а таксама законнасць і правы чалавека. Для гэтай групы больш характэрная прыхільнасць да ідэй рынкавай эканомікі і незалежнага дзяржаўнага развіцця.

Аўтары канцэпцыі грамадзянскай культуры, якая забяспечвае стабільнасць дэмакратыі, амерыканскія даследчыкі Г. Алманд і С. Вэрба, падкрэслівалі, што ўніверсальных рэцэтаў яе з'яўлення няма. Аднак яна як «культура памяркоўнасці» прадугледжвае пашырэнне магчымасцей удзелу асобы ў палітычным працэсе, які ніяк не разбурае падданніцкіх арыентацый. Падмурак, на якім яна ўзнікае, гэта «адначасовае развіццё пачуцця нацыянальнай ідэнтычнасці, кампетэнтнасці як у якасці падданага, так і ў якасці ўдзельніка, а таксама сацыяльнага даверу і грамадзянскай супрацы»[70].

З гэтага гледзішча для ідэнтычнасці Беларусі знакавым аказваецца лідарства Лукашэнкі. З аднаго боку, дзейнічаючы ў межах свайго праекта, ён усяляк абмяжоўвае сферу аўтаноміі грамадства, ужываючы «кантрольны пакет акцый» дзяржавы ў сферы грамадзянскіх ініцыятыў замест рызыкоўнага ўдзелу ў адкрытай канкурэнцыі з гэтым грамадствам. Тым самым удзел асобы ў палітычным працэсе звужаецца пераважна да функцый падданага, а значыць знікае і прастора для грамадзянскай супрацы. З іншага боку, Лукашэнка пастаянна

70 Алмонд Г., Верба С. Гражданская культура и стабильность демократии // Полис. 1992. № 4. С. 134.

правакуе «эмацыйную прыхільнасць да сістэмы», (а дакладней да сябе і той сістэмы, якую ён увасабляе) і «адзінства» грамадзян на сімвалічным узроўні. Актыўная трансляцыя і засваенне тыражаваных сімвалаў, іх каштоўнасная пэўнасць прыводзяць да стварэння першага ўзроўню нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтычнасці (няважна, што ляжыць у ягонай аснове – згода ці адмаўленне гэтых сімвалаў). Такім чынам, упершыню за шмат дзесяцігоддзяў Лукашэнка выклікае эфект ідэнтыфікацыі беларусаў на ўзроўні ўласнай дзяржавы. У сітуацыі персаніфікаванага і ў большай ступені адмоўнага вобраза Беларусі ў свеце, псіхалагічнай канфрантацыі шмат з якімі краінамі беларусы пачынаюць усведамляць, што ў іх ёсць свой твар. Вынікі апошняга сацыялагічнага апытання НІСЭПД у межах праекта «Пераадоленне антырынкавых стэрэатыпаў у посткамуністычнай Беларусі» паказалі, што 85,4% апытаных лічаць, што Беларусь павінна быць суверэннай дзяржавай[71]. Гэта нягледзячы на тое, што саюзніцкія чаканні (маецца на ўвазе Саюз Беларусі і Расеі) яшчэ ўплываюць на выбар у стане фармавання. З Саюзам Беларусі і Расеі значная частка насельніцтва дагэтуль звязвае свае спадзевы на паляпшэнне жыцця (паводле розных апытанняў, ад 53,6% да 57,4%[72]). Аднак у сённяшняй сітуацыі яны з'яўляюцца хутчэй механізмам псіхалагічнага камфорту, а таксама адлюстраваным вынікам маніпуляцыйнай палітычнай

71 Злотников Л. Кентавры массового сознания // Белорусский рынок. 1997. № 37. С. 21.

72 Злотников Л. Кентавры массового сознання // Белорусский рынок. 1997. № 37, 22–28 сентября. С. 21; Какой мы видим нашу Беларусь? // 7 дней. 1997. № 42, 18 октября. С. 3.

практыкі, чым сведчаннем рэальнай бездапаможнасці. Пацвярджэннем гэтаму – меркаванні грамадзян аб неабходнай ступені інтэграцыі ў межах Саюза. Яны абмяжоўваюцца сёння эканамічнай інтэграцыяй, агульнай валютай і агульнай аховай меж. Разам з тым, 39,0% падкрэсліваюць нізкую эфектыўнасць Саюза, а 23,0% сцвярджаюць, што такога Саюза наогул няма[73].

Першы досвед дзяржаўнай ідэнтыфікацыі адметны тым, што стварае неабходную ўмову для здзяйснення дэмакратыі, у якасці якой заўсёды выступае дзяржава як спалучэнне дэмасу[74]. Менавіта ў самастойнай дзяржаве на ўзроўні кожнадзённага плебісцыту (Э. Рэнан) могуць развіцца акрэсленыя вышэй каштоўнасныя канкурэнцыі і ажыццявіцца пераход ад «каштоўнасцей беднасці» да «каштоўнасцей мадэрнізацыі і багацця». З гэтага гледжання можна прызнаць правамернасць «прэзумпцыі невінаватасці» Лукашэнкі як лідара, які выкарыстоўвае «наяўныя рэсурсы для развіцця сацыяльнай сферы», «душыць падрыўныя рухі» і «не песціць дэмакратычных тэндэнцый»[75]. Разам з тым, ідэалогія і практыка месіянства і экспансіяніcцкія памкненні беларускага лідара (аб'яднанне славян, праваслаўна-славянскія саюзы, прэтэнзіі на расейскую прастору, актыўнае асваенне вектара ўсходняй палітыкі) нясуць пагрозу размывання складнікаў дзяржаўнай ідэнтычнасці

73 Тамсама.

74 Ян Э. Исследования проблем мира в период и после конфликта «Восток–Запад». М., 1997. С. 268–271.

75 Алмонд Г., Верба С. Гражданская культура и стабильность демократии // Полис. 1992. № 4. С. 134.

Беларусі і працяглага захавання яе *status quo* «нясцверджанай дэмакратыі» ці «гібрыднай дзяржавы» (паўаўтарытарна-паўдэмакратычнай)[76]. На карысць такога сцэнара развіцця падзей сведчыць і адсутнасць у яе істотных дэмакратычных традыцый, і «вяласць» грамадзянскай супольнасці, і ўсё большая інстытуалізацыя таго «працэдурнага мінімуму» дэмакратыі, які выконвае ролю засцерагальнага клапана рэжыму для сусветнай супольнасці і найбольш актыўных грамадскіх груп.

Шэраг даследчыкаў, якія вывучаюць трансфармацыю каштоўнасцей у краінах транзіцыі, выявілі, што з рознай хуткасцю практычна ва ўсіх краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы адбываюцца прыблізна аднолькавыя працэсы змены палітычна-культурных парадыгмаў грамадскай свядомасці[77]. І ў гэтым сэнсе драму Беларусі наўрад ці можна аднесці да разраду безнадзейна-трагічных сюжэтаў.

76 Ванштейн Г. Посткоммунистическое развитие глазами западной политологии // МЭМО. 1997. № 9. С. 152–153.

77 Пантич Д. Конфликты ценностей в странах транзита // Социологические исследования. 1997. № 6. С. 29–31.

Уладзімір Роўда

# Посткамуністычная мафіёзная дзяржава: прыклад Беларусі☆

☆ Па-беларуску тэкст друкуецца ўпершыню. Раней артыкул друкаваўся па-ангельску ў кнізе пад рэдакцыяй Балінта Мадзяра “Stubborn Structures: Reconceptualizing Postcommunist Regimes”, якая з’явілася ў 2019 годзе ў выдавецтве Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта.



## Анатацыя

*У фокусе артыкула месціцца тэзіс аб набліжэнні сучаснай Беларусі да тыповай мафіёзнай структуры – мафіёзнай дзяржавы. Аўтар прапануе тлумачэнні на розных узроўнях – вонкавым і ўнутраным. Асаблівае значэнне мае вонкавы ўплыў – экспартаваная з Расеі знявага да прававой дзяржавы і наогул моцны аўтарытарны ўплыў усходняй суседкі цягам апошніх стагоддзяў. Да ўнутраных чыннікаў, што прывялі да стварэння мафіёзнай дзяржавы, аўтар адносіць слабасць мясцовага нацыянальнага руху, у прыватнасці нацыянал-камунізму за савецкім часам. Сукупнасць усіх чыннікаў вызначылі да ўсяго і спецыфіку беларускай мафіёзнай мадэлі дзяржавы: перавагу дзяржаўнай уласнасці, адсутнасць партыі ўлады і слабую ролю нацыянальнага папулізму, які быў заменены папулізмам сацыяльным. Нават агульныя рысы класічнай мафіёзнай дзяржавы маюць мясцовы каларыт: развіццё патрон-кліентэлізму і выкарыстанне дзяржаўнай ідэалогіі, каб увекавечыць уладу А. Лукашэнкі і забяспечыць яе пераемнасць. Аднак, не зважаючы на пэўную адметнасць, перспектывы ўтварэння асаблівай беларускай мафіёзнай дзяржавы слабыя: увогуле яна асуджаная на развіццё ў межах расейскай палігархіі.*

## 1. Уступ. Палітычная сістэма Беларусі

Важнай асаблівасцю камуністычнага этапа развіцця БССР была слабасць нацыянал-камунізму. Яна перашкодзіла станаўленню і развіццю Рэспублікі Беларусь у якасці незалежнай

дэмакратычнай дзяржавы, але не зрабіла гэты праект цалкам немагчымым. На карысць гэтага сведчаць еўрапейскае геаграфічнае месцазнаходжанне Беларусі, адносна развітая індустрыйная эканоміка, у асноўным урбанізаванае грамадства і іншая (не расейская і не савецкая) гісторыя. Ад пачатку ўзнікнення дзяржаўнасці на землях Беларусі і да канца XVIII ст. краіна належыла да заходняй, а не ўсходне-хрысціянскай цывілізацыі. Гэта праяўлялася ў дамінаванні ўніяцтва на землях Беларусі да XIX ст.; верацярпімасці; падзяленні духоўнай і свецкай улады; вяршэнстве права, якое праходзіла чырвонай ніткаю праз Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.; развіцці мясцовага самакіравання, заснаванага на магдэбургскім праве; развіцці прадстаўнічага кіравання з канца XV ст.; фармiраванні ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай інстытутаў шляхецкай дэмакратыі. Еўрапейскі пласт гісторыі Беларусі не знік. Ён дасюль адлюстроўваецца ў каштоўнасных арыентацыях беларускіх грамадзянаў. Пра гэта сведчаць дадзеныя сацыялагічных даследаванняў амерыканскай паліталагіні М. Кнут. Аўтаркай працы былі разгледжаны адказы рэспандэнтаў на пытанне аб іх стаўленні да меркавання, што "дэмакратычная сістэма не ідэальная, але ўсё роўна пераўзыходзіць усе іншыя формы праўлення. Як высветлілася, толькі 58,9% расійскіх рэспандэнтаў падзяляюць такі пункт гледжання, у той час падтрымка сярод грамадзянаў Беларусі і Ўкраіны складае 80,8% і 76,3% адпаведна. Гэта кажа пра тое, што палітычная

культура ў Расіі з'яўляецца менш дэмакратычнай, чым у Беларусі ды ва Ўкраіне".[1]

Не зважаючы на безумоўную моц, савецкія традыцыі не былі на землях Беларусі адзінымі і безальтэрнатыўнымі. Як высветлілі брытанскія навукоўцы С. Уайт і Я. Макалістэр, якія займаюцца параўнальным аналізам адносін да палітычнай сістэмы грамадзянаў Беларусі, Украіны, Расіі і краін Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы, выразных прасавецкіх арыентацый у пераважнай большасці беларускіх грамадзянаў не было знойдзена. Для мэтаў даследавання яны выкарыстоўвалі ацэнку рэспандэнтаў свайго ранейшага (камуністычнага) палітычнага ладу, цяперашняга палітычнага рэжыму і яго магчымага стану праз пяць гадоў. У 2003 г. навукоўцы папрасілі рэспандэнтаў паставіць балы ад +100, што азначае найвышэйшы паказчык, да -100 – найгоршая ацэнка. Беларусы паставілі больш нізкія балы савецкай сістэме (65), чым украінцы і расійцы (75), што супярэчыць сталаму меркаванню некаторых даследчыкаў пра тое, што ў савецкай Беларусі найбольш поўна былі ўвасоблены ў жыццё перавагі камуністычнага ладу.[2]

1 Magen Knuth, Russia, Ukraine, and Belarus: A Comparative Study on Political Culture and Democratization Success, Chicago, Midwest Political Science Association Conference 2004, 24-27.

2 Steven White and Ian McAllister, "Patterns of Political Culture" in Post-communist Belarus in Search of Direction ed. by S. White and E. Korosteleva, London: Rowman & Littlefield, 2004, 21-22.

Усё гэта азначае, што пасля распаду СССР перад Рэспублікай Беларусь адкрываліся дзве альтэрнатывы: першая магла нас вярнуць у Еўропу, яна таксама прадугледжвала дэмакратызацыю склалай палітычнай сістэмы і лібералізацыю эканомікі. Другая несла пагрозу страты яшчэ кволай незалежнасці і растварэння ў бязмежным расійскім імперскім свеце. Вырашальную ролю ў далейшым выбары шляхоў развіцця адыгралі эліты.

Для В. Кебіча, які займаў пасаду старшыні Савета Міністраў (вышэйшую дзяржаўную пасаду) у 1990 - 1994 гг. стаўленне да суверэнітэту дзяржавы было складаным і супярэчлівым. Нягледзячы на тое, што яго подпіс стаіць пад тэкстам дакумента аб роспуску СССР, падпісанага ў Віскулях 8 снежня 1991 г., для гэтага палітыка галоўным было аднаўленне гаспадарчых сувязяў з былымі рэспублікамі Савецкага Саюзу, і ў першую чаргу з Расіяй. У сітуацыі вострага эканамічнага крызісу, выкліканага вывадам з абарачэння расійскага рубля ў краінах СНД з лета 1993 г., для прэм'ера адзіным выйсцем са становішча было далучэнне Рэспублікі Беларусь да рублёвай зоны Расійскай Федэрацыі. Гэтая вельмі небяспечная для незалежнасці дзяржавы мера так і не была рэалізаваная, таму што В. Кебіч прайграў прэзідэнцкія выбары 1994 г. свайму галоўнаму апаненту - былому дырэктару саўгаса А. Лукашэнку, які выступаў пад адкрыта сацыял-папулісцкімі лозунгамі, у сітуацыі *атамізацыі элітаў*, калі і "партыя ўлады", і апазіцыя перажывалі глыбокі раскол.

Беларусь сур'ёзна адставала ад суседніх краінаў па тэмпах эканамічных рэформаў, яе кіруючы клас быў не гатовы даператварэння ўлады ва ўласнасць. Замест гэтага беларускія чыноўнікі, як у добрыя старыя савецкія часы, выкарыстоўвалі дзяржаўную ўласнасць для асабістага ўзбагачэння. Праблема *звычайнай карупцыі* выйшла на першы план. У крытычнай сітуацыі, калі апытанні грамадскай думкі сведчылі, што "сярод найбольш важных задачаў, якія стаяць перад краінай, на першае месца насельніцтвам была пастаўлена барацьба з карупцыяй і мафіяй, на другое - барацьба з інфляцыяй і павышэнне коштаў, на трэцяе - навядзенне парадку", надзвычай актыўны экс-кіраўнік парламенцкай камісіі па барацьбе са злоўжываннямі ўладай мог атрымаць перамогу над канкурэнтамі.[3]

Пэўным палітычным дасягненнем В. Кебіча было тое, што пры ім ўзнікла так званая *дэфектная дэмакратыя*, паводле тэрміналогіі палітолага Х. Мунка.[4] Прэзідэнцкія выбары 1994 г. ён правёў, амаль не адступаючы ад нормаў свабоднага і справядлівага волевыяўлення грамадзянаў, што зафіксавалі ўсе назіральныя камісіі, у тым ліку АБСЕ. У адрозненне ад свайго галоўнага апанента на першых выбарах кіраўніка дзяржавы, А. Лукашэнка пасля 1996 г. не лічыў неабходным лічыцца з меркаваннем еўрапейскіх назіральнікаў. Ніводнае электаральнае спаборніцтва ў нашай краіне не было прызнана імі *свабодным*

3 Первые президентские выборы в Республике Беларусь: основные итоги, Минск, NCSI "Восток-Запад", 1994, 50.

4 Gerardo Munck, Measuring Democracy: A Bridge between Scholarship and Politics, Baltimore, The Johns Hopkins University Press, 2009, 158.

*і справядлівым*. Ужо адзін гэты факт дае падставу лічыць, што характар палітычнага рэжыму ў Беларусі нельга называць дэмакратыяй, няхай нават і *дэфектнай*.

Беларускі прэзідэнт, які ўжо дваццаць два гады аднаасобна кіруе дзяржавай, не мог абмежавацца і гібрыднымі мадэлямі арганізацыі палітычнай сістэмы, спалучаючы элементы дэмакратыі і аўтарытарызму. З часу канстытуцыйнага перавароту 1996 г. А. Лукашэнка ўзяў курс на трансфармацыю Беларусі ў султаністкую сістэму, аналагі якой можна знайсці ў постсавецкіх дзяржавах Цэнтральнай Азіі і амаль дасягнуў поспеху да выбараў 2010 г. Тады за краты трапілі амаль усе кандыдаты ад апазіцыі. Пасля вызвалення лідараў апазіцыі, апошнім з якіх быў М. Статкевіч, які выйшаў з турмы ў 2015 г., адбылася мінімальная лібералізацыя рэжыму. Яна закранула толькі адну рысу: стан правоў чалавека, але не закранула характару ўлады, ступені плюралізму, ролі ідэалогіі і ступені палітычнай мабілізацыі. Больш падрабязна пра прычыны і асаблівасці султаністкай трансфармацыі палітычнай сістэмы Беларусі можна прачытаць у артыкуле аўтара дадзенага тэксту.[5]

У асноўным султаністкі характар палітычнага рэжыму дазваляе нам таксама адносіць Беларусь да *мафіёзных дзяржаваў*. Самай важнай рысай султанізму, у адпаведнасці з вядомымі амерыканскімі палітолагамі Х. Лінцам і А. Стэпанам, з’яўляецца

5 Uladzimir Rouda, “Belarus: Transformation from Authoritarianism towards Sultanism” in Baltic Journal of Political Science, Vilnius 2012, no 2, 64–79.

“у вышэйшай ступені персаналісцкі характар улады”.[6] Гэтая асаблівасць нічым не адрозніваецца ад такой рысы мафіёзнай дзяржавы, як той, што ўлада ў ім належыць *палітычнай сям'і*. У нашым выпадку, сям'і А. Лукашэнкі, які раней за расійскага прэзідэнта У. Пуціна стаў кіраваць дзяржавай мафіёзнымі метадамі. Ён перамог В. Кебіча, улічваючы важную роль, якую мела ў грамадскай свядомасці беларусаў, праблема *звычайнай карупцыі*. Аднак адразу ж ператварыў барацьбу з гэтым злом у сілу, якая займае верхнюю пазіцыю ў пірамідзе ўлады. Барацьба з карупцыяй выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца палітычнай сям'ёй А. Лукашэнкі для ліквідацыі з палітычнай і эканамічнй арэны ўсіх небяспечных канкурэнтаў. У выніку, яна сур'ёзна аслабіла бюракратыю, прывяла да зніжэння канкурэнтаздольнасці кіруючых кадраў як у цэнтры, так і на месцах. У доўгай перспектыве барацьба садзейнічае дэзінтэграцыі кіруючай эліты і можа стаць прычынай падзення дзейнага рэжыму.

Безумоўна, ёсць і такія рысы, якія адрозніваюць нашу краіну ад іншых класічных прыкладаў мафіёзнай дзяржавы, але іх няшмат і яны будуць дэталёва прааналізаваныя ў асобным раздзеле.

6 Juan Linz and Alfred Stepan, Problems of Democratic Transition and Consolidation. Southern Europe, South America and Post-Communist Europe, Baltimore and London: The Johns Hopkins University Press, 1996, 45.

2. Унутраныя і знешнія прычыны, якія прыводзяць да ператварэння Рэспублікі Беларусь у мафіёзную дзяржаву.

Як вынікае з уступу характар каштоўнасных арыентацый, якімі кіраваліся беларускія грамадзяне ў сярэдзіне 90-х гадоў, меў супярэчлівы характар. Гэта адкрывала перад краінай два шляхі далейшага развіцця. З аднаго боку, наша маладая дзяржава магла пайсці па еўрапейскаму шляху. Для гэтага трэба было правесці ліберальныя рэформы эканомікі і дэмакратызацыю палітычнай сістэмы. З іншага боку, маячыла пагроза страты дзяржаўнасці і інкарпарацыі ў склад Расіі. За дадзенымі альтэрнатывамі стаялі цалкам канкрэтныя палітычныя сілы. Еўрапейскі шлях развіцця на выбарах 1994 г. найбольш паслядоўна абараняла Партыя БНФ і яе лідар - З. Пазняк. Да такога ж сцэнару схіляліся і сілы, якія падтрымлівалі на тых выбарах былога спікера парламенту - С. Шушкевіча. Расійскую карту адкрыта разыгрываў былы прэм’ер В. Кебіч. Перамог жа ў 1994 г. мала каму вядомы палітык-папуліст А. Лукашэнка. Яго вядомы польскі публіцыст А. Міхнік справядліва называў не “маскоўскай марыянеткай, але савецкай лялькай”.[7]

Гэта значыць, у нашай краіне ў той час перамаглі савецкія каштоўнасці, адбыўся адкат назад, да часоў Савецкага Саюза. Перамога савецкага сцэнара развіцця Беларусі мела пэўныя ўнутраныя прычыны, да якіх варта адносіць наступнае. Па-першае, пад уплывам расчаравання большай часткі

7 Gazeta Wyborcza, № 279, 1996.

насельніцтва ў расійскіх ліберальных рэформах і тамтэйшых рэфарматарах у грамадскай свядомасці да 1993 г. сфармаваўся антыдэмакратычны трэнд. Ён быў звязаны не з аб'ектыўнымі цяжкасцямі пачатковага этапу перахода да рыначнай эканомікі, як гэта было ў Расіі ці ва Ўкраіне. У Рэспубліцы Беларусь эканамічны крызіс быў вынікам адсутнасці рэформаў сацыялістычнай мадэлі. Аднак простыя людзі разумелі ўсё інакш. Улада ў нашай краіне ніколі не знаходзілася ў руках дэмакратаў, але і З. Пазняку і С. Шушкевічу было няпроста растлумачыць гэта сваім выбаршчыкам. Адна толькі прыналежнасць да дэмакратычнага лагеру рабіла іх непапулярнымі, калі не адказнымі за той цяжар, які выпаў на долю мільёнаў простых людзей. Спрацоўвала і кампанія паклёпу ў іх адрас з боку СМІ, якія кантраляваліся ўрадам В. Кебіча.

Па-другое, Беларусь належыла да краін так званай *позняй мадэрнізацыі*, у якіх індустрыялізацыя, урбанізацыя і звязаныя з імі жыццёвыя даброты прыйшлі адносна нядаўна: у 60-70 гады XX ст. пры поўным панаванні камуністаў. Іншымі словамі, савецкія каштоўнасці яшчэ карысталіся папулярнасцю ў значнай часткі насельніцтва. Гэта не ўлічвалі ў сваіх выбарчых платформах многія нацыянал-дэмакраты. Таму варта пагадзіцца з меркаваннем амерыканскай даследчыцы К. Міхалiскі, якая адзначае: "Такая ж самая маральная сіла, якая зрабіла З. Пазняка самым бясстрашным апанентам камуністычнага рэжыму, ператварыла яго ў занадта рэзкага і крайняга для беларускага

густу".[8] Калі казаць пра С. Шушкевіча, то, на наш погляд, ён страціў маральнае права быць лідарам дэмакратычных сілаў Беларусі ў 1992 г., калі, быўшы спікерам парламенту, адмовіўся ўхваліць ініцыятыву аб рэферэндуме аб роспуску Вярхоўнага Савета і правядзенні датэрміновых выбараў. На карысць дадзенай ініцыятывы тады было сабрана больш за 500 тысяч подпісаў грамадзянаў. Усё гэта прывяло да расколу дэмакратычных сілаў, пераадолець які было немагчыма.

Па-трэцяе, Беларускі народны фронт, з'яўляючыся галоўнай сілай апазіцыі, недаацаніў палітычнага значэння лозунга барацьбы з карупцыяй. Ён дазволіў перахапіць ініцыятыву крытыкі Савета міністраў у гэтак балючай для яго сферы мала каму вядомаму дэпутату А. Лукашэнку, які выкарыстаў антыкарупцыйны даклад у якасці грознай асабістай зброі ў барацьбе і з урадам, і з апазіцыяй. Даклад С. Антончыка ад фракцыі БНФ пра злоўжыванні ўладай у структурах адміністрацыі прэзідэнта прагучаў з вялікім спазненнем (снежань 1994 г.), калі пытанне аб уладзе было ўжо вырашана, і таму не выклікаў чаканага палітычнага эфекту. Цалкам верагодна, што своечасовая ініцыятыва Фронту ў гэтым пытанні прадухіліла б хуткую трансфармацыю антыкамуністычных папулісцкіх настрояў у антынаменклатурны і антыдэмакратычны папулізм, ментальную аснову ўлады А. Лукашэнкі.

8 Kateline Mihalisko, "Retreat to Authoritarianism" in Dawisha K. and Parrott K. eds. Democratic Change and Authoritarianism Reaction in Russia, Ukraine, Belarus and Moldova, Cambridge, University Press, 1998, 240.

Такім чынам, ніводная з унутраных прычынаў вяртання ў часы СССР адной з яе былых рэспублік не мела аб'ектыўна-заканамернага характару, тым больш "жалезнай неабходнасці, абыйсці якую было немагчыма", як лічыць беларускі палітолаг В. Карбалевіч.[9] Гэты набор прычынаў насіў хутчэй суб'ектыўны і сітуацыйны характар (яны працавалі толькі ў пэўнай сітуацыі, якая ўзнікла цалкам выпадкова).

Значна больш важную ролю ў прыходзе А. Лукашэнкі да ўлады і яе кансалідацыі адыгралі знешнія фактары. З аднаго боку, адсутнічала хоць якая-небудзь увага да праблемаў Беларусі з боку ЗША і дзяржаваў, якія цяпер прынята называць "старымі краінамі-чаліцамі Еўрасаюза".[10] Для іх Беларусь была новай постсавецкай дзяржавай, нягледзячы на еўрапейскую гісторыю да канца XVIII ст., выгаднае геапалітычнае становішча і пэўны ракетна-ядзерны патэнцыял. Варта сказаць, што толькі апошняя акалічнасць цікавіла тады дэмакратычны Захад, які настаяў на вывядзенні ракетаў з тэрыторыі РБ на тэрыторыю РФ пад расійскія, брытанскія і амерыканскія гарантыі суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці. Беларусь, а таксама Ўкраіна і Казахстан выканалі гэтыя ўмовы. Аднак інкарпарацыя Крыма ў

9 Валерий Карбалевич, "Путь Лукашенко к власти", Белоруссия и Россия: Общество и государство, Москва, Права человека, 1998, 246-251.

10 Пра важнасць знешняга ўплыву дэмакратычных краінаў для пачатку працэсу дэмакратызацыі пішуць вядомыя палітолагі С. Лявіцкі і Л. Уэй. Яны таксама звяртаюць увагу на яго адсутнасць у Беларусі і іншых краінах былога СССР. Выключэннем сталі толькі краіны Балтыі. // Steven Levitsky and Lukan Way, Competitive Authoritarianism: The Emergence and Dynamic of Hybrid Regimes in the Post-Cold War Era, Cambridge, University Press, 2010.

склад Расіі і ўсё яшчэ няспынная агрэсія Расіі супраць Украіны сведчаць, што расійскія гарантыі - гэта пустыя словы і цяжка сказаць, як павядзе сябе Расія ў будучыні ва ўмовах крызісу ў адносінах паміж РБ і РФ. У любым выпадку, у сярэдзіне 90-х гадоў адсутнічалі нават намёкі на тое, якім чынам павінна развівацца палітычная сістэма Беларусі.

Адсутнасць уплыву Захаду на беларускую сітуацыю адразу ж была кампенсаваная ўплывам з боку Расіі. Расійскае кіраўніцтва не палохала тая акалічнасць, што А. Лукашэнка спрабаваў пазіцыянаваць сябе як савецкага кіраўніка. Яно імкнулася да пашырэння ўласнай тэрыторыі ўжо ў сярэдзіне 90-х і лічыла вельмі перспектыўнай ідэю беларускага кіраўніка аб стварэнні саюзнай дзяржавы дзвюх краін, як першага этапа аднаўлення СССР. Гэтыя ідэі А. Лукашэнка выказваў, яшчэ не быўшы прэзідэнтам Беларусі.[11]

Расійскае кіраўніцтва выкарыстала інтэграцыйныя ідэі Мінска, перш за ўсё, навязаўшы нашай краіне дамову аб сумеснай абароне. На тэрыторыі Беларусі былі разгорнутыя ваенныя базы суседняй дзяржавы. У 1996 г. расійскі і беларускі бакі падпісалі пагадненне аб стварэнні так званай саюзнай дзяржавы, што стварыла сістэму эканамічных прэферэнцыяў для беларускага партнёра. Як адзначае беларускі палітолаг В. Сіліцкі: “У цэлым суму штогадовых расійскіх датацыяў беларускай эканоміцы ў

11 А. Лукашэнка нагадаў пра гэта ў сваім выступе перад дэлегатамі Ўсебеларускага народнага сходу 22 чэрвеня 2016 г. // Александр Лукашенко “Сила в движении!”, Беларусь Сегодня, № 118, 23. 06. 2016.

перыяд 1997-1998 гг. можна ацаніць у суму 1,5-2 млрд. долараў… Накладаючыся адзін на другі, розныя аспекты беларуска-расійскай інтэграцыі ператварылі яе ў гульню ў адныя вароты, пры якой эканамічны рост у Беларусі рабіўся магчымым дзякуючы запаволенаму росту ў самой Расіі. З аднаго боку, нерэфармаваная беларуская эканоміка апынулася ў стане прадэманстраваць хуткі рост выключна дзякуючы самаахвярнасці Расіі, якая брала вялікія дзяржаўныя пазыкі, пакутавала ад дэфіцыту бюджэту, спісвала даўгі і адмаўлялася ад атрымання мытных выплатаў. З іншага боку, пакуль беларускія ўлады субсідыявалі сваю прамысловасць, расійскія прадпрыемствы, якія выраблялі аналагічныя тавары, перажылі балючую рэструктурызацыю.[12]

Беспрэцэдэнтная расійская эканамічная падтрымка дазволіла А. Лукашэнку кансалідаваць аўтарытарны рэжым унутры краіны. У лістападзе 1996 г. ён правёў канстытуцыйны рэферэндум, які дазволіў яму адкінуць прэзідэнцкую рэспубліку і замяніць яе суперпрэзідэнцкай. Дадзены плебісцыт, які не пакідаў каменя на камені ад нормаў законнасці, быў прызнаны толькі кіраўніцтвам Расіі, якое павінна падзяліць усю адказнасць з аўтарамі праекта за канцэнтрацыю ўсёй улады ў Беларусі ў руках палітычнай сям'і А. Лукашэнкі. Другім не менш важным адрасатам дадзенай палітыкі Крамля стала само кіраўніцтва Расіі. Беларускі прэзідэнт стаў аспрэчваць лідарскі патэнцыял Б. Ельцына. У канцы 90-х. гадоў ён здзяйсняў рэгулярныя паездкі па рэгіёнах Расіі, імкнучыся стварыць уражанне

12 Віталь Сіліцкі, "Эканамічная палітыка Лукашэнкі", Беларуска-расійская інтэграцыя Аналітычныя артыкулы, Мінск, Энцыклапедыкс, 2002, 65.

больш надзейнага прэтэндэнта на выкананне ролі лідара *палігархічнай сістэмы* РФ, чым хворы расійскі прэзідэнт. Такія спробы спыніліся толькі ў 1999 г., калі Ў. Пуцін нечакана для беларускага прэзідэнта, атрымаў прызначэнне ад Б. Ельцына.

Прыход У. Пуціна да ўлады прывёў да рацыяналізацыі расійска-беларускіх эканамічных адносінаў, але лібералізацыі эканомікі ці палітычнай сістэмы не настала, таму што расійскі лідар разумеў, што гэта непазбежна прывядзе да паслаблення ўплыву, узначаленай ім *палігархіі* на Беларусь. Ён, на нашу думку, выбраў стратэгію павольных, але дакладных крокаў у адносінах да свайго беларускага партнёра, накіраваных на задушэнне Беларусі ў расійскіх сяброўскіх абдымках. Разумеючы, што А. Лукашэнка не павернецца тварам на Захад, што было б выратаваннем для Беларусі, ён паспрабаваў гарантаваць перавагі Расіі ў нашай краіне, адгарадзіўшы яе ад іншых эканамічных рэсурсаў, акрамя тых, што паступаюць з РФ. Гэтым мэтам служыць так званы Еўразійскі эканамічны саюз. У ідэальнай мадэлі Ў. Пуціна ў Беларусі павінен быў скласціся і ўмацавацца варыянт цалкам залежнай ад Расіі палігархічнай сістэмы, які не пакідаў месца нават для *аўтаномнай беларускай палігархіі* на чале з А. Лукашэнкам. Праект вылучэння асаблівых прэферэнцыяў для беларускага лідара каштаваў расійскім падаткаплацельшчыкам у 2007 як мінімум 14 мільярдаў долараў ЗША. Прэферэнцыі павялічваліся аж да 2015 г.[13]

13 Встреча Путина с членами правительства Российской Федерации (стенографический отчёт) в Беларускія навіны 15.01.2007. http://www.naviny.by/rubrics/politic/2007/01/15/ic_articles_112_149358

Аднак рэалізацыя вышэйпаказанага праекта была прыпыненая ў 2015 - 2016 гг. з-за глыбокага крызісу, у які трапіла расійская эканоміка. Гэта стварыла пэўныя магчымасці для А. Лукашэнкі дзейнічаць самастойна. Аднак, ён імі пакуль не скарыстаўся, паколькі, замест умацавання супрацоўніцтва з далёкімі Кітаем і Пакістанам, трэба было развярнуцца тварам да краін Еўрасаюза і да Ўкраіны. У гэтым пытанні якраз і праяўляецца залежнасць беларускага лідара ад створанага ім і падтрыманага Расіяй амаль султанісцкага палітычнага рэжыму, аслабіць які галава беларускай палітычнай сям'і не ў стане.

Такім чынам, не ўнутраныя супярэчнасці станаўлення і развіцця постсавецкай дзяржаўнасці ў Беларусі прывялі да ўзнікнення ў нашай краіне ў сярэдзіне 90-х гадоў панавання палітычнай сям'і А. Лукашэнкі, а знешнія чыннікі. Перш за ўсё, варта адзначыць адсутнасць у нашай краіне ўплыву дэмакратычнага Захаду, што яшчэ ў тыя гады было выкарыстана кіраўніцтвам Расіі для стварэння і паступовай кансалідацыі султанісцкага палітычнага рэжыму і залежнай толькі ад Расіі сістэмы палігархіі.

3. Правы ўласнасці ў мафіёзнай дзяржаве Беларусь

Перш за ўсё, варта сказаць пра адносіны да ўласнасці, якія сур'ёзна адрознівалі нашу дзяржаву ад класічных мафіёзных сістэмаў. Пра тое, што адсутнасць радыкальных рэформаў сацыялістычнай эканомікі паўплывала на крушэнне ўрада В. Кебіча сказана вышэй. Пасля прыходу да ўлады А. Лукашэнка ўзяў курс на ажыццяўленне сацыял-папулісцкай эканамічнай

праграмы, у аснове якой было захаванне дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

На думку былога старшыні Нацыянальнага банка Беларусі С. Багданкевіча, “беларускія дасягненні былі забяспечаны без колькі-небудзь сур'ёзных сацыяльных узрушэнняў, пры дапамозе вяртання да праверанай савецкай практыкі метадаў цэнтралізаванага кіравання ў межах правядзення ярка выяўленай сацыяльна-эканамічнай палітыкі (*сацыял-папулізму* - заўв. аўт.). У адрозненне ад іншых краінаў з пераходнай эканомікай, беларуская дзяржава захавала за сабой просты кантроль прыкладна за 75-80% эканомікі”.[14] Як адзначыў А. Лукашэнка ў сваім выступе на Ўсебеларускім народным сходзе ў чэрвені 2016 г., “у цяперашні час пад аператыўным кіраваннем міністэрстваў і канцэрнаў знаходзіцца 1005 арганізацыяў, якія складаюць амаль палову (50% - заўв.аўт.) чыстых актываў эканомікі”.[15] Па дадзеных Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця за 2015 г. у Беларусі дзейнічала 25-30% прадпрыемстваў, якія адносіліся да прыватнай уласнасці і гэта вельмі нізкі паказчык для еўрапейскай дзяржавы.[16] Такім чынам, структурныя змены не насілі фундаментальнага

14 Станислав Богданкевич, “Трансформация политической и экономической системы”, Президентские выборы в Беларуси: от ограниченной демократии к неограниченному авторитаризму, Новосибирск: Водолей, 2006, 28.

15 Александр Лукашенко, “Сила в движении!”

16 EBRD: основной вопрос новой стратегии банка для Беларуси - готово ли правительство к реформам, БелаПАН, 18.02.2015.

характару, бо, як і раней, дзяржаўны сектар складае аснову нацыянальнай эканомікі.

Нягледзячы на песімістычныя прагнозы шмат якіх беларускіх і заходніх экспертаў, А. Лукашэнка дамогся пэўных поспехаў у рэалізацыі сваёй праграмы. З 1996 г. беларуская эканоміка дэманстравала пазітыўную дынаміку. На думку экспертаў Сусветнага банка, рост эканомікі Беларусі варта падзяліць на *два перыяды*: 1996 – 2000 гг. і з 2001 г. да 2011 г. Гэтыя два перыяды істотна адрозніваюцца па знешніх і ўнутраных умовах і асноўных характарыстыках. У 1996 – 2004 гг. прырост ВУП склаў 77,4% ці 6,6% у сярэднегадавым падліку. У 2006 г. ВУП Беларусі вырас адразу на 10% (у супараўнальных коштах), а ў 2007 г. – яшчэ на 8,2%.[17] “Досвед Беларусі ў пэўным сэнсе супярэчыць стандартнай парадыгме пераходнага перыяду, і адносная стабільнасць беларускай эканомікі была названая *парадоксам*. На сённяшні дзень у актыве Беларусі – дзевяць (ужо чатырнаццаць – заўв. аўт.) гадоў безупыннага эканамічнага росту, уражальнае зніжэнне ўзроўню беднасці, імклівы рост рэальных заробкаў і пенсій, і нізкі ўзровень беспрацоўя. У той жа час эканамічны рост не быў падмацаваны паслядоўнай макраэканамічнай стратэгіяй, рашучымі структурнымі і інстытуцыйнымі рэформамі і поспехамі ў развіцці прыватнага сектара. Нягледзячы на некаторую лібералізацыю, праведзеную падчас рэформаў, для

17 Елена Новожилова, Сколько весит беларусская экономика?, Беларусские новости. http://news.tut.by/economics/105797.html.

эканомікі Беларусі ўсё яшчэ характэрныя значнае рэгуляванне і моцны дзяржаўны кантроль".[18]

Разам з тым, Сусветны банк адзначаў, што "па тэмпах структурных рэформаў Беларусь адстае ад большасці краін з пераходнай эканомікай. З дзевяці асноўных галінаў рэфармавання (прыватызацыя буйных прадпрыемстваў, прыватызацыя малых прадпрыемстваў, кіраванне і структурныя рэформы на прадпрыемствах, лібералізацыя коштаў, знешні гандаль і валютная сістэма, антыманапольная палітыка, банкаўская рэформа, фондавы рынак, інфраструктурныя рэформы), найбольшы поспех быў дасягнуты ў галіне лібералізацыі коштаў і гандлю. Аднак паказальна, што менавіта ў гэтай сферы Беларусь мае самыя горшыя паказчыкі сярод краінаў з пераходнай эканомікай, падзяляючы апошнія месцы з Туркменістанам і Ўзбекістанам. Малая прыватызацыя пакуль не завершаная, у той час як прыватызацыя буйных аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці мае надта абмежаваны характар. У Беларусі склаліся найменш спрыяльныя ўмовы для развіцця бізнесу малых прыватных кампаніяў і індывідуальных прадпрымальнікаў".[19]

Паколькі ніякіх істотных зменаў у галіне структурных рэформаў у нашай краіне не адбылося, то ў 2011 г. кіраўніцтва краіны было вымушана правесці вельмі няўдалую дэвальвацыю валюты, а ў 2015 - 2016 гг. Беларусь увайшла ў эпоху сістэмнага крызісу,

18 The Country Economic Memorandum for the Republic of Belarus, New York: World Bank, 2005, 25.

19 The Country Economic Memorandum for the Republic of Belarus, 21–23.

калі казаць пра рост эканомікі ўжо не выпадае. На нашу думку, *беларускі парадокс* спыніў сваё існаванне менавіта ў 2011 г. “23 траўня 2011 г., А. Лукашэнка абваліў курс беларускага рубля на 56%. Адным гэтым крокам ён адабраў у людзей больш за палову іх месячных заробкаў. Праз дэвальвацыю сярэдні памер пенсій у доларавым эквіваленце скараціўся з 193 USD на пачатку траўня да 115 USD у канцы месяца. Пенсіянеры ў адно імгненне збяднелі на 40%. Тым часам інфляцыя ў Беларусі тады ўжо дасягнула 36,2%. Але насамрэч шмат якія тавары першай неабходнасці падаражэлі ў 2-4 разы. Прычым нават урад прызнаў, што цэны будуць расці і далей. На пачатак траўня ўклады насельніцтва ў нацыянальнай валюце складалі 10.1 трыльён рублёў, альбо 3.3 млрд. долараў. Але ў выніку дэвальвацыі памер укладаў скараціўся да 2 млрд. долараў. Гэта азначае, што ўкладчыкаў абакралі адразу на 1.3 млрд. долараў. Напрыканцы 2011 года па ўзроўні аплаты працы Беларусь апынулася на перадапошнім месцы ў СНД - меншы паказчык быў толькі ў Кыргыстане”.[20]

Дэвальвацыя беларускага рубля не магла не адбіцца самым негатыўным чынам на даверы да прэзідэнта і яго пражэктыўным электаральным рэйтынгу. Абодва паказчыкі ўпалі да небывалага нізкага ўзроўню. Паводле дадзеных апытання НІСЭПД за верасень 2011, “87,6% беларусаў лічыла, што беларуская эканоміка перажывае крызіс, пераважная большасць насельніцтва (61,2%) зазначала, што адказнасць за гэта ляжыць на прэзідэнце, амаль 70% лічыла, што краіна развіваецца ў

20 Геннадий Федынич, “Власть делает все, чтобы народ помог ей уйти”, Беларуский Партизан, 17.09.2011.

памылковым кірунку. Цяжкая эканамічная сітуацыя выклікала абвал рэйтынгу даверу да А. Лукашэнкі. У верасні 2011 г. толькі 24.5% беларусаў заявілі, што давяраюць прэзідэнту. У снежні 2010 года (напярэдадні выбараў) такіх было 55%. Прагаласавалі б сёння за А. Лукашэнку толькі 20.5%. Гэта таксама рэкорд, такіх паказчыкаў не было нават у 2003 г., калі пражэктыўны электаральны рэйтынг знізіўся "ніжэй за калена", па словах самога кіраўніка дзяржавы".[21]

Аўтар гэтага тэксту пісаў у той час, што рэжым асабістай улады можа заняпасці ў нашай краіне ў найбліжэйшы час "у выніку абвастрэння праблемаў легітымнасці сістэмы і даверу да асноўных інстытутаў улады".[22] Але гэтага не адбылося па адной важкай прычыне: на дапамогу А. Лукашэнку прыйшоў У. Пуцін, які не мог дазволіць паслаблення ўплыву расійскай палігархіі ў настолькі важным для яго рэгіёне Ўсходняй Еўропе. У. Пуціным быў падрыхтаваны план стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза пад патранажам РФ, які павінен быў гарантаваць невялікі эканамічны рост і палітычную стабільнасць (захаванне ўлады ў руках палітычных сем'яў) краін падпісантаў. Апошняя акалічнасць у вышэйшай ступені задавальняла А. Лукашэнку, за рост жа даводзілася плаціць адмовай ад магчымага супрацоўніцтва з непрыязнымі пуцінскай Расіі краінамі. Лаяльнасць А. Лукашэнкі дазволіла выйсці з эканамічнай катастрофы 2011 г. і гарантаваць хоць і нязначны, але рост ВУП ў 2012 г.

21 Олег Манаев, "Хмурая осень", Народная воля, №149-150, 30.09.2011.

22 Уладзімір Роўда, Палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь, Вільня, ЕГУ, 2011, 187-188.

У 2013 г. вельмі негатыўную ролю ў эканамічным развіцці Беларусі згуляла яе арыентацыя на рынак збыту Расіі, у эканоміцы якой пачаўся спад, звязаны з падзеннем коштаў на нафту і газ на сусветным рынку. Пра гэта даўно папярэджвалі міжнародныя і незалежныя расійскія эксперты, напрыклад Яўлінскі, які назваў пуцінскую мадэль “эканомікай трубы”. Аднак іх меркаванне было праігнаравана галавой беларускай палітычнай сям’і. Для А. Лукашэнкі ўмацаванне асабістай улады заўсёды было даражэй за любыя эканамічныя меркаванні. У 2014 - 2016 гг. на Беларусь абрынуліся адразу два крызісы. З аднаго боку, па нашай краіне балюча ўдарыў расійскі крызіс, звязаны з санкцыямі ЕС супраць РФ, правамерна ўведзенымі Еўрасаюзам пасла анексіі Крыма Расіяй і абвешчанай вайны пуцінскай Расіі супраць Украіны. З іншага боку, крызіс меў унутраны структурны характар, многімі рысамі які нагадваў крызіс сацыялістычнай эканомікі, які загубіў урад В. Кебіча ў 1994 г. Выхад з якога магчымы толькі ў выніку пераарыентацыі знешнеэканамічных адносінаў Беларусі, адмову ад Расіі, як адзінага рынку збыту для беларускіх вытворцаў, правядзенне радыкальных структурных рэформаў.

Нягледзячы на артыкуляцыю дадзенага шляху ў якасці магчымага на Ўсебеларускім народным сходзе яшчэ ў чэрвені 2016 г., працэс так і не зварухнуўся з мёртвай кропкі ў кастрычніку. Гэта сведчыць на карысць не толькі сілы інерцыі атачэння лідара беларускай палітычнай сям’і. Існуе асцярога і ў самога лідара з нагоды таго, як гэта будзе ўспрымацца Ў. Пуціным, у якога захаваліся важныя рычагі ўплыву на яго ўладу.

Такім чынам, досыць доўгае існаванне ў Беларусі крыху мадэрнізаванага *дзяржаўнага сацыялізму* не павінна ўспрымацца, як панаванне сацыяльнай роўнасці і сацыяльнай справядлівасці. Гэты лад нават у эпоху эканамічнага росту не пераўзыходзіў па гэтых паказчыках развітыя капіталістычныя краіны Еўропы. Дзяржаўная ўласнасць была выгадная толькі адной асобе – галаве палітычнай сям'і, які з яе дапамогай усталяваў поўны кантроль за ўсімі больш-менш актыўнымі чальцамі грамадства, СМІ, няўрадавымі арганізацыямі, палітычнымі партыямі, незалежна ад іх накіраванасці.

### 4. Неэканамічныя асаблівасці мафіёзнай дзяржавы ў Беларусі

Самай важнай палітычнай асаблівасцю мафіёзнай дзяржавы ў Беларусі стала развіццё яго ў рамках беспартыйнай сістэмы. Ніводны ўрад у нашай краіне з часоў В. Кебіча не фармаваўся на партыйнай аснове, а гэта азначае, што з моманту атрымання незалежнасці Рэспубліка Беларусь адносіцца да беспартыйных сістэмаў, у адпаведнасці з крытэрыямі вядомага французскага палітолага М. Д'ювержэ.[23] А. Лукашэнка строга рушыў за сваім асноўным супернікам 1994 г. і не пайшоў па шляху Ў. Пуціна, не стаў ствараць у Беларусі так званую *партыю ўлады*, нягледзячы

23 Морис Дюверже, Политические партии, Москва: Академический проект, 2000. Зрэшты, аўтар дадзенага тэкста (У. Роўда) быў першым беларускім палітолагам, які ў 2008 годзе сцвердзіў пра беспартыйны характар палітычнай сістэмы Беларусі // Владимир Ровдо, Сравнительная политология. Т. 3, Вильнюс, ЕГУ, 2009, 327-332.

на тое, што галаву палітычнай сям'і штурхалі на гэты шлях многія ўплывовыя асобы з ягонага асяроддзя.

Першым такую спробу зрабіў былы міністр адукацыі А. Радзькоў у 2007 г. Ён перад чарговымі парламенцкімі выбарамі правёў устаноўчы з'езд па стварэнні партыі ўлады *Белая Русь*, якая павінна была аб'ядноўваць у сваіх шэрагах усіх дарослых прыхільнікаў палітыкі А. Лукашэнкі. Потым за год да выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 2012 г. з аналагічнай ініцыятывай выступіў тагачасны спікер верхняй палаты парламента А. Рубінаў. Абедзве спробы праваліліся. Галава палітычнай сям'і А. Лукашэнка ў вельмі рэзкай форме раскрытыкаваў ініцыятараў, заявіўшы, што ён "знойдзе ім дадатковую працу, калі ім яе не хапае".[24] Такім чынам, *Белая Русь* у нашай краіне існуе, але не як палітычная партыя, а як грамадскае аб'яднанне. З крытыкай палітычных партыяў, якія дзейнічаюць у краіне, А. Лукашэнка выступіў і на Ўсебеларускім народным сходзе 2016 г.[25] Гэта дазваляе зрабіць выснову аб тым, што беспартыйны статус Беларусі цалкам адпавядае яго стратэгічным мэтам. Чаму ж нават адданыя яму партыі не дагадзілі кіраўніку дзяржавы?

На гэтае пытанне ёсць два адказы. Першы быў сфармуляваны ў прамове А. Лукашэнкі 2008 г., прысвечанай праблемам фарміравання партыі ўлады. У ёй было сказана, "што кіраўнік дзяржавы нармальна адносіцца да ўсіх партыяў, якія дапамагаюць нам

24 Уладзімір Роўда, Палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь, 245.

25 Александр Лукашенко, "Сила в движении"!

будаваць жыццё. Няхай яны будуць апазіцыйнымі, крытычныя да таго, што робіць улада, але яны імкнуцца дапамагаць уладзе".[26] Першае, што кідаецца ў вочы, гэта тое, што галава палітычнай сям'і разводзіць партыі і ўладу ў розныя бакі. Улада, на яго думку, не павінна насіць партыйны характар, а некаторым з іх (апазіцыйным) дазваляецца толькі крытыкаваць урад. Барацьба за ўладу, а гэта найважнейшая функцыя любой палітычнай арганізацыі, у нашай краіне апынулася пад забаронай. У гэтым пытанні наша краіна адстае ад Расіі і ўсіх іншых мафіёзных дзяржаваў. Але галава палітычнай сям'і цвёрда прытрымліваецца гэтай пазіцыі, пра што сведчаць вынікі апошніх выбараў у Палату прадстаўнікоў, дзе адразу два прадстаўнікі апазіцыйных партыяў былі прызначаныя крытыкаваць уладу, але не весці з ёю барацьбу на роўных. Тое, што кіраўніцтва некаторых апазіцыйных палітычных арганізацыяў пагадзіліся з выбарам прэзідэнта, сведчыць пра маральную дэградацыю беларускай апазіцыі.

Другі адказ быў дадзены А. Лукашэнкам, калі ім была створана вертыкаль улады, якая выконвае функцыі партыяў улады ў класічных мафіёзных дзяржавах. Два ўказы прэзідэнта № 476 *Аб зацвярджэнні Палажэння аб старшыні абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта* ад 20 лістапада 1995 г. і № 519 *Аб некаторых пытаннях забеспячэння дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь* ад 26 снежня 1995 г. прывялі да фактычнага прызначэння кіраўнікоў выканкамаў

26 "А. Лукашенко ответил на вопросы представителей белорусских и российских СМИ", 26.04.2008, http://www.president.gov.by.

мясцовых саветаў кіраўнікамі вышэйстаялых выканаўчых камітэтаў.[27]

Узнікла славутая прэзідэнцкая *выканаўчая вертыкаль* на чале з кіраўніком дзяржавы. Ён сам прызначаў старшыню Мінскага гарвыканкама і старшыняў выканаўчых камітэтаў усіх абласцей краіны. Кіраўнікі абласцей прызначалі кіраўнікоў раённых выканкамаў, а тыя, у сваю чаргу, кіраўнікоў мясцовых адміністрацыяў. Указам быў ліквідаваны і цэлы шэраг Саветаў нізавога ўзроўню. У выніку, выканкамы перасталі быць падсправаздачнымі мясцовым прадстаўнічым органам улады, якія абіраюцца грамадзянамі. У Канстытуцыі 1996 г. такі стан рэчаў быў узаконены. Згодна з артыкулам 119-ым: "Кіраўнікі мясцовых выканаўчых і гаспадарчых органаў прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь альбо ва ўстаноўленым ім парадку і зацвярджаюцца на пасадзе адпаведнымі мясцовымі Саветамі дэпутатаў".[28]

Вертыкаль улады асабіста падпарадкавана галаве палітычнай сям'і і з'яўляецца значна больш дысцыплінаванай і працаздольнай, чым любая партыя ўлады ў класічных мафіёзных дзяржавах, бо разумее, што ад яе намаганняў залежыць не толькі службовае становішча, але і свабода, а часам і жыццё.

27 Народная газета, 25 ліпеня 1996; Міхаіл Смяговіч, "Станаўленне і развіццё інстытута прэзідэнцкай улады", Гісторыя Беларускай дзяржаўнасці. Кн.2, Мінск, Беларуская навука, 2012, 471-472.

28 Статья 119 Конституции Республики Беларусь, Минск, Национальный центр правовой информации, 2007, 36.

Таму, на нашу думку, стварэнне ў Беларусі партыйнай сістэмы, якая была б падобная да расійскай ці венгерскай, магчыма толькі пасля ліквідацыі дзейнага палітычнага рэжыму ці замены галавы палітычнай сям'і.

На думку амерыканскіх палітолагаў С. Лявіцкага і Л. Уэя, слабасць партыі ўлады, тым больш яе адсутнасць стварае праблемы для аўтарытарнай сістэмы.[29] З гэтым меркаваннем можна пагадзіцца толькі часткова. Такая сітуацыя негатыўна ўплывае на развіццё інстытутаў палітычнай сістэмы, што робіць іх у вышэйшай ступені персаналісцкімі. Аднак беларускі прыклад дазваляе сцвярджаць, што такая сітуацыя можа расцягвацца на гады і дзесяцігоддзі.

Значна больш небяспечным для ўлады палітычнай сям'і А. Лукашэнкі з'яўляецца іншая асаблівасць мафіёзнай дзяржавы ў нашай краіне. Размова ідзе пра відавочную перавагу сацыяльнага папулізму над нацыянальным папулізмам сярод метадаў ажыццяўлення ўлады. У гэтым пытанні Беларусь таксама адстае практычна ад усіх краінаў з аналагічным уладкаваннем.

Спробы беларускіх ідэолагаў заявіць, што менавіта Рэспубліка Беларусь адстойвае тыя каштоўнасці, якія пераважалі ў Савецкім Саюзе, а таму нацыяналізм у нас тоесны саветызму, выглядаюць недарэчна і непераканаўча. Для інтэлектуальнай эліты ніколі не

29 Steven Levitsky and Lukan Way, Competitive Authoritarianism: The Emergence and Dynamic of Hybrid Regimes in the Post-Cold War Era, Cambridge University Press, 2010, 59.

быў святым ні сцяг БССР у якасці дзяржаўнага, ні савецкі герб, ні дзень незалежнасці, які прымеркаваны ў нас да дня вызвалення Мінска часткамі Чырвонай арміі ў 1944 г.

Можна зразумець прычыны, якія падштурхнулі А. Лукашэнку замяніць нацыянальныя сімвалы на савецкія і атаясаміць гісторыю Беларусі з гісторыяй БССР. Яны звязаны з нізкім культурным узроўнем дырэктара саўгаса, які воляю лёсу стаў кіраўніком дзяржавы. Але немагчыма зразумець тую акалічнасць, што і праз дваццаць два гады ва ўладзе ён не змяніўся ў культурным плане. Бо менавіта яго ўладзе цяпер пагражае пазначаны вышэй дысбаланс у дачыненні да папулізму. Нацыянальны папулізм выдатна працуе менавіта ва ўмовах крызісу, пра што сведчыць досвед Расіі, Венгрыі і цэлага шэрагу іншых краінаў з мафіёзным дзяржаўным ладам. Сацыяльны папулізм ва ўмовах эканамічнага крызісу, а менавіта яго мы і перажываем у цяперашні час, не можа выклікаць нічога акрамя расчаравання і фрустрацыі.

Такім чынам, у выпадку калі галава палітычнай сям'і ў Беларусі не знойдзе ў сабе сілы замяніць сацыяльны папулізм на нацыянальны і, калі крызіс прадоўжыцца, яго ўлада можа апынуцца пад пагрозай ужо ў недалёкай гістарычнай перспектыве.

5. “Закон вяршэнства” замест “вяршэнства закона” ў сучаснай Беларусі

У сучаснай Беларусі дзейнічае Канстытуцыя 1996 г., прынятая на рэферэндуме, вынікі якога былі груба сфальсіфікаваныя, што дазваляе казаць пра канстытуцыйны пераварот, здзейснены кіраўніком дзяржавы. Фармальна, у адпаведнасці з асноўным законам, у нашай краіне былі ўведзеныя інстытуты так званай прэзідэнцка-парламенцкай рэспублікі з двухпалатным парламентам. Аднак і яны патрапілі ў амаль поўнае падпарадкаванне галаве палітычнай сям’і. Таму больш правільна казаць пра суперпрэзідэнцкую рэспубліку, што дзейнічае ў краінах Цэнтральнай Азіі, з канцэнтрацыяй усіх уладных паўнамоцтваў у прэзідэнцкім “ствале” і атрафіяй іншых галінаў улады.

Доказам гэтаму з’яўляецца тое, што ў Беларусі так і не сфармаваўся *двухгаловы выканаўчы орган*, характэрны для любой дэмакратычнай дзяржавы з аналагічным уладкаваннем, у якім улада прэзідэнта збалансавана ўладай прэм’ер-міністра. У нашай краіне прэм’ер-міністр не з’яўляецца палітыкам, але, хутчэй, гаспадарнікам, падпарадкаваным прэзідэнту. У Беларусі толькі прэзідэнт вызначае заканадаўства краіны, пазбаўляючы дэпутатаў права выконваць *легіслатыўную* функцыю. За гады, якія прайшлі пасля рэферэндуму, толькі адзінкі законаў былі распрацаваныя ў сценах парламента. Фактычна толькі галава палітычнай сям’і ажыццяўляе функцыю *рэкрутавання*: падбору і расстаноўкі кіруючых кадраў. Ён яе падзяляе з верхняй палатай парламента, проста ці ўскосна прызначанай

кіраўніком дзяржавы. У прэзідэнта таксама прысутнічае права прызначэння і зняцця асноўных суддзяў краіны, што робіць суды ў вышэйшай ступені залежнымі ад кіраўніка дзяржавы. Перавод кантрольнай палаты парламента ў 1996 г. у вядзенне Адміністрацыі прэзідэнта ператварыў А. Лукашэнку "ў палітычнага актара, які ўсіх кантралюе і нікому не падкантрольны".[30] Не прававы характар прыняцця беларускага асноўнага закона адбіўся на практыцы функцыянавання інстытутаў улады ў цэнтры і на месцах.

За час, што прайшоў з моманту канстытуцыйнага перавароту, назіралася не проста "замарожванне палітычных інстытутаў на ўзроўні 1996 г.", як лічыць расійскі палітолаг У. Гельман, але адбываўся іх адкат да далейшай персаналізацыі ўлады.[31] І канстытуцыя, і ўрад з парламентам, і выбары абслугоўвалі адну асобу - Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку, прыстасоўваліся да яго прыхамацяў і капрызаў. Напрыклад, у 2004 г. быў праведзены рэферэндум па далейшым змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з ягонымі афіцыйнымі вынікамі, 79,42 % грамадзянаў, якія прынялі ўдзел, пагадзіліся з тым, каб у дзейнага прэзідэнта было права вылучацца на любых выбарах

30 Уладзімір Роўда, Палітычная Сістэма Рэспублікі Беларусь, 135.

31 Владимир Гельман, "Из огня да в полымя. Динамика постсоветских режимов в сравнительной перспективе", Полис, № 2, 2007, 11, http://csis.org/images/stories/Russia%20and%20Eurasia/061207_ruseura_acgelman.pdf

кіраўніка дзяржавы колькі заўгодна разоў.[32] Абвяшчэнне вынікаў, якія былі ўспрынятыя многімі беларусамі, як грубая фальсіфікацыя, выклікала стыхійныя пратэсты ў Мінску.

Урад Рэспублікі Беларусь, роўна як і парламент, па сваіх паўнамоцтвах істотна саступаюць такім уладным структурам, як Адміністрацыя прэзідэнта і Савет Бяспекі. Яны атрымалі канстытуцыйнае замацаванне ў Асноўным Законе 1996 г. Адміністрацыя прэзідэнта з'яўляецца найважнейшым рэзервуарам кадраў для вышэйшых падраздзяленняў дзяржаўнага кіравання ў цэнтры і на месцах. Яго шматлікія аддзелы дублююць працу міністэрстваў і ведамстваў Савета Міністраў, задаючы ім, пэўны вектар развіцця, як у свой час рабілі аддзелы ЦК КПБ у адносінах да савецкага ўрада. Акрамя таго, у Адміністрацыі сканцэнтраваныя сілы, якія забяспечваюць "кіруючую і накіравальную" ролю прэзідэнта ў яго ўзаемадзеянні з органамі заканадаўчай і судовай улады. Гэта, у прыватнасці, знаходзіць сваё выражэнне ў распрацоўцы ў сценах Адміністрацыі асноўных законапраектаў, якія потым спускаюцца дэпутатам парламента для зацвярджэння.[33]

У дадзеных інстытутах у цэнтры і на месцах працуе шматлікая бюракратыя. У аснову будынка яе функцыянавання з

32 Юры Чавусаў, "Маніпуляцыі ў інфармацыйнай прасторы і пагроза рэферэндуму", Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі, Вільня, Інстытут беларусістыкі 2006, 466.

33 Положение об Администрации президента Республики Беларусь, http://president.gov.by; Глава 4 Конституции Республики Беларусь.

самага пачатку былі закладзеныя супярэчныя адзін аднаму прынцыпы. З аднаго боку, кіраўнік палітычнай сям'і выбудоўваў "вертыкаль улады", якая ахапіла сваім уплывам усю дзяржаву з верху да нізу. З іншага боку, і пасля кансалідацыі сваёй улады А. Лукашэнка не адмовіўся ад сацыяльнага папулізму, найважнейшага прынцыпу, які легітымізуе палітычны рэжым у Беларусі. Вера простых людзей у народны характар вярхоўнай улады патрабавала ад галавы палітычнай сям'і рэгулярных "ахвярапрынашэнняў": публічных кампаній гучных выяўленняў тых ці іншых карумпаваных чыноўнікаў. Ні адна службовая асоба ў Беларусі, акрамя прэзідэнта, да гэтага часу не атрымала гарантыяў сваёй недатыкальнасці. Гэта не можа не адбівацца самым негатыўным чынам на інтэграванасці кіруючай эліты. Яна ў нас не толькі не валодае сродкамі вытворчасці, як у Расіі ці Венгрыі, але і кепска абаронена ад самавольства з боку першай службовай асобы ў дзяржаве. Аднак бюракратыя не пратэстуе і ў цэлым падтрымлівае ўладу, таму што ў Беларусі чыноўнікі дзейнічаюць ва ўмовах штучна знішчанага канкурэнтнага асяроддзя, як у СССР пры Брыжневу, пры якім ішла хуткая дэградацыя эліты.

Такім чынам, неправавы характар мафіёзнай дзяржавы ў Беларусі ўзнік раней, чым у Расіі ці Венгрыі і самым негатыўным чынам адбіваецца на інстытутах палітычнай сістэмы і ступені інтэграцыі бюракратыі і эліты ў цэлым. Яны пакутуюць ад неправавой дзяржавы і непрадказальнасці паводзінаў галавы палітычнай сям'і, якая ўзрастае падчас крызісаў.

## 6. Ліквідацыя сацыяльнай аўтаноміі ў беларускім грамадстве

Беларускія ўлады за А. Лукашэнкам пачыналі са знішчэння аўтаноміі беларускамоўнай культуры, у існаванні якой яны бачылі пагрозу палітыкі русіфікацыі, якая атрымала другое дыханне і крамлёўскія грошы пасля рэферэндуму 1995 г. аб дзяржаўнай мове і сімволіцы. Беларуская мова апынулася выціснутай у нішу, якую займаюць нацыянальныя меншасці ў самых недэмакратычных краінах свету. Тым не менш, яна выжыла і менавіта на ёй інтэлектуальная эліта Беларусі мае зносіны. На гэтай мове ствараюцца творы літаратуры, якія па якасці пераўзыходзяць творы расійскамоўных аўтараў.[34] Яны аб'ядналіся ў незалежны саюз пісьменнікаў, які не атрымлівае ніякай дзяржаўнай падтрымкі. Сістэма адукацыі ў Беларусі паслухмяна працуе ў кірунку культурнай асіміляцыі беларускага грамадства ў расійскую культуру. Вышэйшая адукацыя даўно тут апярэдзіла сярэднюю. Справа ў тым, што ў краіне адстутнічаюць універсітэты з выкладаннем усіх прадметаў на беларускай мове. Навука ў цэлым і акадэмічныя інстытуты ў прыватнасці ніколі не мелі нават той аўтаноміі, якую маюць аналагічныя ўстановы ў Еўропе.

Сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі кантралююцца ўрадам. Радыё і тэлебачанне цалкам манапалізаваныя дзяржавай.

34 Пра барацьбу А. Лукашэнкі з беларускамоўнай культурай і іх наступствы можна прачытаць у інтэрв'ю Беларускай службе Радыё Свабода лаўрэаткі нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры за 2015 год расейскамоўнай пісьменніцы Святланы Алексіевіч.

Нядаўна створаная незалежная кампанія *Белсат*, якая вяшчае з-за мяжы, пакуль не можа канкураваць з БТ, ОНТ, СТВ альбо Трэцім каналам у выніку цэлага шэрагу прычынаў. Напрыклад, *Белсату* складаней аператыўна асвятляць важныя падзеі. Журналістаў і экспертаў немагчыма засцерагчы ад затрымання беларускай міліцыяй. За паслугі *Белсата* трэба плаціць, а беларускія жыхары не прызвычаіліся да гэтага (ім навязваецца пакет танных паслугаў кабельнага тэлебачання ў ЖЭС). Шмат хто выбірае прагляд перадачаў гэтай кампаніі ў Інтэрнэце, што з'яўляецца больш ананімным і бяспечным. На наш погляд, патрэбная таксама і якаснае рэкламнае прасоўванне гэтай кампаніі. Да гэтага варта дадаць, што Інтэрнэт у 2010 г. рабіў уплыў на выбар палітычнай пазіцыі толькі 10% выбаршчыкаў. Ён таксама трапляе пад дзяржаўнае рэгуляванне, але нягледзячы на гэта, застаецца самым свабодным СМІ ў Беларусі, колькасць яго карыстальнікаў перавышала 4,8 мільёнаў чалавек у 2013 г. Гэта лічба павялічылася да 5 з невялікім мільёнаў чалавек, па дадзеных за сакавік 2016 г.[35]

Няўрадавыя арганізацыі пакутуюць ад рэпрэсіўных мер падчас рэгістрацыі, дзеяння так званага дазвольнага, а не заяўнага прынцыпу. Гэта прывяло да скарачэння колькасці сапраўдных НДА, спынення росту іх колькасці. Сектар змог аднавіцца пасля кампаніі перарэгістрацыі 1999 г. толькі ў 2009 г., калі дзейнічала каля 2500 аўтэнтычных арганізацыяў, але і яны зазнавалі ціск.[36]

35 ByNet-2013: первые итоги года, http://dw.de/p/1A1SK

36 Виктор Чернов, “Третий Сектор в Беларуси”, Наше мнение №4, 26.03.2008.

З 2006 г. і да гэтага часу дзейнічае мера крымінальнай адказнасці за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Яна стрымлівае найбольш актыўных і таленавітых людзей. Разам з тым, урад падтрымлівае так званых GONGO (*то бок Дзяржавай арганізаваныя недзяржаўныя арганізацыі*), якія імкнуцца манапалізаваць у сваіх руках прадстаўніцтва сацыятальных сектараў. Добра вядомымі беларускімі прыкладамі з'яўляюцца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ) і грамадскае аб'яднанне *Белая Русь*.

Палітычны плюралізм у Беларусі сутыкнуўся з сур'ёзнымі абмежаваннямі на працягу апошніх дваццаці гадоў. Беларускія палітычныя партыі, пазбаўленыя магчымасцяў удзелу ў нармальнай канкурэнтнай барацьбе ў парламенце і мясцовых органах улады, агітаваць сваіх выбаршчыкаў з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку, электронных, апынуліся ў ізаляцыі ад грамадства. Большая частка з іх мала чым адрозніваецца ад палітычных клубаў і няўрадавых арганізацыяў. Магчымасці "вулічнай палітыкі" таксама апынуліся абмежаванымі для партыяў і палітычных арганізацыяў праз драконаўскае заканадаўства супраць ініцыятараў несанкцыянаваных акцый пратэсту.

Выбары ў Рэспубліцы Беларусь не ўмацоўваюць палітычныя партыі, незалежна ад іх ідэалогіі альбо палітычнай арыентацыі: выступаюць яны «за» ці «супраць» А. Лукашэнкі. За мінулыя дваццаць гадоў прайшлі дзевяць агульнанацыянальных кампаніяў парламенцкіх (у 2000, 2004, 2008, 2012 і 2016 гг.) і

прэзідэнцкіх (у 2001, 2006, 2010 і 2015 гг.) выбараў. На ўсіх афіцыйна перамагалі людзі са спісу А. Лукашэнкі альбо сам дзейны галава палітычнай сям'і. Ніводныя выбары не былі прызнаныя свабоднымі і справядлівымі назіральнікамі АБСЕ, што адбілася на нізкіх ацэнках Беларусі, якія выстаўляе *Freedom House*. Улады ставілі перад сабой задачу далейшай *дэпалітызацыі і дэпартызацыі* беларускага парламента і грамадства ў цэлым, вызвалення яго ад уплыву любых палітычных арганізацыяў наогул. З дапамогай выбарчых кампаніяў, а таксама выкарыстання падтасоўванняў і фальсіфікацыяў яны сур'ёзна прасунуліся наперад у вырашэнні гэтай задачы.

Апошнія выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў не адрозніваліся сур'ёзным чынам ад усіх папярэдніх кампаніяў. На іх было абрана 8 дэпутатаў ад Кампартыі Беларусі, 3 чальца Патрыятычнай партыі і 2 прадстаўніка апазіцыі (1 ад Аб'яднанай грамадскай партыі і 1 ад грамадскай арганізацыі Таварыства беларускай мовы). Усяго партыйнымі прадстаўнікамі стала 13 дэпутатаў.[37] У 2012 г. у Палаце прадстаўнікоў было 5 чальцоў партый. Для краіны, якая знаходзіцца ў Еўропе - гэта катастрафічна мала. Усё гэта пацвярджае выснову аб працяглай барацьбе галавы палітычнай сям'і ў Беларусі супраць партыяў наогул, пра ейныя прычыны было сказана вышэй.

Такім чынам, у Беларусі адбывалася ліквідацыя аўтаноміі важных сацыяльных інстытутаў, як і ў іншых класічных

37 Новости ОНТ 11.09.2016.

мафіёзных дзяржавах. Дадзены працэс прывёў да фарміравання так званай “моцнай улады”, што мела дастаткова супярэчлівы характар. Перш за ўсё, варта згадаць супярэчнасць паміж адносна эканамічна і сацыяльна развітым грамадствам і самай прымітыўнай у Еўропе палітычнай сістэмай, заснаванай на персаналісцкай дыктатуры, поўным панаванні палітычнай сям’і, паводле тэорыі мафіёзнай дзяржавы. Слабасць беларускага рэжыму выяўляецца ў тым, што ў яго нетрах немагчыма развіваць сучасныя палітычныя і сацыяльныя інстытуты, і праз дваццаць гадоў ён застаецца культурным “калгасам” у геаграфічным цэнтры Еўропы.

7. Патрон-кліентэлісцкія адносіны ў Беларусі

На развіццё патрон-кліентэлізму ў Беларусі аказалі ўплыў падзеі нядаўняй гісторыі. Беларуская ССР была адным з тых утварэнняў у складзе СССР, куды індустрыялізацыя і ўрбанізацыя прыйшлі досыць позна: у 60-70 гады. Да 1960 г. у структуры эканомікі асноўнае месца займала сельская гаспадарка.

Прычыны такой эканамічнай палітыкі Крамля палягалі ў імкненні кіраўніцтва Савецкага Саюза ператварыць Беларусь у своеасаблівы аналаг Усходняй Украіны. Абодва рэгіёны павінны былі выраблять да ¼ прадукцыі ўсяго ваенна-прамысловага комплексу СССР. Гэтая акалічнасць тлумачыць таксама хуткае развіццё энергаёмістай буйной прамысловасці ў нашай краіне. У структуры індустрыяльнага сектара галоўныя пазіцыі належалі машынабудаванню і металаапрацоўцы, хімічнай

прамысловасці, оптыцы і радыёэлектроніцы. Прадпрыемствы Беларусі залежалі ад паставак сыравіны і камплектуючых, наша краіна ўжо тады стала зборачным цэхам усяго Савецкага Саюза.

Разам з індустрыялізацыяй ішоў і працэс хуткай урбанізацыі краіны. Значна вырасла гарадское насельніцтва. Перабіраючыся ў гарады, былыя жыхары беларускіх вёсак траплялі ў іншае культурнае асяроддзе. Большасць з іх была вымушана адаптавацца да расейскай мовы і культуры, якія ў тыя гады паўсюдна панавалі ў гарадах. Беларуская мова была выкінутая на перыферыю культурнага жыцця: на ёй размаўлялі жыхары вёсак і невялікіх гарадоў. Пасля краху СССР яна стала сімвалам прыналежнасці да інтэлігенцыі, а пасля прыходу А. Лукашэнкі да ўлады - сімвалам прыналежнасці да апазіцыі.

Працэсы асіміляцыі беларускага насельніцтва ў расійскую культуру праходзілі складана і неадназначна, нягледзячы на лексічную блізкасць моваў. Сам галава палітычнай сям'і - А. Лукашэнка так і не навучыўся размаўляць пісьменна ні на расійскай, ні на беларускай мове. Яго таксама варта адносіць да гараджанаў у першым пакаленні, якія маюць некалькі іншыя каштоўнасныя арыенціры, чым жыхары гарадоў еўрапейскіх краінаў, да якіх фармальна мы належым. Яны з'яўляюцца значна больш аўтарытарнымі і арыентаванымі на патэрналізм і патранажна-кліентэльныя сувязі і адносіны. На вялікі жаль, каштоўнасныя арыентацыі нашага прэзідэнта супадалі з каштоўнаснымі арыентацыямі большасці грамадзянаў Беларусі, калі ён прыйшоў да ўлады. Як адзначае беларускі

палітолаг А. Лысюк, “відавочныя прэтэнзіі беларускага прэзідэнта выступаць у ролі бацькі патрыярхальнай сям’і. Вобраз бацькі звычайна ахоплівае ўсю дзяржаву, уключаючы ўсіх грамадзянаў, нават тых, хто не лічыць сябе звязаным з ім сваяцтвам. У выніку гэтага, Бацька аперуе выключна паняццямі народа, але ні ў якім разе, не сацыяльных групаў альбо класаў. Вобраз бацькі звычайна з’яўляецца ўвасабленнем праўды, якая нібыта адлюстроўвае мудрасць папярэдніх пакаленняў і ведае мінулае, сучаснасць і будучыню. Уладарны вобраз Бацькі абараняе і засцерагае сваіх дзяцей, не можа не валодаць гераічным арэолам і практыкай перамогаў над полчышчамі ворагаў. Гэты вобраз падразумявае да ўсяго вобраз Патрыёта, які ажыццяўляе выратавальны ўплыў на лёс Айчыны, Радзімы-Маці, усяго беларускага народу”.[38]

На нашу думку, у выбары аўтарытарных каштоўнасцяў беларускімі грамадзянамі ў сярэдзіне 90-х гг. якраз і праявілася “помста” позняй індустрыялізацыі і ўрбанізацыі. Але потым наступіў час, калі ў народа ўжо не пыталіся, бо выбары ў нас не адпавядалі элементарным крытэрам дэмакратыі. Лічылася само сабою зразумелым, што народ падзяляе палітычныя каштоўнасці галавы палітычнай сям’і, які любіў, калі яго называлі “бацькам”.

Аднак працэсы індустрыйнага развіцця і росту гарадоў і іх вынікі не з’яўляюцца нечым вечным і нязменным. З кожным

38 Анатолий Лысюк, “Президент и народ: специфика политической коммуникации”, Президентские выборы в Беларуси: от ограниченной демократии к неограниченному авторитаризму, Новосибирск, Водолей, 2006, 156-157.

годам, які жыве краіна, узрастае адсотак людзей, якія з'яўляюцца гараджанамі ў другім і трэцім пакаленні, маючы іншыя каштоўнасці. Паколькі ніякіх істотных зменаў у поглядах, ідэалах і арыентацыях галавы палітычнай сям'і не адбываецца, мы можам сабе ўявіць ціхае, але сталае змяненне каштоўнасных арыентацыяў большасці беларускіх грамадзянаў. Яны не змяшчаюцца ў пракрустава ложа пануючага рэжыму. Дадзены працэс узмацняецца ў эпоху крызісу, які расплюшчвае вочы на слабасці мафіёзнай дзяржавы вялікай колькасці людзей.

Такім чынам, у Беларусі сфарміраваліся элементы патрон-кліентэлісцкіх адносінаў, якія нічым не адрозніваліся ад тых, што прысутнічаюць у класічных мафіёзных дзяржавах. Іншая справа, што іх часовыя рамкі з'яўляюцца абмежаванымі, бо іх пастаянна размываюць працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

8. Ідэалагічнае абгрунтаванне мафіёзнай дзяржавы ў тэксце дзяржаўнай ідэалогіі

Для замацавання створанай сістэмы ўлады, перадачы яе будучым пакаленням, павышэння ступені легітымнасці рэжыму галавой палітычнай сям'і ў 2003 г. у Беларусі была распрацаваная так званая *дзяржаўная ідэалогія*. Рэжым асабістай улады ў нашай краіне не з'ўляецца жорстка ідэалагізаваным, што адрознівае яго ад таталітарнага. У той жа час грамадскай свядомасці прышчапляюцца адкрыта антыдэмакратычныя і антызаходнія ідэі. Шырока прапагандуецца панславізм. Рэспубліка Беларусь

малюецца як важны фарпост, які перашкаджае распаўсюджванню шкодных ліберальных каштоўнасцяў і поглядаў, а яе прэзідэнт пазіцыянуе сябе ў якасці лідара тых сілаў на постсавецкай прасторы, якія актыўна выступаюць супраць імперыялістычнай змовы краінаў Захаду супраць дзяржаваў былога СССР. У гэтым жа духу вытрыманы і тэкст так званай дзяржаўнай ідэалогіі, з якім А. Лукашэнка выступіў на пастаянна дзейным семінары кіруючых працаўнікоў у сакавіку 2003 года.

Стварэнне дзяржаўнай ідэалогіі дало падставу некаторым палітолагам і апазіцыйным палітыкам казаць пра таталітарную трансфармацыю палітычнага рэжыму Лукашэнкі. На наш погляд, такая трансфармацыя насіла ярка выяўлены султаніcцкі характар. Султаніcцкае кіраўніцтва звычайна не мае добра распрацаванай пануючай ідэалогіі, але яно можа выкарыстоўваць дэкларацыі лідараў, якія прэтэндуюць на статус ідэалогіі, "яна носіць надта маніпулятыўны характар і, што яшчэ больш важна, не разглядаецца як нешта, што можа стрымліваць кіраўніка, і захоўвае сваю рэлевантнасць толькі да таго моманту, пакуль яе выкарыстоўвае лідар".[39] Фармуецца так званая *псеўдаідэалогія*.

Мне здаецца, што распрацоўшчыкі беларускай дзяржаўнай ідэалогіі вельмі блізка наблізіліся да гэтай мадэлі. Яна носіць павярхоўны характар. Светапоглядная частка ўключае ў сябе

39 Juan Linz and Alfred Stepan, Тамсама, 53.

эклектычны набор некаторых марксісцка-ленінскіх, ліберальных і кансерватыўных пазіцыяў. Як адзначаецца ў дакладзе А. Лукашэнкі, “такім чынам, марксісцка-ленінская, кансерватыўная і ліберальная ідэалогія ў розначай ступені, у розных, скажам, колькасцях павінна быць ўласцівая і нам. Ды і ў некаторай ступені была ўласцівая. Чагосьці болей, чагосьці меней.... Беларуская ідэалогія павінна мець арыентацыю на традыцыйныя для нашай цывілізацыі каштоўнасці: здольнасць працаваць не толькі дзеля нажывы, але і на карысць грамадства, калектыву іншых людзей... Па сутнасці, ва ўсходнеславянскай (а калі ўлічыць пражыванне на нашых прасторах і іншых народаў) ва ўсходнееўрапейскім свеце мы засталіся адзінай краінай, якая адкрыта прапагандуе адданасць нашым традыцыйным цывілізацыйным каштоўнасцям. Усё гэта дазваляе казаць, што часам, лёсам, сітуацыяй Беларусь вылучылася на, напэўна, вялікую ролю духоўнага лідара ўсходнееўрапейскай цывілізацыі”.[40]

У 2016 г. перад візітам у КНР галава палітычнай сям’і палічыў дарэчным нагадаць пра яго адданасць камуністычным ідэям. Выступаючы на Ўсебеларускім народным сходзе ён заявіў, што “трэба зразумець адно: у нас сёння няма кампартыі, якая калісьці была і якая несла велізарную нагрузку па выхаванні, ідэалагічным выхаванні нашага грамадства, таму ўсё кладзецца на нас, на вертыкаль улады. А паколькі партый нармальных

40 Александр Лукашенко, “О состоянии идеологической работы и мерах по ее совершенствованию”, Материалы постоянно действующего семинара руководящих работников, Минск, Академия управления при президенте РБ, 2003, 17-21.

яшчэ і сапраўдных няма, яны не сфармаваныя, трэба абапірацца на тое, што ёсць: і на нашы моладзевыя арганізацыі, і на нашы ветэранскія арганізацыі, трэба абапірацца і на наш Саюз жанчынаў, на нашы прафсаюзы. Трэба іх выкарыстоўваць для таго, каб вырашаць тыя праблемы, якія вырашала калісьці Камуністычная партыя, якая рабіла нямала для таго, каб краіна развівалася. Ну, а калі няма, значыць, трэба замяніць, пакуль не сфармаваўся гэты партыйны рынак, калі можна так сказаць, трэба іх замяніць існымі арганізацыямі, якія выступаюць за суверэнітэт і развіццё нашай краіны".[41]

Такім чынам, як паказвае практыка ідэалагічнай працы гэтая сістэма ідэяў і поглядаў ніяк не абмяжоўвае дзейную ўладу, але, наадварот, служыць для забеспячэння дасягнення прагматычных мэтаў Лукашэнкі ўзмацнення яго асабістага кантролю над дзяржаўным апаратам, сістэмай адукацыі і СМІ. Нарэшце, у гэтую ідэалогію "не верыць ні асяроддзе лідара, ні падданыя, ні знешні свет", што, згодна з Лінцам і Стэпанам, уласціва менавіта султанізму. Гэта таксама адна з адметных рысаў мафіёзнай дзяржавы.

## 9. Заканчэнне

Напрыканцы хацелася б спыніцца на тым, што зближае Беларусь з ідэальнай мадэллю мафіёзнай дзяржавы. Гэта, перш за ўсё, экспартаваная з Расіі знявага да прававой дзяржавы, ад якой

41 Александр Лукашенко, "Сила в движении!"

пакутуе не толькі грамадства, але і кіруючая эліта. Наша краіна раней за іншыя мафіёзныя дзяржавы прасунулася па шляху ліквідацыі аўтаноміі найважнейшых сацыяльных інстытутаў, пачынаючы з Акадэміі навук і скончваючы палітычнымі партыямі. Галава палітычнай сям'і выкарыстаў некаторыя перажыткі патэрналізму ў свядомасці людзей, што стала асновай для развіцця патрон-кліентэлізму. Нарэшце, у Беларусі была створана дзяржаўная ідэалогія, якая служыць для ўвекавечання ўлады А. Лукашэнкі і забеспячэння яе пераемнасці.

Аднак існуюць і рысы, якія адрозніваюць беларускую мадэль ад класічнай мафіёзнай дзяржавы: перавага дзяржаўнай уласнасці, адсутнасць партыі ўлады і слабая роля нацыянальнага папулізму, які быў заменены папулізмам сацыяльным. Але сказанае не павінна быць зразумелым як неадольная перашкода на шляху трансфармацыі Беларусі ў класічную мафіёзную дзяржаву. Галава палітычнай сям'і даўно навучыўся здабываць асабістую выгаду з дзяржаўнай уласнасці, ліквідаваць з яе дапамогай усіх небяспечных эканамічных і палітычных канкурэнтаў, у тым ліку і расійскіх. Галава палітычнай сям'і валодае багатым досведам выкарыстання ўласнай вертыкалі замест партыі ўлады для мэтаў умацавання асабістай улады. Самай сур'ёзнай праблемай застаецца дысбаланс у адносінах паміж сацыяльным і нацыянальным папулізмам на карысць першага. Прэзідэнт А. Лукашэнка асцерагаецца нават мінімальных крокаў у гэтым накірунку, баючыся вельмі негатыўнай рэакцыі Крамля, які ўклаў шмат грошай у падтрымку дзейнага галавы палітычнай сям'і. Разам з тым, я не думаю, што наша краіна асуджаная на

выбар расійскага варыянту палігархіі. Сам А. Лукашэнка разумее ўсе слабыя бакі гэтай мадэлі і небяспеку страціць асабістую ўладу. У Беларусі, хутчэй за ўсё, будзе створаная ўласная мадэль мафіёзнай дзяржавы, шмат у чым “калгаснага” і правінцыйнага кшталту.

# Інфармацыя пра аўтараў



Ірына Бугрова (1954–2011)

Беларуская паліталагіня, сацыяльная псіхалагіня, спецыялістка ў дзейнасці НДА, публіцыстка, выкладніца ЕГУ (1997-2004). У мінскім ЕГУ выкладала курс “Палітычная культура” на франка-беларускім факультэце палітычных навук. Разам з Сяргеем Панькоўскім, Святланай Навумавай і Аляксандрам Фядутам Ірына Бугрова стаяла ля вытокаў інфармацыйна-аналітычнага сайта “Наша думка” (http://nmnby.eu). Шмат супрацоўнічала з грамадзянскай супольнасцю, была арганізатаркай шматлікіх семінараў і трэнінгаў, якія спрыялі станаўленню грамадзянскай супольнасці краіны. Працавала дацэнткай кафедры паліталогіі і сацыялогіі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Беларускага дзяржуніверсітэта. Дырэктарка праекту Міжнароднага інстытуту палітычных даследаванняў. Цэнтральнай даследчай тэмай І. Бугровай стала пытанне беларускай палітычнай культуры. Па-нямецку ў 1998 годзе І. Бугрова выдала працу «Politische Kultur in Belarus: Eine Rekonstruktion der Entwicklung vom Großfürstentum Litauen zum Lukaschenko-Regime» (Палітычная культура ў Беларусі: ад рэканструкцыі развіцця Вялікага княства Літоўскага да рэжыму Лукашэнкі). І. Бугрова адной з першых у беларускай палітычнай навуцы звярнула ўвагу на інстытуцыйныя традыцыі, а таксама каштоўнасці і кодэксы паводзінаў беларусаў, якія перадаюцца пакаленнямі і часта маюць цэнтральнае значэнне для працэсаў палітычнай трансфармацыі.

Святлана Навумава (1956–2011)

Беларуская навукоўца ў галіне паліталогіі і паліттэхналогіяў, прафесарка ЕГУ. З 1987 па 1994 гады выкладала ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце, з 1994 па 2001 гады працавала ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы пры БДУ, прымала ўдзел у дзейнасці Прэзідэнцкай камісіі па адукацыі. Адначасова працавала ў Міжнародным інстытуце палітычных даследаванняў Мінску. З 2001 па 2004 год была кіраўніцай кафедры палітычных і сацыяльных навук у ЕГУ, а пасля закрыцця ЕГУ ў Мінску брала актыўны ўдзел у барацьбе за аднаўленне ўніверсітэта ў выгнанні. У новым ЕГУ працавала прафесаркай на факультэце філасофіі і палітычных навук з 2005 па 2009 год. Была судырэктаркай рэгіянальнага цэнтру найноўшых даследаванняў і адукацыі, сурэдактаркай навуковага часопіса «Перекрестки. Журнал исследований Восточно-европейского пограничья». У ЕГУ чытала курсы «Уводзіны ў палітычную навуку», «Уводзіны ў паліталогію», «Асновы палітычнай тэорыі», «Сучасныя тэорыі грамадзянскай супольнасці», «Беларусь як палітычны праект». Была адным з заснавальнікаў і актыўных удзельнікаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» і працавала ў штабе кандыдата ў прэзідэнты Ўладзімера Някляева. Па ініцыятыве кампаніі «Гавары праўду» створаная прэмія імя С. Навумавай, з мэтай падтрымкі дзейнасці незалежных журналістаў, аналітыкаў і грамадскіх дзеячаў у Беларусі. Прэмія імя Святланы Навумавай уручаецца з 2012 года. Яна прызначаецца

за крэатыўнасць і глыбіню даследавання палітычнага жыцця краіны, актыўнасць і неабыякавасць у грамадскай прасторы.

Уладзімір Роўда (1955–2021)

Беларускі навуковец, палітолаг, прафесар ЕГУ. Выкладчык магістарскай праграмы «Публічная палітыка» ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце да кастрычніка 2014 года. Кіраваў Аналітычным беларускім цэнтрам. Аўтар шэрагу даследчых і вучэбна-метадычных прац. Аўтар грунтоўных вучэбных дапаможнікаў «Палітычная сістэма Рэспубліка Беларусь» і «Параўнальная паліталогія» ў трох частках, прысвечанага аналізу найважнейшых тэарэтычных канцэпцый гэтай навукі. З 1990-ых гадоў У. Роўда разам з В. Чарновым і Ў. Карбалевічам актыўна прымаў удзел у адукацыйнай грамадзянскай супольнасці. Разам з У. Карбалевічам выдаваў часопіс «Грамадзянская альтэрнатыва». Супрацоўнічаў і выкладаў у Беларускім Калегіюме (Мінск). Асаблівую ўвагу ў даследаваннях надаваў такім тэмам, як параўнальныя палітычныя даследаванні, тэорыя дэмакратыі і тэорыя нацыяналізму. Часта выступаў у прэсе і на сайце “Наша думка” (http://nmnby.eu), як палітычны аналітык і публіцыст.

Сяргей Панькоўскі (1956–2009)

Беларускі палітолаг, філосаф і гісторык. У 1992—1993 гадах працаваў дарадцам старшыні Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча. Дэкан франка-беларускага

факультэта палітычных і адміністрацыйных навук Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (1994—2001), дарадца рэктара ЕГУ (2001—2004), віцэ-прэзідэнт і кіраўнік дэпартамента палітычных даследаванняў “Сацыяльныя тэхналогіі” (2002—2005). З 2003 года з калегамі стварыў і кіраваў беларускім аналітычным інтэрнэт-праектам “Наша думка”. Адзін з заснавальнікаў, першы старшыня Рады Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS). Аўтар шматлікіх прац па гісторыі заходнееўрапейскай філасофскай і палітычнай думкі. Ініцыятар і кіраўнік шэрагу рэгіянальных і міжнародных навукова-даследчых і адукацыйных праектаў. Старшыня рады Ўсходнееўрапейскай школы палітычных даследаванняў. Кавалер французскага ордэна Акадэмічных пальмаў (2005).

Віктар Чарноў (1956–2013)

Беларускі палітолаг, выканаўчы дырэктар грамадскага аб’яднання “Фонд “Адкрытае грамадзтва””. У розныя перыяды жыцця працаваў выкладчыкам палітычных навук у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, у Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва і ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. У Еўрапейскім гуманітарным універсітэце працаваў на франка-беларускім факультэце палітычных навук (мінскі перыяд ЕГУ), так і ў Вільні на магістарскай праграме “Публічная палітыка”. Займаўся даследаваннямі ў галіне палітычных ідэалогій, тэорый грамадзянскай супольнасці і параўнаўчага аналізу постсавецкіх палітычных і эканамічных трансфармацый. Быў аўтарам і суаўтарам

некалькіх падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па палітычнай навуцы, у прыватнасці па палітычных ідэалогіях. Быў вельмі запатрабаваным палітычным аналітыкам для медыйных платформ, у прыватнасці, быў адным з найбольш публікуемых аўтараў сайту “Наша думка”. Актыўна ўдзельнічаў у нефармальнай адукацыі не толькі ў якасці эксперта ва Ўсходне-Еўрапейскай школе палітычных навук, але і ў якасці заснавальніка дэмакратычнай адукацыі для школьных настаўнікаў. Меў актыўную палітычную пазіцыю, быў сябрам АГП з моманту яе заснавання, удзельнічаў у яе дзейнасці і распрацоўцы сацыяльна-палітычных праграм.